Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. АЎТОРАК № 201 (28311)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Дары прыроды: маем больш, чым спажываем**

СТАР. 7



**Пятро Лысенка: «Гэта ўнікальна не толькі для Беларусі»**

СТАР. 12



**Танцы з баралем**

СТАР. 13

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Самымі актуальнымі пытаннямі ва ўмовах выхаду Беларусі на новы ўзровень харчовай бяспекі з'яўляюцца высокая якасць харчавання, прадуктаў, запатрабаванасць беларускай прадукцыі на знешніх рынках, а таксама інтэграцыя ў сусветны харчовы рынак. У Беларусі вырабляецца такі ж асартымент прадукцыі, як у іншых краінах, — Расіі, Украіне, Польшчы, краінах Балтыі і г. д. Наш шлях — бездакорная якасць беларускай прадукцыі. І мы зрабілі прарыў у гэтым за апошнія гады».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.10.2016 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9248 ▼ |
| Еўра | 2,1133 ▼ |
| Рас. руб. | 0,0304 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0746 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Волат з фермерскага поля



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У фермерскай гаспадарцы «Іванушкі» Стаўбцоўскага раёна займаюцца вытворчасцю садавіны і гародніны. Але гарбузы і кабачкі вырошчваюць першы год. Ураджай сартоў беларускіх бахчавых аказаўся надзіва добры. Ёсць ужо і свае рэкорды. Напрыклад, гэты гарбуз, які работнікі гаспадаркі аграном Яўген Яськевіч і трактарыст Аляксандр Макавецкі збіраюцца грузіць на трактарны прычэп, важыць 45 кілаграмаў і 200 грамаў.



■ Клімат

## Надзвычай суровых маразоў не чакаецца,

### але зіма будзе халаднейшай, чым у мінулыя гады

**Амаль увесь апошні тыдзень у сецiве і на старонках асобных СМІ распаўсюджваліся чуткі аб тым, што будучая зіма стане для жыхароў еўрапейскай Расіі і яе найбліжэйшых суседзяў на захадзе сапраўды лютай. Можна сустрэць меркаванне, што нас чакаюць такія моцныя маразы, якіх не было ў рэгіёне апошнія 100 гадоў. Карэспандэнт «Звязды» вырашыў высветліць, адкуль узялася падобная інфармацыя і чаго нам сапраўды чакаць у гэты ацяпляльны сезон.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**РАСІЯН ЗАМАРОЗІЦЬ, А ЕЎРАПЕЙЦАЎ ЗАМЯЦЕ?**

Паведамленне аб тым, што «Расія, Беларусь, Украіна і ўся Усходняя Еўропа гэтай зімой патрапяць пад дзеянне арктычнага холаду, а Вялікабрытанію і Скандынавію замятуць снежныя штормы» з'явілася на сайце адной буйной рускамоўнай газеты са спасылкамі на амерыканскіх метэаролагаў. Аднак беларускія спецыялісты гэтай зімой ніякіх экстрэмальных халадоў не чакаюць, паведаміла нашаму выданню **галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

СТАР. 3

■ Наша

## ЗАМЕНА ІМПАРТУ, І НЕ ТОЛЬКІ

**У краіне зарэгістравана больш за 5 тысяч найменняў лекавых сродкаў, 32 працэнты з іх — айчынныя. У асартыменце найбуйнейшага фармпрадпрыемства — Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў — каля 350 найменняў лекаў, а ўвогуле ў завода — больш за тысячу рэгістрацыйных пасведчанняў, якія дазваляюць экспартаваць прадукцыю ў блізкае замежжа і такія краіны, як Афганістан, В'етнам, Іран.**

Паводле слоў **намесніка генеральнага дырэктара па вытворчасці і асваенні лекавых сродкаў Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў Інэсы БІЛЬМОН**, ужо ўведзены ў эксплуатацыю новы цэх вытворчасці цвёрдых лекавых формаў. Ён атрымаў сертыфікат адпаведнасці GMP і сертыфікат адпаведнасці ад украінскай фармацэўтычнай інспекцыі. Сёння тут выпускаецца больш за 1,5 млрд таблетак, але існуючых магутнасцяў ужо недастаткова. Летась увялі ў эксплуатацыю цэх па вытворчасці антыбіётыкаў для ін'екцый магутнасцю 50 млн флаконаў у год. Гэты цэх таксама мае сертыфікат адпаведнасці GMP. Зараз працягваецца мадэрнізацыя вытворчасці раствораў для ін'екцый у ампулах. Сумесна з замежнымі кампаніямі — кітайскай, канадскай — разглядаюцца праекты будаўніцтва новых вытворчасцяў, сінтэзу субстанцый для выпуску лекаў па поўным цыкле.

Лідарам фармацэўтычнай галіны застаецца прадпрыемства «Белмедпрэпараты» — з 87-гадовым вопытам работы і чатырма вытворчымі пляцоўкамі.

— Штогод імкнёмся выводзіць на рынак не менш за 15 найменняў новых лекаў, — адзначае **начальнік упраўлення інавацыйнага развіцця прадпрыемства Алена ЛІТВІНАВА.** — Уся прадукцыя — генерычная, імпартазамяшчальная, але ёсць і каля 50 найменняў інавацыйных, арыгінальных распрацовак. У розных лекавых формах выпускаем сродкі для лячэння анкалагічных, кардыялагічных, нервовых, эндакрынных, захворванняў апорна-рухальнага апарата. Сёлета ў Лідзе пачалі выраб сродкаў антыбактэрыяльнай тэрапіі ў форме стэрыльна расфасаваных парашкоў. Укараняем біяпадобныя лекавыя сродкі, падыходы да распрацоўкі якіх адрозніваюцца ад традыцыйных хімічных генерыкаў. Так ужо выраблена антыгрыпозная трохвалентная вакцына, у тым ліку дзіцячая, дзяржаўная закупка якой склала звыш 3,5 млн доз. Плануем вырабляць прадукты на аснове нізкамалекулярных гепарынаў, распачата работа над лекавымі пластырамі для абязбольвання.

Аб'ём вытворчасці біятэхналагічнай прадукцыі да 2020 года павінен скласці не менш за 500 млн долараў у год, экспарт — не менш за 100 млн. Створаны тэхналогіі атрымання біятэхналагічнай прадукцыі для розных галін гаспадаркі — альтэрнатыўныя віды паліва, эфектыўныя спосабы ачысткі глебы, вады, утылізацыі прамысловых і бытавых адходаў. Акрамя гэтых мікробных тэхналогій, распрацаваны, напрыклад, тэст-сістэмы для дыягностыкі інфекцыйных захворванняў чалавека і жывёл. Вялікія надзеі ўскладваюцца на стварэнне нацыянальнага навукова-тэхналагічнага парка «Белбіяград» — асобнай эканамічнай зоны са спецыяльным падатковым рэжымам, на тэрыторыі якой будуць сканцэнтраваны фінансавыя, інтэлектуальныя, матэрыяльныя, навукова-тэхнічныя рэсурсы для рэалізацыі буйных праектаў у галіне бія- і нанатэхналогій, фармацэўтыкі, мікра- і нанасістэмнай тэхнікі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## КАДРАВАЕ РАШЭННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Мікалай Лазавік вызвалены ад пасады сакратара Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў у сувязі з выхадам у адстаўку. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў 17 кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

■ Ва ўрадзе

# Перспектывы дрэваапрацоўкі

**Аб эфектыўнасці работы дрэваапрацоўчых арганізацый з улікам праведзенай мадэрнізацыі, аказанай дзяржаўнай падтрымкі і задач па зніжэнні сабекошту прадукцыі ішла размова падчас пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Андрэя КАБЯКОВА.**

Як адзначыў кіраўнік урада, у адпаведнасці з рашэннямі Прэзідэнта і ўрада Рэспублікі Беларусь 9 прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай прамысловасці перададзены ва ўпраўленне Банка развіцця. А 10 чэрвеня афіцыйна зарэгістраваны холдынг арганізацый дрэваапрацоўчай прамысловасці. Паводле яго слоў, аб'яднанне прадпрыемстваў у холдынг стварыла ўмовы, якія дазваляюць праводзіць узгодненую фінансавую, інвестыцыйную і вытворчую палітыку, у тым ліку ў частцы продажу гатовай прадукцыі, арганізацыі маркетынгавай, лагістычнай дзейнасці, дыверсіфікацыі вытворчасці, павышэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі.

Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што ўсяго па рашэннямі кіраўніка дзяржавы летась прадпрыемствам дрэваапрацоўкі аказана дзяржаўная падтрымка ў памеры 128 млн рублёў (з улікам дэнамінацыі), а за 8 месяцаў 2016 года — 2,6 млн рублёў. Разам з тым, паводле слоў прэм'ер-міністра, на прадпрыемствах дрэваапрацоўкі існуе шэраг нявырашаных праблем, якія патрабуюць прыняцця канкрэтных мер. У тым ліку па паляпшэнні іх фінансава-гаспадарчай дзейнасці

# І гаспадыня, і кіраўнік

## Меры па падтрымцы мацярынства і дзяцінства ў краіне даюць вынік

**У Мінску, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, адбылася цырымонія ўшанавання шматдзетных маці, якія нарадзілі дзяцей у 2016 годзе, і святочная канцэртная праграма «Мы будзем вечна праслаўляць тую жанчыну, чыё імя — маці!».**

«Дзень маці ў чарадзе прафесійных свят займае асаблівае месца, — сказала **віцэ-прэм'ер Наталля КАЧАНАВА**, якая прыняла ўдзел у мерапрыемстве. — Нарадзіць і выхаваць дзіця — нялёгкая праца, што мае патрэбу ў прызнанні. Важна, што тыя праграмы, якія прыняты ў Беларусі ў падтрымку мацярынства і дзяцінства, даюць вынік».

Так, у 2015 годзе нарадзілася 119 тыс. дзяцей — гэта рэкорд за ўсю суверэнную гісторыю Беларусі. Тэндэнцыя росту нараджальнасці захоўваецца і ў бягучым годзе. За 8 месяцаў на свет з'явілася на 1,3 тыс. дзяцей больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

Павялічылася ў краіне і колькасць шматдзетных сем'яў, цяпер іх 83 тыс. Больш за 50 працэнтаў нованароджаных — гэта другія і наступныя дзеці ў бацькоў. Яшчэ ў 2009 годзе ў Беларусі было толькі 62 тыс. шматдзетных сем'яў.

Наталля Качанава адзначыла, што ў Беларусі прынята дастаткова мер у сферы забеспячэння дэмаграфічнай бяспекі. «Тая падтрымка, якая аказваецца, значная, але ва ўдасканаленні мяжы няма. Пры наяўнасці магчымасцяў будзем шукаць новыя варыянты дапамогі сем'ям з дзецьмі», — сказала Наталля Качанава.

Яна выказала словы захаплення беларускімі жанчынамі, якія, нягледзячы на вялікую сям'ю, паспяваюць сумяшчаць ролю хатняй гаспадыні і паспяхова кіраўніка, займаюцца грамадскай дзейнасцю.

Як адзначылі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, штогод колькасць шматдзетных сем'яў у сталіцы павялічваецца ў сярэднім на 1 тыс. Сёння ў горадзе пражываюць 11 886 такіх сем'яў. Большасць з іх (каля 10,2 тыс.) выхоўваюць па трое дзяцей, 1 267 сем'яў — па чацвёра, 366 — пяцёра і больш дзяцей. Дзіцячымі дапамогамі і іншымі праграмамі сацыяльнай падтрымкі ў той ці іншай форме карыстаецца кожнае мінскае дзіця. У залежнасці ад узросту дзеці маюць права на бясплатныя лякарствы і дзіцячае харчаванне, школьнае сняданне, праезд у гарадскім транспарце, штогадовыя пуцёўкі ў дзіцячыя аздараўленчыя лагеры і санаторыі, паслугі няні на бязвыплатнай аснове.

■ Будзь у курсе!

# ПАЯЗДЫ ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА ЗІМОВЫ ЧАС




**У сувязі з пераходам у ноч з 29 на 30 кастрычніка ў суседніх краінах на зімовы час Беларуская чыгунка сумесна з чыгуначнымі адміністрацыямі Украіны, Літвы, Латвіі і Польшчы загадзя правяла карэкціроўку раскладу руху міжнародных паяздоў, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Напрыклад, поезд №86 Мінск — Кіеў, які ў цяперашні час адпраўляецца са сталіцы ў 22.40 і прыбывае ў Кіеў у 8.52, з 30 кастрычніка будзе адпраўляцца з Мінска ў той жа час, а прыбываць у Кіеў у 7.52. У зваротным напрамку з пераходам на зімовы час поезд будзе адпраўляцца ў 21.19 (у цяперашні час адпраўляецца ў 22.28), час прыбыцця ў нашу сталіцу застанецца без змяненняў — 8.38.

Час адпраўлення з Мінска поезда №805 Мінск — Вільнюс пасля пераходу на зімовы час застанецца без змяненняў — 8.00, але прыбываць у Вільнюс састаў будзе на гадзіну раней — у 09.30 (цяпер — у 10.30). У зваротным кірунку цягнік №806 Вільнюс — Мінск будзе адпраўляцца ў 18.12 (цяпер — у 19.12), а час прыбыцця ў нашу сталіцу застанецца без змяненняў — 21.42.

Пасля 30 кастрычніка таксама зменіцца расклад руху поезда № 87 Мінск — Рыга — састаў будзе адпраўляцца з Мінска ў 22.25 без змяненняў (час прыбыцця ў Рыгу зменіцца з 10.00 на 9.00); у зваротным кірунку поезд №88 будзе адпраўляцца з Рыгі ў 19.20 (зараз 20.20), і прыбываць у Мінск ён будзе без змяненняў у 8.19.

Пасля пераходу на зімовы час таксама зменіцца час адпраўлення і прыбыцця паяздоў міжнародных зносін, якія ідуць транзітам па тэрыторыі Беларусі ў краіны Заходняй Еўропы і ў зваротным кірунку. Акрамя таго, у сувязі са зменамі ў графіку руху міжнародных паяздоў скарэктаваны і расклад некаторых паяздоў рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній, якія курсіруюць па тэрыторыі Беларусі.

Падрабязную інфармацыю аб раскладзе міжнародных паяздоў, паяздоў рэгіянальных і міжрэгіянальных ліній можна атрымаць на сайце Беларускай чыгункі www.rw.by, а таксама ў чыгуначных касах і па тэлефонах даведачных службаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*



■ Акцэнты тыдня

# БЯСПЕКА ЯК КЛЮЧАВАЯ ІДЭЯ

**Саміт BRIKS** (Бразілія, Расія, Індыя, Кітай і Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка), праведзены 15—16 кастрычніка ў індыйскім штаце Гоа, не стаў крыніцай значных сенсацый у сферы шматбаковага супрацоўніцтва. Найбольшыя поспехі былі дасягнуты ў сферы супрацоўніцтва на двухбаковай аснове. Так, Расія і Індыя абвясцілі аб кантракце памерам у некалькі мільярдаў долараў на пастаўку Масквой для Дэлі зенітна-ракетных сістэм С-400 «Трыумф» і планах па сумеснай вытворчасці верталётаў і вартавых катэраў. Таксама кампанія «Раснафта» набудзе ў Індыі буйны порт і частку нафтаперапрацоўчага завода. З сумесных дзеянняў можна адзначыць заклік прыняць у рамках Генасамблеі ААН Усёабдымную канвенцыю аб міжнародным тэрарызме, асуджэнне аднабаковых эканамічных санкцый, якія супярэчаць міжнароднаму праву, і рашэнне ствараць у будучыні ўласнае рэйтынгавае агенцтва.

**Саміт АДКБ**, які адбыўся ў Ерэване 14 кастрычніка, упершыню за доўгі час пакінуў частку сваіх рашэнняў не для прэсы. У прынцыпе, гэта можна расцаніць станоўча, паколькі ў сілу спецыфікі дзейнасці арганізацыі поўная адкрытасць азначае недастатковую сур'ёзнасць у прыняцці сапраўды важных рашэнняў, што магло б негатыўна адбіцца на нацыянальнай бяспецы ўдзельнікаў арганізацыі. Была прынята Стратэгія калектыўнай бяспекі да 2025 года, асноўным зместам якой з'яўляюцца сумесныя адказы на самыя сур'ёзныя выклікі. Вядома, гэтыя выклікі звязаны перш за ўсё з праблемамі ў сферах тэрарызму, нестабільнасці краін-суседзяў АДКБ, гандлю наркотыкамі і нарастання напружанасці ў адносінах Расіі і Захаду. У прынятай заяве па нагорна-карабахскім канфлікце члены АДКБ заклікалі да рашэння праблемы супрацьстаяння дыпламатычнымі спосабамі. Таксама быў негатыўна ацэнены ўплыў аднабаковых дзеянняў ЗША і іх саюзнікаў па разгортванні глабальнай сістэмы супрацьракетнай абароны на міжнародную бяспеку і стабільнасць. І, вядома, важным момантам стаў пераход лідарства ў АДКБ да Беларусі. Беларускі Прэзідэнт ужо паабяцаў з гэтай нагоды прапанаваць нешта добрае для АДКБ у плане адзінства і павагі з боку кантрпартнёраў.

**Прэзідэнцкая кампанія ў ЗША** становіцца адной з самых брудных у гісторыі амерыканскіх выбараў, калі не самай бруднай. Два асноўныя кандыдаты, якія маюць рэальныя шанцы перамагчы, — Хілары Клінтан і Дональд Трамп — практычна не саромеюцца ў выразах. А іх каманды зладзілі сапраўдную вайну кампраматаў. У ход ідзе ўсё, у чым толькі магчыма абвінавачваць адно аднаго. У той час як каманда Трампа абвінавачвае Хілары Клінтан ва ўжыванні наркотыкаў і ў злачынстве, звязаным з магчымай уцечкай сакрэтных дакументаў, каманда Клінтан спрабуе скампраметаваць Трампа, імкнучыся выставіць яго сексуальным агрэсарам. Ужо 12 жанчын заявілі пра сексуальныя замахі з боку Трампа, прычым некаторыя са сведак вядуць гаворку пра справы трыццацігадовай даўнасці. Да барацьбы падключаюцца і іншыя рэсурсы: так, сайт WikiLeaks апублікаваў перапіску вядомых членаў Дэмакратычнай партыі, якая сведчыць аб іх намеры скампраметаваць Дональда Трампа, пусціўшы лжывыя чуткі аб парушэнні роўнасці палоў пры найме ў яго кампанію. Хто б ні перамог, адміністрацыя потым ад гэтага бруду прыйдзецца доўга. Да таго ж наўрад ці імкненне канкурэнтаў публічна мыць брудную бялізну і прама фабрыкаваць кампрамат адзін на аднаго станоўча паўплывае на імідж ЗША ў свеце, што ўскладніць задачы новага прэзідэнта па захаванні ўплыву краіны на міжнароднай арэне пасля ўступлення на пасаду.

Вельмі магчыма, што выбарчая гісторыя паўплывала і на **сур'ёзнае пагаршэнне адносін ЗША з Расіяй** за апошнія дзесяцігоддзі. Абодвума бакамі робяцца заявы ў стылі горшых часоў халоднай вайны паміж ЗША і СССР. У прыватнасці, západзыя абвінавачваюць Расію ў хакерскім нападзе на перапіску членаў Дэмакратычнай партыі, праведзеным нібыта з мэтай скампраметаваць Хілары Клінтан і дапамагчы Дональду Трампу, найвышэйшае кіраўніцтва ЗША вуснамі віцэ-прэзідэнта Джо Байдэна зрабіла беспрэцэдэнтную заяву аб намеры распачаць кібератаку на Расію. Пры гэтым ніякіх доказаў таго, што сервер Дэмакратычнай партыі быў узламаны, грамадскасці прадстаўлена не было. Ствараецца ўражанне, што член Дэмакратычнай партыі Джо Байдэн выкарыстоўвае дзяржаўныя рычагі, каб скампраметаваць сувязямі з Расіяй члена Рэспубліканскай партыі Дональда Трампа. Калі гэта так, то напружанне паміж Расіяй і ЗША павінна знізіцца пасля выбараў, калі не будзе цяперашняй неабходнасці разыгрываць расійскую карту ў выбарных мэтах.

На мінулым тыдні суверэнную **Беларусь упершыню наведаў з візітам член брытанскай каралеўскай сям'і** прынц Майкл Кенцкі. Значнасць гэтага факта ў тым, што пасля выхаду з ЕС Вялікабрытанія будзе ажыццяўляць самастойную знешнюю палітыку, і ў Беларусі ёсць неабходнасць паляпшаць адносіны з Лонданам. Але галоўнай мэтай першага візіту было наладжванне супрацоўніцтва з Майклам Кенцкім як кіраўніком уласнай кансалтынгавай кампаніі, якая можа дапамагчы палепшыць бяспеку ў сферы дарожнага руху ў нашай краіне.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Факт

## ЗАНАДТА ДАРАГАЯ ПЕНСІЯ

**Паштарка Капаткевіцкага аддзялення сувязі ў канцы працоўнага дня не вярнулася ў аддзяленне. Калегі забілі трывогу і звярнуліся па дапамогу ў Петрыкаўскі РАУС.**

Між тым было вядома, што 27-гадовая жанчына, якая разносіла пенсію пажылым жыхарам вёскі, на момант знікнення мела пры сабе каля 1500 рублёў для выдачы пенсіі, пакет з газетамі і дарожны веласіпед. Як расказала афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Марыя Крыванагава, падчас правядзення аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў у поле зроку праваахоўнікаў трапіла непрацуючая 42-гадовая жыхарка Капаткевічаў. Супрацоўнікі крымінальнага вышуку агледалі яе гаспадарчыя пабудовы і выявілі веласіпед паштаркі, а пры аглядзе кватэры пад падлогай знайшлі яе цела з бачнымі прыкметамі гвалтоўнай смерці. Далей следча-аператыўнай групай былі знойдзены схаваныя рэчы і грошы, якія былі пры жанчыне, а таксама сякера, якой, хутчэй за ўсё, было здзейснена забойства.

Па гэтым факце неадкладна ўзбуджана крымінальная справа ў дачыненні да затрыманай грамадзянкі. З яе ўдзелам праведзены першапачатковыя следчыя дзеянні. Следчыя разам з супрацоўнікамі міліцыі і экспертамі ўстанаўліваюць усе акалічнасці трагедыі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ І так бывае

## СПРАБАВАЎ УГНАЦЬ МАРШРУТКУ З ПАСАЖЫРАМІ

**Скарыстаўшыся тым, што вадзіцель маршрутнага таксі выйшаў у дыспетчарскую, пасажыр з пярэдняга сядзення перасеў на вадзіцельскае крэсла і завёў матор. Інцыдэнт адбыўся на аўтавакзале ў Кобрыне. У маршрутцы знаходзіліся пасажыры. Дзяўчына, што таксама сядзела спераду, паспела выскачыць з мікраўтобуса і стала клікаць на дапамогу.**

Угоншчык тым часам пачаў рухацца на машыне па тэрыторыі аўтавакзала. Спыніць зламысніка ўдалося з дапамогай пасажыраў, адзін з іх змог дастаць ключ з замка запальвання, які неабачліва пакінуў там вадзіцель.

Супрацоўнікі міліцыі, што прыбылі на месца, затрымалі 41-гадовага брастаўчаніна — паведамілі ў Брэсцкім абласным упраўленні СК. У дачыненні да затрыманага прызначана судова-псіхіятрычная экспертыза.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ На сувязі

# ВАМ ПАСЫЛКА!

## На тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта распачаў працу буйны лагістычны цэнтр «Белпошты»

**З сярэдзіны мінулага года ў Нацыянальным аэрапорце ўжо дзейнічала ўстанова міжнароднага паштовага абмену. Аднак магчымасці новага цэнтра значна шырэйшыя: толькі агульная плошча павялічылася амаль у 5 разоў. Акрамя таго, новы будынак аснашчаны перадавымі тэхналогіямі, некаторыя з якіх у гэтай сферы прымяняюцца ўпершыню.**



**Намеснік прэм'ер-міністра Анатоль КАЛІНІН** выказаў задавальненне высокім узроўнем работы «Белпошты», які адпавядае эканамічным патрэбам дзяржавы, а таксама запытам грамадзян. Віцэ-прэм'ер расказаў, што на тэрыторыі Нацыянальнага аэрапорта ў хуткім часе з'явіцца два новыя аб'екты: яшчэ адна ўзлётна-пасадачная паласа і авіярамонтны завод. А **міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей ПАПКОЎ** адзначыў перспектывы пашырэння сеткі лагістычных цэнтраў па ўсёй краіне.

Лагістычны цэнтр — прыклад узаемадзеяння прадпрыемства «Белпошта» і Мытнага камітэта. Калі супрацоўнікі паштовай службы займаюцца сартаваннем пасылак, то мытнікі, пры неабходнасці, — праверкай іх змесціва. **Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Юрый СЯНЬКО** падкрэсліў, што двум ведамствам і да гэтага даводзілася працаваць разам, аднак цяпер гэты працэс удасканалены. У цэлым, менавіта па прынцыпе аптымізацыі ўсіх дзеянняў уладкавана работа новага лагістычнага цэнтра. Усе паштовыя адпраўленні, якія паступаюць у нашу краіну па паветры, будуць апрацоўвацца тут: раней іх прыходзілася адвозіць у сталіцу, што істотна запавольвала працэс дастаўкі атрымальніку.

Як расказала **першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Алена СКРЫПЧЫК,** у 2014 годзе, калі адбыўся бум інтэрнэт-пакупак з замежных сайтаў, апрацоўка пасылак займала часам больш за тыдзень. З увядзеннем новага цэнтра ўдасца гэтыя тэрміны скараціць да 1—2 дзён. Работа ва ўстанове вядзецца ў фармаце 24/7 без перапынкаў і выхадных. Пры неабходнасці цэнтр можа апрацоўваць каля 100 тысяч паштовых адпраўленняў у суткі. Цяпер жа гэта каля 10 тысяч пасылак у дзень супраць 5 тысяч, якія былі ў пачатку года.

Работа цэнтра арганізавана наступным чынам. Паштовыя адпраўленні трапляюць у зону прыёма, дзе ўсталяваны спецыяльныя газаідэнтыфікатары, якія дазваляюць у вялікім аб'ёме пасылак выявіць прысутнасць забароненых рэчываў. Калі першы этап прайшоў без нечаканасцяў, пасылкі накіроўваюцца да аператараў. Яны правяраюць захаванасць і адпаведнасць суправаджальнай інфармацыі нормам запаўнення. Паколькі прадпрыемства «Белпошта» ўваходзіць у Сусветны паштовы саюз, у яго ёсць доступ да агульнай базы даных. Як толькі аператар счытвае індывідуальны код з пасылкі, аб месцы яе знаходжання можа даведацца як служба-адпраўнік, так і атрымальнік. Пасля ўводу ўсіх даных, калі да адпраўлення няма ніякіх заўваг, справа пераходзіць у рукі мытні. Асаблівасцю новага цэнтра з'яўляецца наяўнасць спецыяльных стужак, па якіх скрынкі з апрацаванымі пасылкамі перамяшчаюцца аўтаматычна.





Фота Надзеі БУЖАН.

Па словах **начальніка мытні «Мінск-2» Андрэя МІХАЛЬКЕВІЧА,** 1% пасылак выклікае падазрэнне. Спачатку адпраўленне скануецца пры дапамозе інтраскапіі — праглядаецца на прасвет — і толькі ў крайнім выпадку ўскрываецца. У рабоце цэнтра задзейнічаны не толькі найноўшыя тэхналогіі, але нават эксперыментальныя распрацоўкі. Так, ужываецца прылада, якая праводзіць аналіз спектра практычна любога рэчыва: у базе даных іх больш за 10 тысяч. Напрыклад, да прыстасавання можна паднесці таблетку, якая запячатана ва ўпакоўцы, і менш чым за хвіліну яно вызначыць, што гэта за лекі. Асабліва гэта тэхналогія актуальная для пошуку забароненых рэчываў. Толькі ў 2016 годзе было прадухілена 5 спроб увозу наркатычных і псіхатропных рэчываў. Акрамя гэтага, незаконным чынам адпраўляюць па пошце старадаўнія манеты, гістарычныя дакументы, зброю і нават жывёл. Усяго за 9 месяцаў гэтага года падчас праверкі пасылак было выяўлена больш за сто злачынстваў.

Усяго па паветры прыходзіць каля 30% міжнародных паштовых адпраўленняў, з якіх каля 60% — тавары з замежных сайтаў. З-за змены правілаў падаткаабкладання тавараў коштам больш 22 долараў штогадовыя паступленні ў дзяржаўную казну павялічыліся на 1,5 мільёна дэнамінаваных рублёў.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

■ Падпіска-2016

# Хай зіма будзе цёплай!



Фота Канстанціна ДРОБАВА.

**На працягу, лічы, стагоддзя газета «Звязда» прыходзіць да сваіх чытачоў і ўжо некалькі дзесяцігоддзяў радуе падпісчыкаў не толькі сустрэчамі з роднай мовай ды цікавымі людзьмі, але і каштоўнымі прызамі.**

Што сярод іх было? Цяжка нават прыпомніць: коні, каровы, парсючкі, халадзільнікі, тэлевізары, пыласосы, люстры, шпалеры, чайнікі, палаткі, кухонныя камбайны, пральныя машыны, прасы, мікрахвалёўкі, веласіпеды, бензакасілкі... Усё гэта, ну вядома ж, загадзя закуплялася, загадзя анансавалася і разыгрывалася — у адпаведныя тэрміны, з удзелам паштавікоў, падпісчыкаў...

Чарговы розыгрыш прызоў звяздоўскай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» прайшоў і надоечы.

Такім чынам, з лёгкай рукі **намесніка дырэктара Мінскага філіяла РУП «Белпошта» Алены ІШЧУК** і **даўняй падпісчыцы газеты Іны КАЗЛОЎСКАЙ** *(на здымку)* сякеры-калуны Startul SE2021-10 выйгралі:

**Лілія Анатолеўна ВІННІК, г. Ганцавічы Брэсцкай вобласці;**

**Ірына Міхайлаўна СТРАШЫНСКАЯ, в. Пліса Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці;**

**Станіслаў Пятровіч ЕНЗА, г. Гомель;**

**Ірына Канстанцінаўна КУНЦЭВІЧ, в. Дубна Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці;**

**Міхаіл Іванавіч МІРАНОВІЧ, в. Мышкавічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці;**

**Ніна Мацвееўна БУРКО, в. Капланцы Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці;**

**Сяргей Іванавіч ЖУКАЎ, г. Мінск.**

**Суперпрыз — бензапілу ланцуговую Husqvarna 236 — выйграла Таццяна Анісімаўна БАРКОЎСКАЯ, в. Жажэлка Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці.**

Віншуем шчаслівчыкаў!

Тых жа, хто адсылаў картку і спадзяваўся знайсці сваё прозвішча ў спісе пераможцаў, але не знайшоў, просім не крыўдаваць — заставацца падпісчыкамі газеты, удзельнічаць у латарэі і верыць, што рана ці позна вам таксама пашчасціць!

**Афіцыйна**

*Арганізатарам рэкламнай гульні «Хай зіма будзе цёплай!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.*

*Рэкламная гульня «Хай зіма будзе цёплай!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 01.09.2016 г. (пасведчанне № 2818) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 8 верасня па 31 снежня 2016 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» чацвёртага квартала або другога паўгоддзя 2016 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 162 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.*

*Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 284 44 04*

# Надзвычай суровых маразоў не чакаецца

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Айчынныя спецыялісты яшчэ не падрыхтавалі дакладны прагноз (ён будзе гатовы прыкладна ў апошнюю дэкаду лістапада) на будучую зіму. Паводле слоў Святланы Рыбаковай, і гэта зіма хутчэй за ўсё будзе звычайнай, нават крыху мяккай. Разам з тым не выключаецца, што ў студзені могуць быць і даволі працяглыя перыяды з сур'ёзнымі маразамі да мінус 20 градусаў ці нават да мінус 25. Такія маразы на тэрыторыі Беларусі ніколі не лічыліся нечым анамальным.

## РЫХТАВАЦЦА, АЛЕ НЕ ПАНІКАВАЦЬ

**Кіраўнік расійскага Гідраметцэнтра Раман ВІЛЬФАНД** катэгарычна абверг чуткі пра самую суровую зіму ў нашым рэгіёне за апошняе стагоддзе.

«Мабыць, такія высновы былі зроблены аматарамі ад надвор'я пад уражаннем халоднага кастрычніка пасля вельмі цёплага верасня. А ў першым месяцы восені тэмпература паветра на еўрапейскай частцы Расіі была ажно на 4-5 градусаў вышэй за кліматычную норму, што бывае вельмі рэдка. Супрацоўнікі Гідраметцэнтра, і я ў тым ліку, не стамляемся паўтараць, што доўгатэрміновыя прагнозы надвор'я на сезон з вялікай дакладнасцю рабіць немагчыма», — заявіў Вільфанд.

Расійскія сіноптыкі прагназуюць, што сярэдняя тэмпература сезона зімы 2016—2017 гадоў будзе адпаведнай кліматычнай норме, ці нават крыху вышэй за яе. Разам з тым, у параўнанні з зімой 2015—2016 гадоў расіян чакаюць марозныя дзянькі, ад якіх яны ўжо адвыклі. Прыкладна такой танальнасці прагноз распаўсюджваецца і на тэрыторыю Беларусі.

## ЦЕПЛАВАЯ АНАМАЛІЯ 16 МЕСЯЦАЎ ЗАПАР

У сваім паведамленні Раман Вільфанд адзначыў, што сур'ёзна казаць пра нейкае надзвычайнае пахаладанне ў перыяд глабальнага пацяплення было б неразумна. А пацяпленне і сапраўды працягваецца і нават набірае абароты. Упершыню за ўвесь час інструментальных назіранняў на працягу 16 месяцаў у свеце трымаецца анамальна цёплае надвор'е, калі кожны месяц гэтага перыяду б'юцца колішнія рэкорды па тэмпературы. Навукоўцы ўпэўнены, што гэта звязана з парніковым эфектам і дзейнасцю чалавека.

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, 2015 год у Паўночным паўшар'і Зямлі ўжо цяпер можна назваць самым гарачым за ўсю гісторыю назіранняў за кліматычнымі зменамі. Як гаворыцца ў новым дакладзе ААН аб стыхійных бедствах, прыродныя катаклізмы ў апошнія 10 гадоў адбываліся практычна штодня — прыкладна ў 2 разы часцей, чым 20 гадоў таму. Вельмі моцнае пацяпленне звязана з развіццём такой прыроднай з'явы, як Эль-Ніньё (ваганне тэмпературы паверхневага пласта вады ў экватарыяльнай частцы Ціхага акіяна, якое мае прыкметны ўплыў на клімат). А павелічэнне колькасці небяспечных з'яў непасрэдна звязана з глабальным пацяпленнем. І калі не будзе зроблена ніякіх дзеянняў, то да сярэдзіны XXI стагоддзя іх колькасць можа вырасці ў 4 разы ў параўнанні з мінулым стагоддзем.

## СУЦЭЛЬНАЯ ГАЛАЛЁДЗІЦА?

Пакуль нашы сіноптыкі толькі прыглядаюцца да будучай зімы, іх расійскія калегі ўжо цяпер пужаюць сваіх аўтамабілістаў беларускімі слізкімі дарогамі ў снежні. На іх погляд, «тэрытарыяльна Беларусь невялікая, таму надвор'е зімой у населеных пунктах тут не моцна адрозніваецца. У апошні месяц года Мінск, Брэст, Гомель і іншыя буйныя гарады Беларусі пацерпяць больш ад галалёдзіцы, чым ад маразоў. Падталы ўдзень, пры тэмпературы вышэй плюс 1 градуса, снег стане падмярзаць уначы, і на дарогах будзе даволі няўтульна. Увогуле, Новы год беларусы могуць сустрэць не са снегам, а з дажджом».

Аб тым, што першы месяц зімы на тэрыторыі Беларусі звычайна бывае мяккім, расказвае і **начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Беларусі Дзмітрый РАБАЎ.** Тэмпературная норма снежня складае мінус 2 — мінус 5 градусаў, але ў апошнія гады стабільных халадоў на старце зімы ў нас практычна і не было.

Рэальную марозную зіму ў Беларусі сіноптыкі чакаюць менавіта ў студзені, калі перыяды сур'ёзнага холаду (каля мінус 20 градусаў) дасягаюць двух тыдняў. Кліматычная норма студзеня па тэмпературы складае ад мінус 4,5 градуса на паўднёвым захадзе да мінус 8 градусаў на паўночным усходзе. Амаль заўсёды абяцаюць нам айчынныя спецыялісты добрыя маразы і ў першую палову лютага. Пакуль у гэтым месяцы не чакаецца істотнага пацяплення і прагназуецца шмат снегу. У апошні месяц зімы кліматычная норма тэмпературы складае ад мінус 3,5 градуса на паўднёвым захадзе да мінус 8 градусаў на паўночным усходзе.

Што мы маем у выніку? Айчынныя спецыялісты кажуць, што калі ў нас і сапраўды будзе нармальная зіма (з блізкімі да кліматычнай нормы тэмпературамі), то па факце мы атрымаем больш сонечных і марозных дзянькоў, што лепш шэрасці і хлюпоты. Адзіны мінус такога надвор'я тычыцца павелічэння выдаткаў за жыллёва-камунальныя паслугі. Так, у добрыя маразы за нармальнае ацяпленне прыйдзецца заплаціць больш.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Падзея

# АДЗІНАЯ ПРАСТОРА

**У Маскве ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі прайшоў другі з'езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Поруч з дэлегатамі ад двух пісьменніцкіх саюзаў — Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі — удзел у беларуска-расійскім творчым форуме прынялі намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта нашай краіны Ігар Бузоўскі і намеснік Дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Іван Бамбіза.**

## НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК

У справаздачных дакладах двух сустаршынь — Мікалая Чаргінца і Валерыя Ганічава — вёўся шырокі расповед пра здзейсненае ў апошнія гады на ніве літаратурнага пабрацімства. Многія факты сведчаць пра тое, што і традыцыі добрых стасункаў не разбураны, і наладжваюцца новыя масты дружбы. У Мінску выдаецца часопіс саюзнай пісьменніцкай арганізацыі — «Белая Вежа», дзе друкуюцца як аўтары з нашай краіны, так і паэты і празаікі Расіі, дарэчы, з многіх яе рэгіёнаў. Мікалай Чаргінец звярнуў асаблівую ўвагу на супрацоўніцтва беларускіх мастакоў слова з рэгіёнамі Расіі. Асабліва выразна ў гэтым кірунку рупяцца творцы з Гомельскай, Магілёўскай і Віцебскай абласных арганізацый СПБ. І сталыя аўтары, і моладзь з Гомельшчыны — частыя госці на расійскіх фестывалях паэзіі, мастацкага перакладу. Дарэчы, ужо выдадзена цэлая бібліятэка кніг, якія нарадзіліся ў выніку такога беларуска-расійскага літсяброўства. Генератар гэтай работы — найперш Уладзімір Гаўрыловіч, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення СП Беларусі.

На з'ездзе можна было ўбачыць пісьменнікаў Расіі — Алеся Кажадуба, Івана Сабілу, Валерыя Казакова, Аляксандра Казінцава. Якраз яны перш-наперш вельмі шмат зрабілі для таго, каб беларускія пісьменнікі друкаваліся ў вядучых літаратурных масмедыя Расіі: дадатку да «Литературной газеты» — «Лад», часопісах «Наш современник», «Сибирские огни».

## АДКАЗНАСЦЬ ЗА СЛОВА І МАСТАЦКУЮ ПАЗІЦЫЮ

Намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар Бузоўскі агучыў вітанне Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі ўдзельнікам з'езда. Наш Прэзідэнт паслядоўна і ўважліва звяртаецца да тых праблем і здзяйсненняў, якія характарызуюць пісьменніцкую супольнасць. У 2009 годзе ён звяртаўся да новага міждзяржаўнага грамадскага аб'яднання ў сувязі з устаноўчым з'ездам. І зараз таксама выказаў шчырыя словы падтрымкі.

**На фоне камерцыялізацыі мастацтва, літаратуры і культуры нельга страціць пазіцыі духоўнасці, маральнасці.**

Намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Ігар Бузоўскі выклаў свой пункт гледжання на задачы, якія пісьменнікам неабходна вырашаць з усім грамадствам. Як у Беларусі, так і ў Расіі. Слова пісьменніка мае важнае значэнне ў фарміраванні Саюзнай дзяржавы. На фоне камерцыялізацыі мастацтва, літаратуры і культуры нельга страціць пазіцыі духоўнасці, маральнасці. «Кіраўнік дзяржавы ў сваім вітанні падкрэсліў адказнасць пісьменніка перад сваім народам, — сказаў Ігар Бузоўскі. — І нам усім трэба разумець гэта як адказнасць увогуле за будучыню. Ад таго, што мы знаходзімся няхай сабе і далёка ад канфліктаў палітычнага кшталту, усё адно і нас павінны хваляваць маштабы адказнасці планетарнага характару...»

Сапраўды, як толькі аўтар таго ці іншага твора не разумее цалкам усіх працэсаў, што адбываюцца вакол, ён сам, па ўласнай віне, аказваецца незапатрабаваным чытачом, грамадствам. Пісьменнік павінен з асаблівай увагай зазірнуць у працэс выхавання будучых пакаленняў. У сям'і, у школе, увогуле ў грамадстве. Сёння як ніколі важна разумець: адзін прагматызм у зносінах з чытачом, гледачом, слухачом нічога не варты. Традыцыі, запаветы папярэднікаў, багаты гістарычны досвед — каму як не пісьменнікам стаць на абарону ўсяго гэтага, праявіць мужнасць і адказнасць перад часам і прасторай. І, канешне ж, пры гэтым сацыяльныя функцыі літаратуры, пісьменніка не павінны ацэньвацца адно толькі матэрыяльнымі выгадамі ў выніку творчай працы. Ігар Бузоўскі заўважыў, што ў Беларусі і надалей будзе павялічвацца артыкул дзяржаўных выдаткаў на сацыяльна значную літаратуру. Важна толькі, каб голас пісьменніка быў гучнейшы, каб мастацкія творы мелі шырокі рэзананс, уплывалі на вырашэнне многіх і многіх праблем у фарміраванні грамадства і выхаванні чалавека. Так, ідэалогія ў значнай ступені якраз тым і займаецца, што канцэнтруе сілы. І ў гэтай кансаліданцыі пісьменніку, грамадству і дзяржаве крочыць разам.

## ПОШУК ПЕРСПЕКТЫЎ

І Мікалай Чаргінец, і Валерый Ганічаў, і Іван Бамбіза, і самыя розныя выступоўцы гаварылі на з'ездзе і пра моладзь. Пра яе літаратурныя памкненні. Шкада, што не так шмат моладзі было ў самой зале, дзе праходзіў гэты творчы форум. Магчыма, на трэцім з'ездзе сітуацыя складзецца крыху інакш. Прыкладаў работы з моладдзю хапае. І ў Гомелі, і ў Брэсце, і ў розных расійскіх рэгіёнах. А Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы не першы год ладзіць расійска-беларускі конкурс маладых аўтараў «Мост дружбы». Па выніках яго штогод выдаецца альманах. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь заснавала конкурс аўтараў, якім не болей за 35 гадоў, — «Першацвет». Да ўдзелу ў гэтым творчым праекце запрашаюцца маладыя пісьменнікі і з Расіі. Відаць, работа з моладдзю, пачаткоўцамі павінна ў большай ступені канцэнтравацца вакол літаратурна-мастацкіх мас-медыя. Не ўлічваць гэтага нельга. У Беларусі выдаюцца часопісы «Маладосць», «Бярозка». Нядаўна ў Мінску ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў форум «Кніга-Свет», на якім для ўдзелу ў абмеркаванні праблем літаратуры і чытання сабраліся літаратуразнаўцы, пісьменнікі, студэнты, настаўнікі, бібліятэкары. Такіх пляцовак павінна быць як мага болей. Наспела патрэба правесці і агульны беларуска-расійскі семінар маладых літаратараў. Чаму б не зрабіць гэта ў межах мінскага Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час»? Ён праводзіцца штогод у лютым у адзін час з міжнародным кніжным кірмашом. Прыязджае шмат пісьменнікаў, выдаўцоў з самых розных краін. Будзе што пагледзець і будзе аб чым пагаварыць.

**Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы быў створаны на ўстаноўчым з'ездзе ў Мінску ў снежні 2009 года. Галоўнай задачай тады былі вызначаны наступны кірунак — творчасцю садзейнічаць умацаванню сяброўскіх, палітычных і эканамічных адносін паміж Беларуссю і Расіяй, паміж брацкімі народамі.**

...У заключнай рэзалюцыі другога з'езда Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ёсць такія словы: «Пісьменнікі не просяць ільгот і прывілеяў, а жадаюць быць пачутымі, абудзіць грамадскую свядомасць. У гэтым і ёсць іх служэнне грамадству, Радзіме». Хіба ж не мудрыя словы?! На з'ездзе былі абраны сустаршыні творчага аб'яднання. Імі сталі Мікалай Чаргінец і Валерый Ганічаў. Абраны праўленне і прэзідыум Саюза. Што наперадзе? Праца. Актыўная, мастацкая праца па стварэнні тых кніг, тых публікацый, што будуць вартыя ўвагі чытача.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**
*Расійская Федэрацыя, г. Масква*

■ Векапомнае

# СВЯТЫ АБАВЯЗАК КОЖНАГА

## Валанцёры з Беларусі і Польшчы захавалі для нашчадкаў капсулы з зямлёй і падвялі вынікі акцыі «Аднаўленне святыняў Беларусі»



**Ужо каторы раз закладка капсул з зямлёй з месцаў пахавання савецкіх воінаў у крыпту Храма-помніка ў гонар Усіх Святых становіцца адной з галоўных урачыстасцяў года. Толькі так — спрычыніўшыся да вельмі важнага рытуалу — нашчадкі пакалення пераможцаў могуць выказаць шчырую ўдзячнасць тым, хто падараваў ім мірнае сёння.**

Гэтым разам моладзь з Беларусі і Польшчы заклала ў нішы крыпты капсулы з зямлёй, сабранай на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», а таксама на месцы нямецкага лагера для ваеннапалонных «Шталаг-307», дзе ў верасні і кастрычніку 1941 года ад гітлераўскіх куль палегла нямала нашых землякоў.

У канцы верасня добраахвотнікі з валанцёрскага руху «Добрае Сэрца» Брэсцкай абласной арганізацыі БРСМ і з Саюза сельскай моладзі Польшчы, а таксама прадстаўнікі ваенна-гістарычнага клуба «Гарнізон» падчас дабрачыннай працоўнай акцыі пабывалі там, дзе вечным сном спіць больш як 130 тысяч савецкіх ваеннапалонных. Зямля з чатырох пахаванняў, што знаходзяцца каля польскага горада Бяла-Падляска, цяпер захоўваецца ў крыпце.

— На працягу апошніх пяці гадоў мы паспяхова супрацоўнічаем з валанцёрамі з Польшчы ў пытанні добраўпарадкавання вайсковых пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, — расказаў **першы сакратар Брэсцкай абласной арганізацыі БРСМ Віктар ІВАНОЎ.** — Там, дзе мы працавалі сёлета, — вельмі жудаснае месца. Праз яго прайшло звыш 500 тысяч савецкіх ваеннапалонных. Сярод іх — і нашы землякі. Таму нашым святым абавязкам было не толькі добраўпарадкаваць месцы пахавання, а і асвяціць іх, усталяваць там крыжы. Цяпер ідзе работа па распрацоўцы памятнага маршруту, навуковае абгрунтаванне тых падзей.

Урачыстая цырымонія закладкі капсул адбылася ў рамках фіналу рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Аднаўленне святыняў Беларусі». Пачынаючы з 2013 года, добраахвотнікамі БРСМ упарадкавана каля 780 культавых аб'ектаў па ўсёй краіне.

Як падкрэсліла **сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, старшыня Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Вікторыя МЯНАНАВА,** сёлета рэспубліканская дабрачынная акцыя выйшла на новы міжканфесійны ўзровень. «Калі раней наша супрацоўніцтва адбывалася толькі з Беларускай праваслаўнай царквой, то ў бягучым годзе саюз моладзі выступіў з ініцыятывай правядзення акцыі з удзелам усіх асноўных рэлігійных канфесій Беларусі, — дадала сакратар ЦК БРСМ. — Толькі сёлета было добраўпарадкавана каля 250 культавых аб'ектаў, больш чым 30 з якіх адносіцца да каталіцкай канфесіі. Сёння мы даём старт новаму праекту — экскурсійнаму маршруту «Святыні Беларусі», які будзе пракладзены па тых культавых аб'ектах, якія былі добраўпарадкаваны сіламі нашых валанцёраў».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Аднаўленне святыняў — вельмі важная справа, — перакананы **вікарны епіскап Мінска-Магілёўскай архіепархіі Юрый КАСАБУЦКІ.** — Але гэта не толькі матэрыяльнае адраджэнне храма. Гэта перш за ўсё імкненне аднавіць духоўную святыню, якая знаходзіцца ў чалавечым сэрцы. Добраўпарадкаванне храма спрыяе таму, што чалавек мае магчымасць наведваць яго, прыйсці ў святыню, каб сустрэцца з Богам, — і такім чынам аднавіць сваю духоўнасць, свае карані, узняць узровень сваёй маральнасці.

Як адзначыў **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Беларусі Леанід ГУЛЯКА,** даволі сімвалічна, што гэтая акцыя аб'ядноўвала прадстаўнікоў найбольш масавых рэлігійных канфесій, у першую чаргу праваслаўнай і каталіцкай.

У Белай зале Храма-помніка валанцёры з усіх абласцей Беларусі прэзентавалі свае тэматычныя выставы. Дзякуючы фотакалажам, шматлікім вырабам, відэаролікам, моладзь расказала аб культавых аб'ектах, якія былі добраўпарадкаваны на працягу года. Ацаніў работу валанцёраў і Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

— Я шчыра радуюся, што моладзь прымае ўдзел у адраджэнні святыняў на беларускай блаславёнай зямлі, — адзначыў **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел.** — У апошнія гады наша ўвага прыкавана да Блізкага Усходу. Пагледзіце, што робяць заваёўнікі, звярніце ўвагу на іх папярэднікаў. Яны абсякалі карані народа, спрабавалі знішчыць ідэнтычнасць людзей, якая адлюстроўвалася ў храмах, культавых пабудовах, манастырах. Святыні — гэта ж не толькі культурная спадчына, не толькі мастацтва або дойлідства. Гэта ўнутраны свет чалавека, грамадства. Не выпадкова ўсе заваёўнікі разбуралі храмы, тым самым знішчалі цэлы культурны і духоўны пласт, выкарчоўвалі карані, сокамі якіх сілкаваліся многія пакаленні. Як толькі мы спрабуем адрадзіць храмы і манастыры, пагледзіце, як адразу паўстаюць нашы злоснікі. А ўсё таму, што храмы — гэта аснова духоўнага жыцця нацыі, народа. І беларускі народ спрабуе зрабіць усё дзеля таго, каб будучыя пакаленні не пазбавіліся гэтага каштоўнага дару.

Падчас міжканфесійнага адкрытага дыялогу «Аднаўляючы святыні — ствараем будучыню!», які адбыўся напрыканцы мерапрыемства, прадстаўнікі духавенства і грамадскія дзеячы абмеркавалі з моладдзю надзённыя пытанні. Дыскусія атрымалася даволі цікавай.

**Вераніка КАНЮТА.**
*veronika_kanyuta@mail.ru*

## ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ» проводит открытые торги, а также повторные торги в форме аукциона по продаже имущества ЗАСО «Дельта Страхование», находящегося в процедуре ликвидации

**Продавец:** ЗАСО «Дельта Страхование» (г. Минск, ул. Р. Люксембург, д. 95, ком. 319, р/с 3411252474022, ОАО «Белинвестбанк», ЦБУ 540, код 153001739).
**Организатор торгов:** ООО «Правовая компания «Антикризисный консалтинг АСС ВУ», для получения более подробной информации о торгах ЗАСО «Дельта Страхование» Вы можете обратиться по тел. 8 (017) 204 50 03, а также найти интересующую Вас информацию на сайте **www.acc.by**

| № лота | Описание предмета торгов | Кол-во | Начальная стоимость, долларов США, без НДС | Ставка НДС (%) | Сумма НДС, долларов США | Начальная стоимость с НДС, долларов США | Размер задатка, долларов США | Шаг торгов, долларов США |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Облигации третьего выпуска, ООО «Гольф Клуб»;** Тип – именные; Вид доходности – процентный; Серия - «ГК-3»; Номинальной стоимостью 1 000 (одна тысяча) Долларов США; Срок обращения – 1826 календарных дней; Номер в государственном реестре ценных бумаг № 6-236-02-1236 от 18 октября 2011 года | 1642 шт. | 1 477 800 | Без НДС | Без НДС | 1 477 800 | 1 477. 80 | 73 890 |
| 2 | **Облигации первого выпуска, ООО «Новое партнерство»;** Тип – именные; Вид доходности – процентный; Номинальной стоимостью 1 000 (одна тысяча) долларов США; Срок обращения – 1826 календарных дней | 133 | 133 000 | Без НДС | Без НДС | 133 000 | 133 | 6 650 |
| **№ лота** | **Описание предмета торгов** | **Кол-во** | **Начальная цена, бел. руб., без НДС** | **Ставка НДС (%)** | **Сумма НДС, бел. руб.** | **Начальная цена с НДС, бел. руб.** | **Размер задатка, бел. руб.** | **Шаг торгов, бел. руб.** |
| 3 | **Автомобиль TOYOTA CAMRY, 2004 г.в.** Легковой седан. Цвет серебристый металлик. Объем 2,4 куб.м Механическая коробка передач | 1 | 6 660 | 20 | 1 332 | 7 992 | 80 | 400 |

Торги/повторные торги проводятся в соответствии с Постановлением Советом Министров № 16 от 8 января 2013 г. «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».

Для участия в торгах/повторных торгах необходимо внести сумму задатка по интересующему(-им) лоту(-ам) на реквизиты ЗАСО «Дельта Страхование» (р/с 3411252474022, ОАО «Белинивестбанк», ЦБУ 540, код 153001739, УНП 100336711) и направить в адрес организатора торгов (220079, г. Минск, а/я 267, director@acc.by) заявление на участие в торгах/повторных торгах с приложением документов, подтверждающих уплату суммы задатка.

Результаты торгов/повторных торгов оформляются протоколом о результатах торгов.

С участником, победившим по результатам торгов/повторных торгов, в течение 3-х рабочих дней заключается основной (предварительный) договор купли продажи.

Срок оплаты приобретенного предмета торгов/повторных торгов устанавливается в договоре купли-продажи, заключаемого по результатам торгов/повторных торгов в течение 3-х рабочих дней.

В случае если заявление на участие в торгах/повторных торгах подано только одним участником или для участия в торгах/повторных торгах явился только один участник, или для участия в торгах/повторных торах не было подано ни одного заявления, или ни один из участников не явился, торги/повторные торги признаются несостоявшимися и комиссия оформляет протокол о признании торгов/повторных торгов несостоявшимися.

В случае если торги/повторные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов/повторных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов/повторных торгов этому участнику аукциона.

**Повторные торги по лотам №№1, 3 состоятся 01.11.2016 в 12 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, к. 3, офис 2304.**

Первоначальные торги по лотам №№ 1, 3 опубликованы в газете «Звязда» от 07.09.16 г.

**Торги по лоту № 2 состоятся 22.11.2016 в 12 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Скрыганова, д. 6, к. 3, офис 2304.**

Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами, указанными в п. 12 Постановления Совета Министров от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица» принимаются с момента публикации указанного объявления до **18 часов 00 минут 31.10.2016**.



## ООО «Центр Белинвентаризация»
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**

- Раздел и установление порядка пользования земельным участком
- Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения
- Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
- Оценка всех видов собственности

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже имущества ОАО «Полесьестрой»

| № лота | Наименование и характеристики объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (здание плотничного цеха) с инв. №330/С-22650, площадью 1156,3 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Советская, 19Б, по начальной цене: *47 192,13 руб.;* – Капитальное строение (здание гаража) с инв. №330/С-24733, площадью 264,1 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Советская, 19Б/2, по начальной цене: *34 206,04 руб.;* – Капитальное строение (здание гаражей) с инв. №330/С-24732, площадью 189,5 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Советская, 19Б/1, по начальной цене: *24 483,09 руб.*; – Капитальное строение (здание склада технических материалов) с инв. №330/С-24734, площадью 45,2 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Советская, 19Б/3, по начальной цене: *2 928,60 руб.*; – Капитальное строение (здание административное) с инв. №330/С-24735, площадью 48,8 кв.м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Советская, 19Б/4, по начальной цене: *11 128,68 руб.* | **119 938,54 руб.** (1 199 385 400 бел руб.) | **11 993,85 руб.** (119 938 500 бел. руб.) |
| **Информация о земельном участке** | Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 341500000001000128, площадью 1,3341 га | | |
| **Срок подачи заявления** | **По 27 октября 2016 г. в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** | | |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **28 октября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1** | | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 18.10.2016 г. | | |
| **Условия продажи** | Имущество продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5%. Заключить договор купли-продажи в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость имущества согласно договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона | | |

**Подробная информация в газете «Звязда» от 23.09.2016 г., на сайте www.bti-gomel.by и по тел. (0232) 75 06 62, (029) 341 15 45**



Утерянный страховой полис добровольного страхования от несчастных случаев, болезней во время поездки за границу ЗАО СК ЭРГО серии БО 0466331 считать недействительным.


■ Надвор'е

# Халодны кастрычнік

## А ў другой палове тыдня спецыялісты прагназуюць першы мокры снег

**Практычна на працягу ўсяго тыдня на тэрыторыі Беларусі надвор'ем будзе кіраваць скандынаўскі антыцыклон, толькі ў паўднёва-заходніх раёнах адчуецца ўплыў атмасферных франтоў, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**



Таму тэмпературны рэжым будзе прыкладна на 2—3 градусы ніжэйшы за норму. Сёння ўдзень будзе пераважна без ападкаў, а максімальная тэмпература паветра складзе 3—9 цяпла. Прагназуецца, што і ў сераду таксама будзе пераважна без ападкаў, толькі ў некаторых раёнах па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай магчымы слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, а па ўсходзе — да 6 марозу. Удзень чакаецца толькі плюс 3—плюс 9 градусаў.

У другой палове тыдня надвор'е ўвогуле сапсуецца, калі стане яшчэ халадней і месцамі пройдзе мокры снег. Непасрэдна ў чацвер будзе пераважна без ападкаў, толькі ў некаторых раёнах на захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Аднак уначы і раніцай магчымы мокры снег і слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, а па паўночным усходзе — да мінус 5 градусаў. Удзень прагназуецца 2—9 цяпла, але пасля мокрага снегу ўначы і замаразкаў будзе складацца ўражанне, што на дварэ стаіць «маладая зіма».

Будзе пераважна без ападкаў і ў пятніцу, аднак у паўднёва-заходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай магчымы мокры снег, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, а ўдзень — плюс 2—9 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, даволі некамфортныя ўмовы надвор'я чакаюць нас і на выходныя. У суботу кароткачасовыя дажджы пройдуць пераважна па паўднёвым захадзе. Аднак там уначы і раніцай магчымы мокры снег, слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, а ўдзень чакаецца 2—9 цяпла. У нядзелю кароткачасовыя дажджы прагназуюцца ўжо амаль паўсюдна па краіне, але ўначы і раніцай па паўночным усходзе яны чакаюцца з мокрым снегам. У некаторых раёнах магчымы слабы галалёд. Будзе вільготна і холадна, калі тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, а ўдзень — ад плюс 2 да плюс 8 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


## ИТОГИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Выбери яркое развлечение!»

Организатор рекламной игры: ООО «Хэппи Нейшен», юридический адрес: 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, пом. 4, оф. 9, УНП 190871314. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2774, выдано Министерством торговли Республики Беларусь 6 июня 2016 г.

В рекламной игре приняло участие 311 физических лиц. Призовой фонд разыгран не полностью.
Срок проведения: с 15 июня 2016 г. по 31 октября 2016 г.

**СПИСОК ПОБЕДИТЕЛЕЙ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПЕРВОКЛАССНЫЕ КАНИКУЛЫ!»**

| ФИО Победителей | Наименование приза |
|---|---|
| Шугай Александр Анатольевич | **Главный приз** – Подарочный сертификат на поездку в Амстердам на музыкальный фестиваль, проводимый с 22 по 23 октября 2016 г. – 1 поездка на 2 человек с 21 октября 2016 г. по 24 октября 2016 г. включает в себя: авиаперелет для двух человек с 21.10.2016 по 24.10.2016 г. по маршруту: Минск – Амстердам (Нидерланды) – Минск; посещение музыкального фестиваля. Проживание двух человек в двухместном номере в отеле категории не ниже 3* в Амстердаме (Нидерланды) с 21.10.2016 по 24.10.2016 г. Входные билеты для двух человек на музыкальный фестиваль Amsterdam Music Festival с 22 по 23 октября 2016 г. в размере 4 100 белорусских рублей 00 копеек / 41 000 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 597 белорусских рублей 85 копеек / 5 978 506 белорусских рублей |
| Охлонин Борис Анатольевич | **Приз Первой категории –** Сертификат на покупку билетов в кино и на иные развлекательные мероприятия на сайте www.bycard.by в размере 300 белорусских рублей 00 копеек / 3 000 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 29 белорусских рублей 36 копеек / 293 621 белорусский рубль |
| Кожемякина Наталья Петровна | |
| Супраненок Виолетта Петровна | |
| Сорокопыт Владимир Александрович | |
| Ушко Елена Олеговна | |
| Карасева Надежда Константиновна | |
| Афанасенко Денис Леонидович | |
| Карначева Людмила Владимировна | |
| Визнер Ирина Витальевна | |
| Кукуюк Наталия Леонидовна | |
| Мухина Татьяна Николаевна | |
| Волчек Денис Сергеевич | |

**Приз Второй категории –** Сертификат на покупку билетов в кино и на иные развлекательные мероприятия на сайте www.bycard.by в размере 10 белорусских рублей 00 копеек / 100 белорусских рублей

| | |
|---|---|
| **ЦВП (г. Минск)** | |
| Гащук Елена | Чепиков Евгений Игоревич |
| Гащук Елена | Смолик Александра Юрьевна |
| Гащук Елена | Бегер Дарья Анатольевна |
| Долгая Виктория | Октысюк Алеся Михайловна |
| Долгая Виктория | Кондратьев Михаил Александрович |
| Долгая Виктория | Кондратьев Михаил Александрович |
| Басуков Евгений | Кондратьев Михаил Александрович |
| Карпенко Анна | Тимошек Кристина Леонидовна |
| Карпенко Анна | Данилюк Даниил Михайлович |
| Карпенко Анна | Павловец Анастасия Александровна |
| Каштельян Светлана Евгеньевна | Синица Елена Александровна |
| Кондратьев Михаил Александрович | Терешко Денис Андреевич |
| Кондратьев Михаил Александрович | Загорский Егор Светославович |
| Кондратьев Михаил Александрович | Оразимбетова Нафиса Мовламбергеновна |
| Кондратьева Ольга Валерьевна | Царикевич Вероника |
| Кондратьева Ольга Валерьевна | Романчук Константин Алексеевич |
| Кондратьева Ольга Валерьевна | Каштельян Светлана Евгеньевна |
| Габарова Анна Николаевна | Оразимбетова Нафиса Мовламбергеновна |
| Габарова Анна Николаевна | Тиро Наталья Николаевна |
| Габарова Анна Николаевна | Суханов Евгений Александрович |
| Кондратьев Сергей Александрович | Шупик Татьяна Анатольевна |
| Кондратьев Сергей Александрович | Охлонин Борис Анатольевич |
| Каштельян Светлана Евгеньевна | Шумский Кирилл Игоревич |
| Каштельян Светлана Евгеньевна | Павловец Анастасия Александровна |
| Каштельян Светлана Евгеньевна | Кондратьев Михаил Александрович |
| Шупик Татьяна Анатольевна | Захарченя Евгения Александровна |
| Кондратьев Михаил Александрович | Дунец Наталья Генадьевна |
| Кондратьев Михаил Александрович | Веретенникова Ирина Евгеньевна |
| Кондратьев Михаил Александрович | Бохан Алина Александровна |
| Кислейко Сергей Петрович | Каштельян Светлана Евгеньевна |
| Варванцева Инна Владимировна | Каштельян Светлана Евгеньевна |
| Кондратьев Михаил Александрович | Дыдо Антонина Михайловна |
| Кондратьев Михаил Александрович | Баскаков Евгений Витальевич |
| Кондратьев Михаил Александрович | Охлонин Борис Анатольевич |
| Радченко Алексей Николаевич | Охлонин Борис Анатольевич |
| Баскаков Евгений Витальевич | Охлонин Борис Анатольевич |
| Баскаков Евгений Витальевич | Охлонин Борис Анатольевич |
| Дылевская Екатерина Ивановна | |
| **ЦВП (г. Витебск)** | |
| Вильтовская Марина Сергеевна | Вильтовская Марина Сергеевна |
| Исакович Ольга Ивановна | Замостоцкая Наталья Александровна |
| Вурганова Инна Михайловна | Наковкин Дмитрий Львович |
| Семенченко Семен Юрьевич | Вильтовская Марина Сергеевна |
| Рутковский Георгий Павлович | Колесникович Нина Федоровна |
| Матвеев Алексей Иванович | Колесникович Нина Федоровна |
| Бурий Анна Васильевна | Колесникович Игорь Николаевич |
| Костальцова Анастасия Андреевна | Колесникович Игорь Николаевич |
| Вильтовская Марина Сергеевна | Демешко Екатерина александровна |
| Булейко Юлия Александровна | Салодкина Светлана Александровна |
| Вурганова Инна Михайловна | Рокеусская Марина Генндьевна |
| **ЦВП (г. Гомель)** | |
| Дулуб Екатерина Алатольевна | Перунова Ирина Ивановна |
| Вильнецкий Денис Сергеевич | Шавловская Наталья Александровна |
| Репникова Александра Алексеевна | Золоторева Полина Леонидовна |
| Вильнецкий Денис Сергеевич | Золоторев Даниил Владимирович |
| Золоторева Анна Владимировна | Белич Галина Федоровна |
| Кабанов Денис Николаевич | Лобан Галина Ивановна |
| Григоренко Надежда Алексеевна | Остапенко Ольга Васильевна |
| Куринная Алина Алексеевна | Белич Галина Федоровна |
| Алексейчук Ульяна Александровна | Белич Галина Федоровна |
| Астапенко Надежда Анатольевна | Золоторев Даниил Владимирович |
| Золоторева Галина Леонидовна | Золоторев Даниил Владимирович |
| Золоторева Галина Леонидовна | Золоторев Даниил Владимирович |
| Чораев Артем Иванович | Золоторева Полина Леонидовна |
| Чораев Артем Иванович | Золоторева Галина Леонидовна |
| Чораев Артем Иванович | Золоторева Галина Леонидовна |

**Телефон для справок по вопросам проведения игры: 8-017-296-67-83 (в будние дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00).**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта | Право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 400/С-92074 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), арендуемой площадью 92,6 кв.м, по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 6А. |
| Начальная цена продажи | 314,84 р. (триста четырнадцать рублей восемьдесят четыре копейки) с учетом НДС |
| Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды | 2,5 |
| Сумма задатка | 31 р. (тридцать один рубль) |
| Условия аукциона | Целевое назначение арендуемых помещений – для размещения склада, производственного помещения, офиса |
| Продавец | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5. Тел. 8-0163-42-25-08 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора аренды | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/сч для перечисления задатка | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 18 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
– заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
– юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
– индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
– юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
– представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
– физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
– представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 14 ноября 2016 г. до 15.00**

*Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» (Продавец) на праве хозяйственного ведения:**

**Лот № 1:** Туристический автобус MAN 18.410 номер кузова WMAA51ZZ04S002115, 2006 г.в. Тип ТС – автобус вагон. Цвет – светло-бежевый; Двигатель – дизельный. Объем двигателя – 11970 см³. Количество мест – 49 пассажирских + 2. Имеются телевизор + DVD, громкая связь, салон велюр, кондиционер, холодильник. Транспортное средство на ходу. Находится по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4. Начальная цена – 136 696,36 бел. руб. Задаток – 6 834,82 бел. руб.

**Лот № 2:** Фольксваген мультивэн номер кузова WV2ZZZ7HZ8H038690, 2007 г.в. Тип ТС – легковой вагон. Цвет – темно-синий металлик; тип КП – АКП; количество мест – 4 пассажирских места + 2. Двигатель – дизельный. Объем двигателя – 2460 см³. Разрешенная масса, max – 3000 кг. Перечень оборудования содержится на сайте Организатора. Транспортное средство на ходу. Находится по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4. Начальная цена – 24 216,79 бел. руб. Задаток – 1 210,84 бел. руб.

**Лот № 3:** Грузовой самосвал МАЗ 5551 номер кузова б/н., 1993 г.в. Цвет – синий. Тип КП – механическая; Количество мест – 2. Двигатель – дизель. Разрешенная масса, max – 16000 кг. Транспортное средство не на ходу. Находится по адресу: Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 14. Начальная цена – 1 944,00 бел. руб. Задаток – 97,20 бел. руб.

**Лот № 4:** Грузовой специальный самосвал MAZ 555102-2123 номер рамы Y3M55510240004753, 2004 г.в. Цвет – желтый. Количество мест – 2. Двигатель – дизель. Разрешенная масса, max – 18000 кг. Транспортное средство на ходу. Находится по адресу: Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 14. Начальная цена – 6 534,00 бел. руб. Задаток – 326,70 бел. руб.

**Лот № 5:** Оборудование отраслевой лаборатории радиационной безопасности. Находится по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25. Полный перечень входящего в состав Лота оборудования содержится на сайте Организатора. Обременение: аренда. Договор аренды на срок до 31.10.2016. Начальная цена – 3 404,54 бел. руб. Задаток – 170,23 бел. руб.

**Лот № 6:** Легковой хэтчбэк Фольксваген Поло, номер кузова WVWZZZ6NZ1Y304716, 2002 г.в. Цвет – белый; Тип двигателя – бензиновый, турбонадув с рабочим объемом 1 000 см³. КПП – механическая. Количество мест: 5. Перечень оборудования содержится на сайте Организатора. Транспортное средство не на ходу. Находится по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4. Начальная цена – 2 772,00 бел. руб. Задаток – 138,60 бел. руб.

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), проводимом 21 ноября 2016 г. Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) - Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by. в сумме не более 120,00 (Сто двадцать белорусских рублей 00 копеек) в денежных знаках образца 2009 г.

Затраты, связанные со снятием транспортных средств с учета, несет Победитель аукциона (Претендент на покупку).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу затраты, связанные с организацией и проведением торгов по Лоту №5 в размере 34,74 (Тридцать четыре белорусских рубля 74 копейки) в денежных знаках образца 2009 г.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов.

Аукцион состоится 21.11.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. Окончание приёма заявлений – 17.11.2016 в 12.00.

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов аукциона: Сайко Андрей Геннадьевич 8 (044) 552-42-92.

Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот (лоты) с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Организатор аукциона: 8(017) 306–00–57, 8(029) 356–90–03, 8(029) 550–09–52
● www.ino.by ● e–mail: torgi@ino.by

---

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «МИЛКАВИТА», г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1 |

**Предмет аукциона – производственная база (имущество реализуется одним лотом). Месторасположение: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Луначарского, 33**

| № п/п | Инвентарный номер | Наименование | Общая площадь | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|---|
| Назначение зданий: специализированные для производства продуктов питания, включая напитки, и табака | | | | |
| 1 | 340/С-29151 | **Нежилое здание (материально-технический склад)** | 198 кв.м | 33/2 |
| 2 | 340/С-29144 | **Нежилое здание (лаборатория)** | 105 кв.м | 33/7 |
| 3 | 340/С-29145 | **Нежилое здание (здание заглубленного склада)** | 171 кв.м | 33/1 |
| 4 | 340/С-29143 | **Нежилое здание (административный корпус)** | 299,5 кв.м | 33 |
| 5 | 340/С-29152 | **Нежилое здание (компрессорная)** | 218 кв.м | 33/4 |
| 6 | 340/С-29146 | **Нежилое здание (здание мойки автоцистерн)** | 67 кв.м | 33/8 |
| 7 | 340/С-29153 | **Котельная** | 506,7 кв.м | 33/3 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, труба дымовая кирпичная | | | | |
| 8 | 340/С-29159 | **Производственный корпус** | 1645,7 кв.м | 33/6 |
| Составные части и принадлежности: десять пристроек, асфальтированная промышленная площадка, ограждение территории, два крыльца | | | | |
| 9 | 340/С-306281 | **Наружные тепловые сети** | 97,4 м | 33 |
| 10 | 340/С-306278 | **Сети рассола и ледяной воды** | 96,4 м | 33 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **1,3448** га предоставлен продавцу для содержания и обслуживания производственной базы на праве постоянного пользования. Ограничения (обременения) — находится в водоохранных зонах | | | | |
| 11 | 340/С-29147 | **Нежилое здание (трансформаторная подстанция)** | 62 кв.м. | 33/5 |
| **Сведения о земельном участке**: пл. **0,0116 га** предоставлен продавцу для содержания и обслуживания трансформаторной подстанции № 5 на праве постоянного пользования. Ограничения (обременения) — находится в водоохранных зонах | | | | |
| 12 | 340/С-306276 | **Сети канализационные керамические К4** | 82,5 м | 33 |
| 13 | 340/С-306277 | **Сети канализационные керамические К11** | 410,1 м | 33 |
| 14 | 340/С-306275 | **Сети водопроводные стальные В1** | 15,5 м | 33 |
| 15 | 340/С-306273 | **Сети водопроводные стальные В19** | 136,7 м | 33 |
| 16 | 340/С-306274 | **Сети водопроводные стальные В21** | 49,2 м | 33 |
| 17 | 340/С-306279 | **Газопровод стальной** | 138,8 м | 33 |

**Начальная цена с НДС — 1 333 845 руб. 27 коп. (снижена на 20%)** (13 338 452 700 бел. руб.)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 03.08.2016**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **09.11.16** в 11 ч.00 мин. по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **08.11.2016** до 17 ч.00 мин. по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

---

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:**

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже **здания рынка на 250 мест**, расположенного по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, пл. Максима Горького, д. 5 и принадлежащего Индивидуальному предпринимателю Рондаку Д.А., опубликованном в г. «Звязда» от 12.10.2016, вносятся изменения: вместо «**Задаток 10 %» читать: «Задаток 1 %»**.

| | |
|---|---|
| Контактные телефоны: | Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by |

---

ИТОГИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Первоклассные каникулы!»

Организатор рекламной игры: ООО «Хэппи Нейшен», юридический адрес: 220034, г. Минск, ул. Краснозвездная, 18Б, пом. 4, оф. 9, УНП 190871314. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2775, выдано Министерством торговли Республики Беларусь 6 июня 2016 г.

В рекламной игре приняло участите 742 физических лица.

Призовой фонд разыгран полностью.

Срок проведения: с 15 июня 2016 г. по 31 октября 2016 г.

**СПИСОК ПОБЕДИТЕЛЕЙ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПЕРВОКЛАССНЫЕ КАНИКУЛЫ!»**

| ФИО Победителей | Наименование Приза |
|---|---|
| Лучкина Жанна Викторовна | **Главный приз –** Подарочный сертификат в счет оплаты туристических услуг, оказываемых на территории Республики Беларусь, срок действия до 12 мая 2017 года в размере 1 950 белорусских рублей 00 копеек / 19 500 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 276 белорусских рубля 59 копеек / 2 765 862 белорусских рубля |
| Гайдук Роман Юрьевич | **Приз Первой категории –** велосипед взрослый Rocco Zehn в размере 528 белорусских рублей 00 копеек / 5 280 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 64 белорусских рубля 10 копеек / 641 034 белорусских рубля |
| Лазовикова Ольга Евгеньевна | |
| Игнатенко Дмитрий Васильевич | |
| Талюк Анастасия Васильевна | |
| Хаткевич Вадим Дмитриевич | |
| Зубец Никита Васильевич | |
| Дворник Сергей Петрович | |
| Охлонин Борис Анатольевич | |
| Алексеенко Александр Сергеевич | |
| Захаренков Юрий Валерьевич | |
| Балюнов Егор Валерьевич | **Приз Второй категории –** Диван-подушка в размере 309 белорусских рублей 60 копеек / 3 096 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 31 белорусский рубль 47 копеек / 314 690 белорусских рублей |
| Гуцева Алла Александровна | |
| Шавель Владимир Валентинович | |
| Струк Ева Сергеевна | |
| Дроздова Наталья Николаевна | |
| Черноус Жанна Анатольевна | |
| Агарок Ольга Юрьевна | |
| Ульяницких Наталья Владимировна | |
| Глухова Галина Михайловна | |
| Зубец Никита Васильевич | |
| Погодина Елена Николаевна | |
| Жингель Анна Егоровна | |

| ФИО Победителей | Наименование Приза |
|---|---|
| Столярова Татьяна Николаевна | **Приз Третьей категории –** Цифровая камера Sony DSC-830W, черная в размере 230 белорусских рублей 40 копеек / 2 304 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 19 белорусских рублей 63 копейки / 196 345 белорусских рублей |
| Маггерамов Алиовсат Александрович | |
| Жадик Юлия Валерьевна | |
| Кудухова Кристина Юрьевна | |
| Симанович Екатерина Руслановна | |
| Дюбкова Наталья Николаевна | |
| Выглазова Евдокия Марковна | **Приз Третьей категории –** Цифровая камера Sony DSC-830W, серебристая в размере 230 белорусских рублей 40 копеек / 2 304 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 19 белорусских рублей 63 копейки / 196 345 белорусских рублей |
| Сурнакова Ирина Федоровна | |
| Пашкова Ольга Сергеевна | |
| Хозеев Владимир Алексеевич | |
| Абышева Лейли Ватановна | |
| Карначева Людмила Владимировна | |
| Янушкевич Андрей Александрович | |
| Штоп Анжела Владимировна | |
| Мурзина Наталья Анатольевна | |
| Гришан Екатерина Сергеевна | |
| Нитченко Виктор Михайлович | |
| Дубровская Ольга Владимировна | |
| Хурбатов Максим Александрович | **Приз Третьей категории –** Цифровая камера Sony DSC-830W, розовая в размере 230 белорусских рублей 40 копеек / 2 304 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 19 белорусских рублей 63 копейки / 196 345 белорусских рублей |
| Левурда Роман Васильевич | |
| Варакса Галина Григорьевна | |
| Коверчик Анастасия Ивановна | |
| Маслак Валентина Петровна | |
| Атрошенко Ольга Петровна | **Приз Третьей категории –** Цифровая камера Sony DSC-830W, фиолетовая в размере 230 белорусских рублей 40 копеек / 2 304 000 белорусских рублей и денежных средств в размере 19 белорусских рублей 63 копейки / 196 345 белорусских рублей |
| Сидорович Сергей Николаевич | |
| Рог Ирина Александровна | |
| Вергунов Вячеслав Владимирович | |
| Яковин Андрей Сергеевич | |

**Телефон для справок по вопросам проведения игры: 8-017-296-67-83 (в будние дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00).**

КАРАНІ І КРОНЫ

7

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 5 (13)

■ Круглы стол

# ДАРЫ ПРЫРОДЫ: МАЕМ БОЛЬШ, ЧЫМ СПАЖЫВАЕМ

**Прыродны патэнцыял, якім валодае наша краіна, значна пераўзыходзіць яго выкарыстанне. З аднаго боку, гэта сведчыць пра багацце нашых дароў прыроды, з іншага — настройвае на больш актыўную нарыхтоўку і эфектыўнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў. Біяразнастайнасць беларускай флоры і фаўны з'яўляецца істотным рэзервам для эканамічнага развіцця дзяржавы. Акрамя таго, натуральныя айчынныя прадукты здольныя значна палепшыць якасць жыцця беларусаў.**

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь усё больш настойліва праводзіць палітыку, арыентаваную на павелічэнне спажывання рэсурсаў жывёльнага і расліннага свету, пры абавязковай умове беражлівых адносін да багаццяў нашай прыроды.**

**Аб тым, якія запасы мы маем, як яны выкарыстоўваюцца, разважалі спецыялісты — прадстаўнікі Мінпрыроды, Белкаапсаюза, навукоўцы, практыкі за «круглым сталом», арганізаваным часопісам «Родная прырода».**

## ГРЫБОЎ У НАС МІЛЬЁН ТОН!



**Ірына СЫСОЙ, навуковы супрацоўнік сектара кадастру раслiннага свету ІЭБ НАН Беларусі:**

— Штогод з Інстытутам лесу НАН Беларусі мы даследуем запасы, стан, структуру грыбоў. Вызначаны прагнозныя запасы па ўсёй краіне — амаль мільён тон. Рэкамендаваны аб'-ём нарыхтовак — больш за 200 тысяч тон. Аб'ёмы закупак 2015 года сведчаць аб тым, што грыбоў выкарыстоўваецца 5% ад рэкамендаваных аб'ёмаў, ягад — 11 %, лекавых раслін — менш за 1%.

Аналіз дзейнасці нарыхтоўчых арганізацый паказвае, што шмат сыравіны закупляецца за мяжой. Напрыклад, брусьнічны ліст у Беларусі нарыхтоўваюць у невялікіх аб'ёмах. А сыравіну можна выкарыстоўваць і на экспарт. Гэта тычыцца і іншых лясных ягад: чарніц, брусніц, журавін балотных. Іх запасы ў нас — велізарныя.

Навукоўцы вывучылі прыродны патэнцыял усіх раёнаў Беларусі, таму нарыхтоўчым арганізацыям лёгка зарыентавацца ў тым, дзе ім найбольш спрыяльна працаваць. Напрыклад, да нас звярнулася «Беласептыка» за парадай на гэты конт. Прадпрыемству было рэкамендавана абрацьу фармацэўтычных мэтах Мядзельскі раён. Цяпер там ёсць «Аптэкарскі сад», дзе пасаджаны плантацыі лекавых раслін. Такім чынам, прадпрыемства пакрывае свае выдаткі на імпарт уласнай вытворчасцю. Вырошчваюць тут эхінацэю — тую самую, якую яшчэ нядаўна закуплялі за мяжой. У аптэках з'явіліся беларускія лекі, выробленыя на яе аснове.

Таксама ёсць магчымасць павялічыць колькасць гатовых прэпаратаў на аснове тых раслін, якія дазволены для выкарыстання ў фармакапеі. Вельмі важна развіць яшчэ адзін не менш перспектыўны напрамак: занянца тымі відамі, якія пакуль не зацверджаны для фармакапеі. Як, напрыклад, ліст чарніц. Вядома, што параснікі чарніц выкарыстоўваюцца як сродак супраць дыябету. А менавіта чарніцы па сваіх аб'ёмах з'яўляюцца лідарам сярод дзікарослых лекавых раслін.

## КАБ ЗБІРАЦЬ, ТРЭБА ВЕДАЦЬ ПРАВІЛЫ

**Тацццяна ЖАЛЯЗНОВА, кансультант аддзела біялагічнай разнастайнасці Мінпрыроды:**



— Перш за ўсё, варта сказаць аб тым, што грамадзяне маюць права свабодна знаходзіцца на тэрыторыі ляснога фонду і бясплатна збіраць ягады, арэхі, грыбы, лекавыя расліны для ўласных патрэб.

**Ірына СТЭХ-САНКЕВІЧ, прэс-сакратар Мінпрыроды:**



— Як без шкоды для прыроды збіраць грыбы, ягады, арэхі і іншае, прапісана ў правілах нарыхтоўкі дзікарослых раслін. Напрыклад, грыб збіраецца толькі ручным спосабам шляхам выкручвання або зразаецца нажом ля кораня, не парушаючы грыбніцу. Дарэчы, нельга разграбаць мох у пошуку грыбоў, у прыватнасці, лісічак.

Ягады збіраюцца ў вызначаныя тэрміны, якія ўстанаўліваюцца мясцовымі распарадчымі і выканаўчым органам па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі органамі профільных міністэрстваў. Напрыклад, нельга збіраць ягады брусніцы з утрыманнем недаспелых ягад больш за 1 % ад сабранай масы, а таксама ягады журавін з утрыманнем недаспелых ягад больш за 5 % ад сабранай масы.

Збіранне арэхаў, ягад механічнымі прыстасаваннямі, такімі, як грэбень, савок — забараняецца. Гэта пашкоджвае расліны і ў канчатковым выніку прыводзіць да таго, што ягаднікі драбнеюць, зніжаецца іх ураджайнасць.

**Людміла ПАЎЛОЎСКАЯ, начальнік аддзела тэхналогій кансервавання харчовых прадуктаў НПЦ НАН Беларусі па харчаванні:**



— Скажыце, якімі спосабамі вы даводзіце гэтую інфармацыю да насельніцтва?

**Ірына Стэх-Санкевіч:**

— Гэтая інфармацыя знаходзіцца ў пастаянным доступе на сайце Мінпрыроды. А таксама тыражуецца ў сродках масавай інфармацыі, такім чынам даходзіць да ўсіх жыхароў. Асаблівы інтарэс у насельніцтва выклікаюць тэрміны збору ягад. Пасля таго, як прымаецца рашэнне мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі аб пачатку сезона нарыхтовак, насельніцтва апавяшчаецца аб гэтым па радыё, праз мясцовы друк. Прычым у розных рэгіёнах гэтая інфармацыя можа змяняцца па часе, паколькі кліматычныя ўмовы ўплываюць на тэрміны паспявання лясного ўраджаю.

**«Родная прырода»:**

***— Тацццяна Уладзіміраўна, удакладніце, як закон абараняе прыроду? І пра што кажа статыстыка — грамадства становіцца больш свядомым?***

**Тацццяна Жалязнова:**

— Ёсць нашы тэрытарыяльныя органы, Дзяржінспекцыя пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Яны сочаць за тым, каб не было парушэнняў, выяўляюць браканьераў, прыцягваюць іх да адказнасці згодна з адпаведным заканадаўствам.

Цяпер гэтаму пытанню надаецца больш увагі. Выпадкі затрымання парушальнікаў маюць шырокую агалоску. На мой погляд, грамадства стала больш законапаслухмяным. Хоць, на жаль, не так хутка ў людзей «спее» разуменне таго, што яны шкодзяць не толькі лесу, а наносяць шкоду перш за ўсё сабе. Заўтра яны не знойдуць на тым жа месцы грыбоў, і ўраджай ягад будзе значна бяднейшым.

## СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ НА КАРЫСЦЬ ЗДАРОЎЮ

**«Родная прырода»:**

***— Як змяніліся тэхналогіі перапрацоўкі дароў прыроды з пункту гледжання карысці для арганізма чалавека? Якія з'явіліся навінкі? За кошт чаго пашырыўся асартымент прадукцыі?***

**Людміла Паўлоўская:**

— У апошнія гады наша кансервавая галіна грунтоўна аднавіла абсталяванне — ад старых заводаў мала што засталося. Змяніліся падыходы да самога працэсу кансервавання. Цяпер ніхто бяздумна не выкарыстоўвае высокую тэмпературу там, дзе ў гэтым няма патрэбы. Адпаведна, пры такім падыходзе карысныя рэчывы, якія раней разбураліся з-за тэрмічнай апрацоўкі, цяпер лепш захоўваюцца ў кансервах.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*



■ Надзённае

# АДХОДЫ — У ДАХОДЫ

**Сучаснае грамадства зараз называюць спажывецкім, паколькі кожны дзень людзям патрабуецца харчаванне, электраэнергія, газ, транспарт. Каб забяспечыць чалавека ўсім неабходным, працуюць розныя прадпрыемствы цяжкай і лёгкай прамысловасці, тэхнічна і хімічна ўзброена сельская гаспадарка. Жыццё сённяшняга грамадзяніна ўладкаванае, зручнае, якое заўгодна, толькі не экалагічнае. Тым не менш, над вырашэннем пытанняў аховы навакольнага асяроддзя працуюць тысячы людзей у нашай краіне. Зразумела, на самым высокім узроўні гэтымі праблемамі займаецца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікі падводзяць першыя вынікі сваёй працы за 2016 год. За гэты час было зроблена шмат — ад міжнародных праектаў да ўдзелу ў традыцыйных суботніках і спартакіядах.**

Запланаваныя заданні ў асноўным выкананы ў поўным аб'ёме, а па некаторых напрамках зроблена нават больш, чым разлічвалі. Даўкамплектавана амаль 1000 спартыўных і дзіцячых пляцовак каля вышынных жылых дамоў, пасадзілі больш за 56 тысяч дрэў у дварах (замест запланаваных 37 тысяч), усталявалі 7711 кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць на афіцыйным сайце міністэрства http://minpriroda.gov.by/, дзе рэгулярна размяшчаюцца навіны аб падзеях ведамства і падначаленых арганізацый, дзейнічае рубрыка аб выніках выканання рэспубліканскага плана па навядзенні парадку на зямлі з дадаткам фотаматэрыялаў «Да» і «Пасля».

У Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя добра ведаюць, як важна для захавання прыроднай разнастайнасці правільна абыходзіцца з адходамі. І з пункту гледжання эканомікі — ператвараць іх у даходы.

Сёння існуе адзін перспектыўны напрамак, якому надаюць асаблівую ўвагу, — вытворчасць паліўных гранул (пелет, брыкетаў) з кастры льноперапрацоўкі. Тэхналогія па вырабе паліўных брыкетаў з адходаў наладжана ў Беларусі на Кармянскім ільнозаводзе і Верхнядзвінскім ільнозаводзе (магутнасцю 3,7 тысячы тон у год і 2 тысячы тон у год адпаведна).

Не менш запатрабаваныя — праекты па перапрацоўцы драўняных адходаў у біяпаліва. Напрыканцы верасня на базе вытворчага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Камунальнік» (Брэст) адкрыўся новы комплекс. Цяпер там перапрацоўваюць драўняныя адходы, якія раней для атрымання біяпаліва не выкарыстоўваліся: старую мэблю, пні пасля лесанарыхтоўкі. Прымаецца сыравіна не толькі ад юрыдычных асоб, але і ад насельніцтва.

Мадэрнізацыю прадпрыемства зрабілі ў рамках рэалізацыі праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі» Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў супрацоўніцтве з Праграмай развіцця ААН, што фінансуецца Еўрапейскім саюзам. І гэта толькі адзін з 23 пілотных праектаў і ініцыятыў гэтага напрамку.

У хуткім часе (20 кастрычніка) у Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці на базе ААТ «Жыткавічыхімсэрвіс» адкрыюць новы комплекс па атрыманні высокаэфектыўных арганічных угнаенняў шляхам глыбокай перапрацоўкі сапрапелю. Здабыча сапрапелю ў Жыткавіцкім раёне становіцца безадходнай інавацыйнай вытворчасцю.

На будучы год супрацоўнікаў міністэрства, як і іншых прыхільнікаў паляпшэння экалагічнага стану Беларусі, чакае шмат працы. Спадзяёмся, што яна будзе не менш плённай, чым у гэтым адыходзячым годзе.

**Ірына СТЭХ-САНКЕВІЧ, прэс-сакратар Мінпрыроды.**

# ДАРЫ ПРЫРОДЫ: МАЕМ БОЛЬШ, ЧЫМ СПАЖЫВАЕМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*



**Аксана СКІНДАР, начальнік упраўлення нарыхтовак «Белкаапсаюза»:**

— Цяпер найбольш запатрабаваны і папулярны метад нарыхтоўкі — замарозка. Мы былі першымі, хто адкрыў лініі шокавай замарозкі. Мы пастаянна пашыраем асартымент і лінейку прадукцыі, асвоілі і шматкампанентныя сумесі, напрыклад, для падрыхтоўкі ўзвараў.

## НЕ БОЙЦЕСЯ СЛОВА «КАНЦЭНТРАТ»

**«Родная прырода»:**

***— На паліцах нашых крам пераважна прадстаўлены нектары. Не так карысна, як сокі, затое ўсім «па кішэні». Цікава пачуць ад спецыялістаў, што такое адноўлены сок. Меркаванні спажыўцоў аб яго натуральнасці разыходзяцца.***

**Людміла ПАЎЛОЎСКАЯ:**

— Да 2006 года, пакуль нацыянальную базу на сокавую прадукцыю не прывялі ў адпаведнасць з асноўнымі міжнароднымі патрабаваннямі, у нас сокамі лічылася прадукцыя з некаторым утрыманнем цукру і вады. Цяпер тэрмін «сок» азначае, што гэты прадукт не ўтрымлівае ў сваім складзе ніякіх дабавак, у тым ліку ваду і цукар, за выключэннем магчымага дадання не больш за 1,5% цукру для карэкцыі густу прадукту. Сокі выпускаюць як прамога адціскання — непасрэдна здабываючы яго са свежых пладоў, так і аднoўленыя — прыгатаваныя ў прамысловых умовах з канцэнтраваных сокаў. Безумоўна, у соку прамога адціскання захоўваецца больш прыродных рэчываў, чым у соку, які прайшоў шматразовую тэрмаапрацоўку. Каб атрымаць сокавы канцэнтрат, з яго выпарваюць ваду. Затым пры вытворчасці адноўленага соку дабаўляюць тую самую ваду ў патрэбнай колькасці ў сокавы канцэнтрат.

Ва ўсім свеце выкарыстоўваецца гэтая тэхналогія, яна спрыяе захаванню якасці соку на працягу паўнага часу. Дадзены прыём дазваляе ажыццяўляць разліў аднoўленых сокаў круглы год і транспартаваць іх на вялікія адлегласці. Так у нас з'явіліся сокі з цытрусавых і экзатычных фруктаў.

Што тычыцца беларускіх сокаў прамога адціскання, у тым ліку і з лясных ягад, гэта вельмі карысныя напоі, але трэба мець на ўвазе, што сыравіна ў нас высокакіслотная з-за прыродных умоў. Адпаведна, да ўжывання сокаў трэба ставіцца асцярожна, з улікам стану свайго здароўя. У прыватнасці, рэкамендуецца піць сок, разведзены вадой, асабліва на пусты страўнік.

## У НАРЫХТОЎЧЫЯ ПУНКТЫ ЗАРАСТАЕ СЦЕЖКА?

**«Родная прырода»:**

***— У нас вялікія запасы грыбоў, але ў гандлі пераважаюць імпартныя кансерваваныя. Хіба ў нас няма сваіх рэцэптаў?***

**Людміла ПАЎЛОЎСКАЯ:**

— Тэхналогій перапрацоўкі і рэцэптур кансерваў з грыбоў у нас дастаткова! Але для добрай загрузкі высокапрадукцыйных ліній неабходна ад 1 да 5 тон падрыхтаванай сыравіны ў гадзіну, у залежнасці ад рэцэптуры. Мяркую, што яе няма ў такім аб'ёме, тым больш, што працэс падрыхтоўкі і зборy грыбоў даволі працаёмкі. Тут не пусціш камбайн для зборy. Прадпрыемствы самі вырашаюць, калі і ў якім аб'ёме вырабляць тую ці іншую прадукцыю.

Вельмі многія жыхары нашай краіны займаюцца хатняй нарыхтоўкай грыбоў. Хачу яшчэ раз нагадаць, што грыб — складаны прадукт, да яго трэба ставіцца з вялікай асцярогай. Акрамя таго, што неабходна перапрацоўваць толькі ядомыя грыбы, вельмі важна прытрымлівацца рэжыму цеплавой апрацоўкі грыбоў і кансерваў з іх. Вядомы выпадкі, калі пасля ўжывання ў ежу хатніх кансерваваных грыбоў людзі атрымлівалі цяжкія атручванні, а то і лятальны зыход... Пры прамысловай перапрацоўцы кансервы з грыбоў стэрылізуюцца пры тэмпературы звыш 120 градусаў, пры залішнім ціску на працягу разлічанага часу, дома такіх умоў практычна няма. Але ёсць альтэрнатыва — сушыць, замарожваць грыбы або выкарыстоўваць рэцэпт нашых бабуль: звараныя грыбы засаліць і трымаць пад гнётам.

**«Родная прырода»:**

***— Няўжо нарыхтоўшчыкі не могуць загрузіць магутнасці ўмоўнага прадпрыемства па кансерваванні грыбоў?***

**Аксана СКІНДАР:**

— Рэсурс вялікі — збіраюць дрэнна. У гэтым годзе мы закуплялі лісічкі па 7 рублёў за кілаграм, цана белага грыба даходзіла да 10 рублёў. Мяркую, гэта добры кошт, але актыўнасці з боку нарыхтоўшчыкаў сыравіны не было. Нашы людзі ідуць у лес, каб забяспечыць ягадамі і грыбамі сваю сям'ю, магчыма, частка сабранага прадаецца на рынку. Нам трэба прыкладаць намаганні для таго, каб людзі масава здавалі сыравіну ў нашы нарыхтоўчыя пункты. Дарэчы, наша закупачная цана прывабней, чым у Расіі і Украіне. Акрамя «Белкаапсаюза» ў Беларусі яшчэ шэраг арганізацый ажыццяўляе закупку сыравіны ў насельніцтва.

## ШТО БЕЛАРУСУ НЯСМАЧНА, ДЛЯ ФРАНЦУЗА — ДАЛІКАТЭС

**«Родная прырода»:**

***— Вырабіць прадукцыю — палова справы, важна, каб яна дайшла да спажыўца як на ўнутраным, так і на знешнім рынках.***

**Аксана СКІНДАР:**

— Сёння мы закупляем усе грыбы, і вялікая іх частка ідзе на экспарт. Нашы спажыўцы коса глядзяць у бок смаржкоў і страчкоў, а ў Францыі, куды мы экспартуем іх, гэтыя грыбы надта папулярныя. Лісічка — вельмі запатрабаваны грыб у Польшчы, Германіі, краінах Балтыі. Чырвонагаловікі, баравікі, грузды мы рэалізуем больш на ўнутраным рынку. На восеньскіх кірмашах мы прапануем насельніцтву таксама салёна-адварныя грузды. Робім захады, каб зацікавіць людзей нашай прадукцыяй: у гандлёвай сетцы «Родны кут» заўсёды ёсць у продажы замарожаны белы грыб у кантэйнеры. Сёння мы спрабуем дамаўляцца з айчыннымі гандлёвымі сеткамі, але пакуль безвынікова. Але ў Расіі наша прадукцыя добра ідзе, у тым ліку пад гандлёвымі маркамі сетак. Парадокс, але часам расіяне ведаюць наш асартымент лепш, чым мы самі.

## У НАС УСЕ ПРАДУКТЫ ЭКА?

**«Родная прырода»:**

***— Магчыма, айчынную прадукцыю не ўсе ахвотна купляюць, бо ў людзей ёсць радыяцыйная насцярожанасць: не буду есці гомельскі ёгурт...***

**Аксана СКІНДАР:**

— Як вядома, нашы нормы па ўтрыманні радыенуклідаў значна больш жорсткія, чым у ЕС. Ягады з Гомельскай вобласці экспартуюцца ў Еўропу і адпавядаюць яе стандартам.

**«Родная прырода»:**

***— Зараз у насельніцтва мода на эка-прадукты. На нашым рынку яны прысутнічаюць?***

**Аксана СКІНДАР:**

— Эка-прадукты — гэта маркетынгавы ход. У нас усе прадукты высокай якасці — такія стандарты. У Беларусі ёсць асабліва экалагічна чыстыя раёны. Сыравіна з гэтых рэгіёнаў цікавіць нават замежных фармкампаній. У нас яна ідзе толькі на выраб дзіцячага харчавання.

## ЛЕКАВЫЯ РАСЛІНЫ — ТОЛЬКІ З АПТЭКАРСКІХ САДОЎ

**«Родная прырода»:**

***— На тэрыторыі нашай краіны расце шмат відаў лекавых траў. Што можна сказаць пра іх нарыхтоўку?***

**Аксана СКІНДАР:**

— Яшчэ не так даўно можна было закупляць у насельніцтва 68 відаў лекавых траў. Аднак цяпер краіна пайшла па шляху стварэння аптэкарскіх садоў. І вось чаму: патрабаванні да лекавых траў вельмі высокія. Ніхто не можа кантраляваць працэс збору сыравіны, сушкі яе ў хатніх умовах. Ва ўмовах аптэкарскага саду ўсе працэсы можна адсачыць.



**Ала ДЗЕЖАМЕСАВА, кансультант упраўлення арганізацыі вытворчасці і перспектыўнага развіцця Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Беларусі:**

— Айчынныя фармацэўтычныя арганізацыі не могуць набываць лекавую сыравіну ў насельніцтва і выкарыстоўваюць у вытворчасці лекавых сродкаў тую лекавую раслінную сыравіну, якая адказвае запатрабаванням фармакапеі Рэспублікі Беларусь. Нарыхтоўка, апрацоўка, стандартызацыя, захаванне лекавай раслiннай сыравіны павінна ажыццяўляцца падрыхтаваным персаналам па вызначаных нарматыўнымі дакументамі правілах. Павінен праводзіцца рэгулярны аўдыт пастаўшчыка дадзенай сыравіны. Лекавай раслінная сыравіны, вырашчанай у Рэспубліцы Беларусь, дастаткова для нашых прадпрыемстваў, якія вырабляюць вялікую колькасць лекавых сродкаў расліннага паходжання.

**Алена СТЭЛЬМАХ, Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

■ Рэпартаж

# ПРЫГОЖАЯ МЕЛОДЫЯ КАМЯНЁЎ

**Маладзечна мае шмат эпітэтаў — горад сонца, горад фестываляў, культурная сталіца Міншчыны... У хуткім часе да іх можа далучыцца яшчэ адзін, звязаны з наступнай акалічнасцю: нядаўна ў скверы каля Палаца культуры з'явілася ажно сем кампазіцый з прыроднага каменю.**

Сімвалічна, што «рассыпаны» кампазіцыі побач са скульптурай «Дрэва жыцця». Апошняя была ўстаноўлена ў 2012 годзе, калі горад прымаў Х Рэспубліканскі экалагічны форум, і заклікае беражліва і з любоўю ставіцца да прыроды. Да ўсяго, што знаходзіцца вакол нас, побач з намі, у нас саміх. Нават да камянёў, якія ва ўмелых руках майстра маюць уласцівасць... ажываць.

— У горадзе, які сёлета названы культурнай сталіцай Беларусі, праводзіцца мноства самых разнастайных мерапрыемстваў. Пленэр — адно з іх. Гэтыя валуны спрадвеку ляжалі ў маладзечанскай зямлі, чакалі свайго часу, — выказаўся **старшыня райвыканкама Аляксандр ЯХНАВЕЦ** пры адкрыцці парку каменных скульптур. — Мы прапанавалі вам, мастакам, матэрыял, стварылі ўсе ўмовы для работы, а вы сваім талентам ажывілі нежывое, ператварылі ў шэдэўры. І жыхары горада, і госці будуць любавацца плёнам вашых рук. Дзякуй вялікі за работу!

Кіраўніка раёна падтрымаў скульптар, народны мастак Беларусі Іван Місько. Іван Якімавіч быў ініцыятарам творчага мерапрыемства, не адзін год марыў аб ім, садзейнічаў яго правядзенню.

— Я проста не мог не прыехаць у Маладзечна, прапусціць такую падзею. Выдатныя творы застануцца на доўгія гады, нададуць гораду своеасаблівую аўру. Мару аб тым, каб падобныя пленэры сталі традыцыйнымі, а таксама набылі міжнародны размах.

Цэлы месяц скульптары працавалі на тэрыторыі зелянгаса: тут стаяў характэрны гул піл і звон шліфавальных машынак. Гараджане, задоўга да гэтага папярэджаныя аб мерапрыемстве, прэтэнзій не выказвалі, хутчэй чакалі той момант, калі надыдзе час «збіраць камяні» і аўтары вынесуць свае работы на грамадскае абмеркаванне.



Фота Аляксея ПЛАТКО.

**Расійскі скульптар, аўтар кампазіцыі «Валынка» Юрый КАНДРАШОЎ (у цэнтры з дудой) разам з маладзечанскім музыкам Сяргеем ЯРУКОМ і ўдзельніцамі вакальнага гурту «Асалода» Раеўшчынскага Дома культуры.**

Асаблівая роля ў правядзенні творчага спаборніцтва «на адкрытым паветры» належала гарадскому Палацу культуры і музычнаму каледжу імя Міхала Клеафаса Агінскага. Дарэчы, гэтыя ўстановы ўзначальваюць Святлана і Рыгор Сарокі — вядомыя ў беларускім мастацтве людзі, творчыя асобы і няўрымслівыя прапагандысты нацыянальнай культуры.

Можа таму, што ўсе працавалі на адзін вынік, ставілі перад сабой высакародную мэту, у работах прасочвалася музычная тэма. Так, сталічны скульптар Вадзім Мацкевіч, аўтар знакамітай і любімай бронзавай «Пасажыркі», якая стала сімвалам маладзечанскага чыгуначнага вакзала, на гэты раз прапанаваў скульптуру «Фрагмент» — вытанчаныя лініі скрыпкі нібы вырываюцца з каменю на паверхню. Падаецца: дакранісся смычком да струн — і загучыць інструмент, пальюцца незвычайныя гукі, што нарадзіліся ў сівых вяках.

«Гаму» Сяргея Ермаловіча дапаўняе «Антычная рэпліка» Аляксандра Шомава. Валянцін Борзды, які нарадзіўся і вырас у Маладзечне, а цяпер жыве ў сталіцы, падарыў гораду «Жалейку». Скульптурная кампазіцыя, па словах аўтара, увабрала лепшыя ўспаміны пра горад дзяцінства. «Калі пойдзе дождж, — запэўніў аўтар, — яна ператворыцца ў арыгінальны фантан, вада загучыць».

На першы погляд падалося, што асабліва пашанцавала скульптару Спартаку Аруцюняну: яму для работы дастаўся вельмі арыгінальны камень. Сама прырода апрацавала яго, асобныя грані ўтвараюць профіль чалавечага твару. Аўтар надаў валуну канкрэтную тэматыку — і вось ужо «Невядомы партрэт» называюць партрэтам славутага кампазітара, дыпламата і грамадскага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага.

Кульмінацыяй адкрыцця парку каменных скульптур стала прэзентацыя, можна сказаць, грандыёзнага помніка валынцы. Над ім працаваў маскоўскі скульптар Юрый Кандрашоў. Маладзечанскі дудар Сяргей Ярук, які суправаджаў усё мерапрыемства ігрой на гэтым інструменце, з захапленнем адрэагаваў на падзею: «Наколькі ведаю, больш нідзе ў Беларусі няма помніка валынцы. Мы будзем першымі».

**Аляксандр ЛАЗОЎСКІ**

# Усё, што вы хацелі ведаць пра тое...

## Як працуе гідралагічны ПАСТавы

**Сёння кожны школьнік ведае, што гідралагічны пост — гэта сукупнасць рознага абсталявання і прыбораў, прызначаных для гідралагічных вымярэнняў і назіранняў на рэках, азёрах, морах, каналах, а таксама месца, дзе размешчаны гэтыя прылады. Тым не менш самі прыборы і прынцыпы іх дзеяння застаюцца невядомымі для большасці людзей. Але ж жывая цікавасць да вывучэння рэк і азёр шчырая — у нашай краіне цякуць Заходняя Дзвіна, Нёман, Днепр, Бярэзіна, Сож і Прыпяць, якія здаўна служылі шляхамі эканамічных і культурных сувязяў з іншымі дзяржавамі.**

**Аб тым, як у нашай краіне сочаць за «пульсам» рэк, расказваюць спецыялісты аддзела гідралогіі і дзяржаўнага воднага кадастру Гідрамета.**



### Трохі гісторыі

Патрэба ў вывучэнні гідралагічнага рэжыму вадацёкаў Беларусі стала адчувацца ўжо ў пачатку XVIII стагоддзя. У гэты ж час пачалі арганізоўваць сетку вадамерных пастоў, а ўжо да канца стагоддзя наспела неабходнасць у стварэнні цэнтральнай установы, якая б несла адказнасць за водныя шляхі зносін. Першай такой установай быў Дэпартамент водных камунікацый, створаны ў 1798 годзе. У 1865 годзе Дэпартамент быў пераўтвораны ў Міністэрства шляхоў зносін.

У пачатку XIX стагоддзя з развіццём суднаходства на ўнутраных водных шляхах узрасла цікавасць да вывучэння вагання ўзроўню вады ў рэках. У 1818 годзе кіраўніцтва воднымі і сухапутнымі шляхамі зносін выдала загад аб абавязковых штодзённых вымярэннях узроўняў вады ва ўсіх водных сістэмах.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны гідралагічная сетка Беларусі складалася з 63 пунктаў назіранняў, але ўжо да пачатку 1916 года з-за абставін ваеннага часу пачалося скарачэнне сеткі стацыянарных гідралагічных пастоў.

У гады імперыялістычнай, а потым грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі гідралагічная сетка на тэрыторыі нашай краіны ў большасці сваёй была разбурана. У мірны час яна паступова аднаўлялася, і ў 1927 годзе на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 174 станцыі і пасты, якія належалі пяці ведамасным службам. Узнікла неабходнасць аб'яднання метэаралагічнай і гідралагічнай сеткі ў адзін дзяржаўны гідраметэаралагічны орган.

Са стварэннем рэспубліканскіх дзяржаўных органаў гідраметслужбы ўся гідралагічная сетка БССР была аб'яднана і складалася да 1930 года з 262 станцый і пастоў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Гідраметслужба Беларусі страціла звыш 85% станцый, 90% пастоў была разбурана.

Сёння на тэрыторыі краіны дзейнічаюць 99 пастоў на рэках і 10 на азёрах і вадасховішчах, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

### Захавальнікі рачной «біяграфіі»

Назіральная сетка гідралагічных пастоў складаецца з пунктаў назірання, якія працуюць пастаянна (рэперныя пасты) або доўгі час (перыядычныя пасты). Рэперныя, або векавыя пасты, прызначаны для вывучэння шматгадовых і векавых ваганняў і змяненняў гідралагічнага рэжыму рэк і вадаёмаў пад уплывам кліматычных і антрапагенных фактараў. Яны могуць быць зачыненыя толькі ў выключных выпадках. Перыядычныя пасты маюць абмежаваны тэрмін дзеяння і забяспечваюць дэталізацыю гідралагічных характарыстык па тэрыторыі. Яны могуць быць круглагадовымі і сезоннымі.

Галоўныя задачы маніторынгу колькасці паверхневых вод — арганізацыя назіранняў, збор і атрыманне інфармацыі аб наяўнасці і рэсурсах паверхневых вод, іх размеркаванні і зменлівасці ў часе, а таксама выпуск кадастравых дакументаў, якія змяшчаюць прааналізаваныя і апрацаваныя вынікі гідралагічных назіранняў.

Дзякуючы пастаяннай працы спецыялісты атрымліваюць шэраг аднародных дадзеных гідралагічных назіранняў на працягу доўгага часу. Выконваюцца вымярэнні вышыні ўзроўню, тэмпературы вады, візуальныя назіранні за сілай ветру і хваляваннем. Адзін раз у зімовы сезон назіральнік робіць вымярэнні таўшчыні лёду і вышыні снегу на лёдзе. З пэўнай перыядычнасцю праводзяцца і вымярэнні расходаў вады, завіслых наносаў, ухілаў воднай паверхні.




У перыяд разводдзя, падчас дажджавых паводак, якія маюць выгляд хваляў рознай працягласці і вышыні, што ідуць адна за адной, у перыяд межані падчас адзіночных дажджавых паводак, калі шарош і лёд ідуць па рацэ і лёд інтэнсіўна растае, назіральнікі праводзяць паміж названымі стандартнымі прамежкамі часу дадатковыя назіранні за ўзроўнем вады.

### Як вымераць раку

Прылады для вымярэння ўзроўню вады бываюць наступных тыпаў: рэечныя, палевыя, рэечна-палевыя, перадатковыя, аўтаматычныя, дыстанцыйныя. Выбар таго ці іншага тыпу прыстасавання вызначаюць па велічыні гадавой амплітуды вагання ўзроўню вады, асаблівасцях берага ракі, наяўнасці мастоў і гідратэхнічных збудаванняў, а таксама патрабаваннямі да дакладнасці вынікаў назіранняў.

Так, палевыя прылады для вымярэння ўзроўню вады найбольш зручна выкарыстоўваць для раўнінных рэк са значнай амплітудай вагання ўзроўняў. Вызначыць узровень вады тут дапамагае пераносная рэйка, якую назіральнік усталёўвае вертыкальна на галоўку металічнай палі. Такім чынам і вызначаецца вышыня ўзроўню.

Гэты паказчык вымяраюць таксама з дапамогай перадатковых прыладаў з бесперапыннай рэгістрацыяй узроўню вады пры дапамозе самапісца, узроўнямера паплаўковага лічбавага, аўтаматычнага гідралагічнага комплексу або аўтаматычнага гідралагічнага паста.

Назіранні за тэмпературай вады складаюцца з сістэматычных штодзённых вымярэнняў у пастаянным месцы прыбярэжнай зоны або на стрыжні ракі. Для гэтага выкарыстоўваюць водныя тэрмометры ў металічнай аправе і мікратэрмометры.

Колькасная ацэнка паверхневых вод выконваецца паводле расходу вады ў рацэ, г. зн. аб'ёму вады, які праходзіць праз папярочнае сячэнне за адзінку часу. Вымярэнне расходаў вады — найбольш складаны від работ на пасту, што звязана з выкананнем цэлага комплексу вымярэнняў, і асабліва складана гэта рабіць на вялікіх рэках.

Найбольш распаўсюджаны спосаб вымярэння расходу вады заключаецца ў вызначэнні плошчы воднага сячэння шляхам вымярэння глыбінь па гідраствoры і ў вымярэнні ў асобных пунктах воднага сячэння хуткасці плыні з дапамогай гідраметрычнай круцёлкі.

Прамеры глыбінь праводзяць з мэтай вылічэння плошчы воднага сячэння ракі па гідраметрычнаму створу — папярочніку праз раку, у якім вымяраюць глыбіні, а таксама хуткасці плыні вады.

Для вымярэння хуткасці цячэння вады ў большасці выпадкаў ужываюць стандартныя гідраметрычныя круцёлкі і вымяральнік хуткасці патоку. У залежнасці ад колькасці абаротаў круцёлкі спецыялісты і вызначаюць, як хутка рухаецца рака.

Вызначыўшы плошчу воднага сячэння і сярэднюю хуткасці патоку, спецыялісты могуць даведацца аб значэнні іх здабытку і такім чынам вызначыць расход вады.

На асобных пастах выконваюцца вымярэнні расходаў завіслых наносаў, узяцце проб вады на каламутнасць і спроб наносаў і донных адкладаў на механічны аналіз. Гэтыя назіранні дапамагаюць вывучаць дэфармацыю рэчышчаў у залежнасці ад натуральных і антрапагенных фактараў.

Наносы — гэта цвёрдыя часціцы, утвораныя ў выніку эрозіі вадазбораў і рэчышчаў, якія пераносяць вадацёкі. Рачная вада заўсёды змяшчае некаторую колькасць завіслых наносаў, якія складаюцца ў асноўным з часціц грунту. Найбольш насычанай наносамі вада бывае ў рацэ ў перыяды вясновага разводдзя і дажджавых паводак.

На некаторых гідралагічных пастах праводзяцца таксама метэаралагічныя назіранні за ападкамі, атмасфернымі з'явамі, снежным покрывам (вышынёй і шчыльнасцю снегу), за метэаралагічнай бачнасцю, воблачнасцю і ветрам.

Усе вынікі вымярэнняў на гідралагічным пасту назіральнік запісвае ў спецыяльныя кніжкі, якія па заканчэнні месяца ён перадае ў аддзел гідралогіі Аблгідрамета, Міжраённы цэнтр па гідраметэаралогіі або гідралагічную станцыю, якой падпарадкаваны пост. Там ажыццяўляецца кантроль і далейшая апрацоўка звестак, разлікі гідралагічных характарыстык, якія затым змяшчаюцца ў Дзяржаўны водны кадастр.

**Ірына ПАРТАСЁНАК, Людміла ЖУРАВОВІЧ.**

■ Афіцыйна

# Форум экалогіі і энергетыкі

**У Мінску прайшоў XXI Беларускі энергетычны і экалагічны форум, які пачаўся з Міжнароднай спецыялізаванай выставы «Энергетыка. Экалогія. Энергазберажэнне. Электра», адной з самых буйных у краінах СНД і Балтыі. Выстава з 1995 года прымае вядучых беларускіх і сусветных вытворцаў абсталявання, тэхналогій і матэрыялаў для энергетыкі, экалогіі, электратэхнікі.**

У сталіцы Футбольны манеж ператварыўся на некалькі дзён у Мекку апошніх дасягненняў сусветнай энергетыкі. У гэтым годзе свае распрацоўкі і праекты прапанавалі энергетыкі і эколагі з 300 арганізацый 14 краін свету (Аўстрыя, Германія, Данія, Італія, Літва, Польшча, Расія, ЗША, Украіна, Чэхія і інш.).

Эфектыўнае выкарыстанне энергіі ў быце, вытворчасці было і застаецца вельмі актуальным. Урэшце, энергабяспека цэлай дзяржавы залежыць ад эфектыўных тэхналогій, якія прапаноўваюць сёння распрацоўшчыкі. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца і экалагічнасці вырабу ў розных яе праявах: уздзеянне на навакольнае асяроддзе, матэрыял, бяспека вытворчасці.

Адкрылі форум міністр энергетыкі Рэспублікі Беларусь, намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта Уладзімір Патупчык, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Андрэй Каўхута, старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар Назаранка, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр Шумілін, намеснік міністра ЖКГ Генадзь Трубіла, дырэктар ЗАТ «Тэхніка і камунікацыі» Рыгор Бондараў.

— Больш за 20 гадоў форум з'яўляецца ўнікальнай пляцоўкай для вырашэння пытанняў развіцця энергетыкі і экалогіі, павышэння энергаэфектыўнасці, вывучэння сусветнага вопыту, — адзначыў Уладзімір Патупчык. — Мэта форуму — укараненне інавацыйных тэхналогій, умацаванне доўгатэрміновага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва беларускіх і замежных прадпрыемстваў і кампаній, прыцягненне ў краіну інвестыцый. Энергетыка з'яўляецца адной з прыярытэтных галін народнай гаспадаркі краіны, устойлівая праца якой стабілізуе электразабеспячэнне насельніцтва, эканамічнае развіццё краіны. Урад Беларусі праводзіць мэтанакіраваную палітыку па нарошчванні энергетычнага патэнцыялу краіны. У межах рэалізацыі дзвюх дзяржаўных праграм мадэрнізацыі беларускай энергасістэмы ўведзена ў эксплуатацыю каля 2 тысяч мегават высокаэфектыўных генерыруючых магутнасцяў, значна павышана эфектыўнасць яе працы, зніжаны да 40% фізічны знос. У цэлым зніжана залежнасць Рэспублікі Беларусь ад імпартуючых энергарэсурсаў.

Дзякуючы актыўнай дзяржаўнай палітыцы ў сферы газіфікацыі Беларусь сёння займае вядучыя пазіцыі сярод краін СНД па развіцці газазабеспячэння. За апошнія 20 гадоў у краіне пабудавана ў 4 разы больш газаправодаў, чым было да 1994 года. Інвестыцыі ў гэтай галіне складаюць 200 млн долараў штогод. Дынамічна развіваецца тарфяная прамысловасць. Поўнасцю механізаваны працэс здабывання і перапрацоўкі торфу. Прадпрыемствы пераходзяць на мясцовыя віды паліва.

Адным з найважнейшых нацыянальных праектаў з'яўляецца будаўніцтва АЭС (якая атрымала высокія адзнакі МАГАТЭ) і яе далейшая інтэграцыя ў сістэму энергазабеспячэння.

Андрэй Каўхута адзначыў, што высокія тэхналогіі павінны быць бясшкоднымі, працаваць на карысць паляпшэння агульнага экалагічнага стану:

— У сучасным грамадстве трэба, каб энергія была экалагічнай. Нельга дапусціць, каб выкарыстанне прыродных рэсурсаў прыводзіла да забруджвання навакольнага асяроддзя. На выставе прадэманстраваны новыя распрацоўкі ў галіне экалогіі. Неабходна ўкараняць такія тэхнічныя навінкі ў паўсядзённае жыццё, рацыянальна выкарыстоўваць прыродныя рэсурсы. Форум ставіць мэтай і павелічэнне выкарыстання ўзнаўляльных крыніц энергіі. Тым самым мы падтрымліваем умацаванне і далейшае развіццё зялёнай энергетыкі і ў цэлым зялёнай эканомікі.

**Вольга ПРАЛЮК.** *pralyuk@zviazda.by*

■ Грамадская ініцыятыва

# СКАЗАЛІ «ЗРОБІМ!» І ЗРАБІЛІ

**1 кастрычніка ў Беларусі прайшла валанцёрская акцыя па прыбіранні смецця «Зробім!», якая ўжо стала традыцыйнай. Гэтай восенню ў ёй прынялі ўдзел жыхары з 35 вялікіх і малых населеных пунктаў Беларусі (Мінск, Брэст, Мазыр, Баранавічы, Слонім, Ветка, аграгарадок Прылукі, Сеніца і іншыя). Добраўпарадкаванне таксама прайшло каля возера Нарач, на Сарачанскіх азёрах у Астравецкім раёне, у заказніках «Блакітныя азёры» і «Швакшты» ў Віцебскай вобласці.**

## Экаатрад

Акцыю каардынаваў аргкамітэт, у які ўваходзяць «Цэнтр экалагічных рашэнняў», таварыства «Зялёная сетка», фонд «Інтэракцыя», грамадская арганізацыя «Мінскае веласіпеднае таварыства». Апошняя ў гэтым годзе акцыя прайшла пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а таксама Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

У рамках акцыі ў аграгарадок Сеніца прыехалі навесці парадак каля 50 добраахвотнікаў (некаторыя нават з дзецьмі) ад цэнтра экалагічных рашэнняў, Мінпрыроды, ЖКГ, а таксама арганізацый, падпарадкаваных Мінпрыроды.

Вясной гэта месца ўжо прыбіралі, для многіх такая работа была паўторам папярэдняй. Пасля лета ў ваколіцах сабралася шмат смецця, якое пакінулі адпачывальнікі.

Мінулая акцыя «Зробім!» прайшла 9 красавіка гэтага года, у ёй прынялі ўдзел больш за 20 тысяч чалавек з 43 населеных пунктаў. Па папярэдніх падліках валанцёры на акцыі 1 кастрычніка прыбралі з лясоў і зялёных зон у гарадах каля 130 000 літраў смецця. Такім чынам, за год добраахвотнікі «Зробім!» сабралі 690 000 літраў смецця.

Арганізатары настойваюць на тым, што падобныя акцыі трэба праводзіць часцей, чым два разы на год. Для гэтага на карце акцыі «Зробім!» заўсёды можна знайсці месцы, якія патрабуюць навядзення парадку, а ўжо арганізаванае прыбіранне можна адшукаць у адкрытым спісе, які абнаўляецца анлайн.

## Слова міністра

У акцыі ўзяў удзел **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА.** Андрэй Марленавіч не толькі сам збіраў смецце, але і паспеў пакантактаваць з мясцовымі ўладамі — абмеркаваў пытанні навядзення парадку на зямлі.

— Мінпрыроды мае кампетэнцыю кантролю за выкананнем мерапрыемстваў, звязаных з навядзеннем парадку на зямлі. Нашы спецыялісты рэгулярна ўдзельнічаюць у такіх акцыях, а я разам з імі. Сваімі дзеяннямі мы паказваем прыклад грамадзянам.

Міністр нагадаў, што за выкідванне смецця паблізу дамоў і на тэрыторыі лесу, возера існуе адміністрацыйная адказнасць. Тым не менш, узнікаюць складанасці з ідэнтыфікацыяй «смеццевых зламыснікаў»: аштрафаваць кожнага, хто кінуў пластыкавую бутэльку, немагчыма.

У акцыі прымалі ўдзел прадстаўнікі ЖКГ, у чые непасрэдныя абавязкі ўваходзіць і навядзенне парадку, і кантроль за яго выкананнем. Міністр звярнуў іх увагу не толькі на адходы, але і на вялікую колькасць зламаных, аварыйна небяспечных галін на тэрыторыі (наступствы ліпеньскага урагану дагэтуль бачныя). Каб іх ліквідаваць, неабходна цяжкая тэхніка і прафесійныя рабочыя.

**«Зробім!» — частка сусветнага руху «Let`s Do It!», які аб'ядноўвае 113 краін і 16 млн валанцёраў. Яго ўдзельнікі прыбіраюць месцы, дзе ўтварыліся стыхійныя звалкі: зоны адпачынку ў гарадах, лясы, пляжы, берагі вадаёмаў.**

Здавалася б, сёння кожнае дзіця ведае, што смецціць нельга. Рэклама па тэлебачанні гаворыць нам пра тое, як трэба выкідваць шкло, паперу і пластык. Экалагічныя выданні і інтэрнэт-парталы пастаянна паўтараюць аб праблеме адходаў. Вялікую работу праводзяць актывісты экаруху. У чым жа прычына такога глабальнага «свінства» беларусаў на прыродзе? На маю думку, абыходжанне з адходамі — паказчык культуры насельніцтва. А яе ў нашай краіне, нягледзячы на ўсе намаганні, вельмі мала. І акрамя цудоўных беларускіх восеньскіх пейзажаў мы вымушаны любавацца бруднымі піўнымі бутэлькамі і мятымі пакетамі.

**Вольга ПРАЛЮК.** *pralyuk@zviazda.by*



Фота з архіва ЦЭР.

# АКЦЫЯ Ў «СЯРЭБРАНЫМ ЛОЗЕ»

**Чысціня і парадак — адзін з нефармальных брэндаў Беларусі. Падтрымліваюць яго не толькі людзі ў аранжавай уніформе, але і валанцёры. Яны выбіраюць самыя складаныя і запушчаныя ўчасткі. Вось і 1-га кастрычніка 70 валанцёраў прыбіралі смецце ў парку «Сярэбраны лог» у мінскім мікрараёне Серабранка. Хто і як арганізуе працу валанцёраў, колькі яны прыбралі смецця па ўсёй краіне і ці ёсць фундатары ў гэтай добрай справы, расказалі арганізатары акцыі «Зробім!» Надзея Дубоўская, Ганна Дапшэвіч і Хрысціна Чарняўская.**

***— Колькі за гэты час прайшло акцый па прыбіранні смецця?***

**Ганна Дапшэвічуте:**

— Прыкладна каля 700 прыборак прайшло. Але, на жаль, мы не можам сцвярджаць, што ў Беларусі за гэты час з'явілася 700 чыстых месцаў.

Самае галоўнае для нас, што такія акцыі праходзяць, што людзі разумеюць: без іх дапамогі не абысціся.

Валанцёры, актывісты і арганізатары самі знаходзяць забруджаныя месцы, самі набіраюць каманду, самі вызначаюць, калі і ў які час прыбіраць, і самі ж прыбіраюць. Вось у чым увесь сэнс. І калі такое мае месца, значыць, у свядомасці людзей адбыліся пазітыўныя змены.

***— Чаму, на ваш погляд, бывае брудна каля вадаёмаў, у лясах? Не хапае кантэйнераў для смецця або бескультур'е людзей таму віной?***

**Хрысціна Чарняўская:**

— Ёсць некалькі фактараў. Першы — гэта нізкая культура адносін да прыроды і невысокая культура адпачынку людзей. Нам здаецца, што людзі не думаюць аб тым, што некаторыя віды смецця «перажывуць» некалькі пакаленняў.

Другі фактар — недастаткова развітая інфраструктура. Часта каля вадаёмаў або ў іншых месцах адпачынку не хапае скрыняў, куды людзям было б зручна выкінуць смецце, а забіраць яго з сабой мала хто хоча. Заўважу, што акцыя «Зробім!» вельмі добра дапамагла выявіць гэтыя асноўныя праблемы. Дзяржаўныя органы, якія адказваюць за чысціню навакольнага асяроддзя, пачынаюць больш актыўна працаваць у гэтым накірунку, разумеюць, дзе і колькі смеццевых кантэйнераў неабходна ўстанавіць.

***— Раскажыце аб валанцёрах — каардынатарах прыборак, бо на вашым сайце яны прадстаўлены вельмі сціпла — толькі імя.***

**Надзея Дубоўская:**

— Наша вялікая мара, каб у кожнай вобласці і кожным горадзе быў каардынатар акцыі — чалавек, да якога мясцовым валанцёрам было б прасцей звяртацца па пытаннях удзелу ў акцыі. У многіх гарадах такія людзі ўжо ёсць. Аргкамітэт заўсёды імкнецца падтрымліваць каардынатараў у зносінах з дзяржаўнымі органамі і СМІ, дапамагае праматэрыяламі. Калі казаць пра «партрэт» нашых валанцёраў, то гэта вельмі розныя людзі: актыўныя мясцовыя жыхары, прадстаўнікі грамадскіх ініцыятыў або арганізацый. Напрыклад, прыборкі ў Брэсце курыруе Рыгор Цярэнцьеў, член аб'яднання «Час Зямлі», якое круглы год праводзіць шмат экалагічных акцый у сваім горадзе. Акцыю «Зробім!» яны ладзілі разам з Брэсцкім смецецеперапрацоўчым заводам — гэта вельмі добрае супрацоўніцтва, таму што адразу ж вырашаецца пытанне па вывазе і перапрацоўцы сабранага смецця. У Астраўцы гаспадар аграсядзібы «Хутар Камарышкі» Аляксандр Дарашэвіч займаецца з мясцовымі школьнікамі, знаёміць іх з асновамі экалагічнай культуры. У дзень акцыі дзеці ўдзельнічаюць у прыборках, а потым іх чакае забаўляльная праграма: цікавыя лекцыі, стральба з лука, гарбата з салодкімі пачастункамі. У Баранавічах мясцовую моладзь гуртуе Уладзімір Зуеў з аб'яднання «Неруш». Пра ўсіх нашых удзельнікаў можна дакладна сказаць: яны малайцы!

***— Усе ўдзельнікі прыборкі «Сярэбранага логу» былі забяспечаны інвентаром, мусіць, ініцыятыва мае добрых фундатараў?***

**Хрысціна Чарняўская:**

— Аргкамітэт акцыі імкнецца падтрымаць мясцовых арганізатараў і валанцёраў усім неабходным: пакетамі і пальчаткамі, кантактамі ўстаноў, якія потым дапамогуць з вывазам смецця. І калі знайсці неабходныя кантакты і дамовіцца з вывазам смецця, урэшце, не так складана, то набыць тысячы пакетаў і пальчатак раней было дорага. Але ў гэтым годзе нам пашанцавала з партнёрам — пляцоўкай аб'яваў «Куфар». Яны не толькі дапамагаюць з закупкай інвентара, але і ладзяць цікавыя мерапрыемствы для ўдзельнікаў, а таксама праводзяць свае карпаратыўныя прыборкі. Напрыклад, вясной «Куфар» прыбраў берагі ракі Мышка ў мінскім раёне Брылевічы. А на восеньскай прыборцы яны ўзнагародзілі ўсіх удзельнікаў самай масавай прыборкі ў Беларусі спецыяльнымі прызамі. І зноў правялі сваю карпаратыўную прыборку, на гэты раз у лясным масіве каля аўтарынку Малінаўка. У другі раз акцыю падтрымала кампанія «Uber». Вясной нам удалося арганізаваць невялікі прэс-тур для зацікаўленых журналістаў па месцінах, дзе прайшлі масавыя прыборкі. Кіраўнікі «Uber» бясплатна вазілі вашых калег па сталіцы. Яны ж бясплатна дапамагалі дабрацца валанцёрам да месца прыборкі. Таксама сваю дапамогу прапанавала кампанія «Remondis», якой мы вельмі ўдзячны. Дапамагаюць і некаторыя раённыя філіялы «Мінскзеленбуд» — з вывазам смецця пасля прыборак. Але натуральна, што нам хацелася б большай актыўнасці ад бізнесу і профільных устаноў — і мы працуем над гэтым.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ**

■ Толькі ў нас

# «Жамчужыны Беларусі»

**Новы творчы праект часопіса «Родная прырода» сумесна з таварыствам «Белагразздраўніца»**

**«Беларусь — краіна, якая ўмее здзіўляць», — кажуць замежнікі, уражаныя бачаным падчас падарожжаў па нашых знакамітых мясцінах. Многія з іх, акрамя таго, і месцам адпачынку выбіраюць Беларусь. Ёсць у гісторыі айчынных здраўніц нямала выпадкаў, калі задаволеныя замежнікі, ад'язджаючы з санаторыя, зноў браніруюць у ім нумары.**

З года ў год пашыраецца геаграфія адпачывальнікаў, а расіяне, ізраільцяне, немцы ўжо даўно выбіраюць у якасці альтэрнатывы замежным бальнеалагічным курортам беларускія здраўніцы.

Узровень сучасных паслуг у сферы адпачынку набірае абароты, але не толькі аздараўленчая база вабіць да сябе патэнцыяльных адпачывальнікаў. Кожны з беларускіх санаторыяў размешчаны ва ўнікальным прыродным месцы, што і вызначае яго асноўны напрамак медыцынскай спецыялізацыі. Паспяхова практыкуецца таксама кліматалячэнне.

Праект «Жамчужыны Беларусі» дазволіць па-новаму зірнуць на беларускую прыроду і зрабіць больш шырока вядомымі яе непераўзыдзеныя вартасці. У нас ёсць такія рэдкія каштоўнасці, якія здавён цэняцца ва ўсім свеце. Хочацца верыць, што ў будучым яны набудуць гэткую ж вядомасць, як напрыклад, папулярныя Мінеральныя воды Каўказа або слынная ялцінская Мацэста.

У нетрах Беларусі захоўваюцца багацці, здольныя аказваць цудатворнае ўздзеянне на арганізм чалавека. Яны вяртаюць яму страчаныя сілы, нармалізуюць здароўе, узнімаюць жыццёвы тонус. Такую добрую славу лекараў, як вядома, маюць радонавыя воды і сапрапелевыя гразі. Іх магутны тэрапеўтычны эфект дазваляе з высокай эфектыўнасцю лячыць многія захворванні.

Акрамя гэтага, прырода сама становіцца гаючай крыніцай, здольнай вярнуць стомленаму цывілізацыяй чалавеку душэўную раўнавагу. Прагулкі па экалагічных сцяжынках палепшаюць настрой і даюць зарад бадзёрасці. Гэта таксама лепшыя лекі ад стрэсаў і стомленасці.

Пачынаецца праект «Жамчужыны Беларусі» з наведвання санаторыя «Сасновы бор», які знаходзіцца за сорак кіламетраў ад Мінска, пад Радашковічамі, на беразе рэчкі Рыбчанкі.

Чым адметны менавіта гэты санаторый, чытайце ў лістападаўскім нумары часопіса «Родная прырода».

**Алена СТЭЛЬМАХ**


## Чытайце ў кастрычніцкім нумары часопіса «Родная прырода»

✓ **Імпактныя алмазы Лагойска**

✓ **Адны пазіравалі, другія — давалі дзеркача**

✓ **Прыйшоў Фядул — вецер падзьмуў**

✓ **Танганьіка — вада чатырох краін**



■ Радавод

# ХТО ВАШЫ ПРОДКІ?

## Пра генетычную памяць і вяртанне з небыцця

**Не за адзін дзень пішацца гісторыя. Таму і даследуецца яна не хутка. «Гербоўнік беларускай шляхты. Том 4» — работа над гэтай кнігай, выдадзенай нядаўна ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, вялася некалькі гадоў. У выданні змяшчаюцца радаводныя роспісы толькі на адну літару — 4-ю. Таму многія, чыё прозвішча пачынаецца з літары «Г», цяпер маюць надзею больш даведацца пра свой род. Але і для ўсіх іншых гэта кніга можа быць надзвычай цікавай...**

У Гербоўніку распісаны гісторыі родаў — хто чым сынам з'яўляецца, з указаннем звестак пра кожнага чалавека (месца працы, пасады і іншае). Для таго каб карыстацца ёй, ніякіх спецыяльных ведаў не патрэбна.

— Той, хто ўваходзіць у гісторыю, застаецца на вякі, — адзначае **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Уладзімір АДАМУШКА**. — Архіўная галіна пайшла па шляху публікацыі зборнікаў дакументаў, якія сведчаць пра гісторыю Беларусі. Ёсць тыя «чыстыя гісторыкі», якім мы даём такую падпітку нашымі выданнямі — людзям не трэба хадзіць у архіўныя сховы, а можна проста скарыстацца зборнікамі дакументаў... Мяне ніхто не пераканае, што выданне каштоўных запісаў у выглядзе кнігі — гэта архаічны спосаб перадачы інфармацыі ў XXI стагоддзі. Кніга застанецца назаўсёды!

Асновай для напісання зборніка (як і папярэдніх трох тамоў) з'яўляецца толькі адзін фонд — Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу. Таму нельга разлічваць, што жыхар любога кутка Беларусі, чыё прозвішча пачынаецца на «Г», знойдзе тут інфармацыю пра свой род. Аднак некаторым шчасліўчыкам можа сапраўды пашанцаваць. У фондзе захоўваюцца ўнікальныя генеалагічныя табліцы, іншыя каштоўныя дакументы.

Зборнікі на папярэднія літары — «А», «Б» і «В» — выходзілі ў 2002-м, 2007-м, 2014-м гадах адпаведна. Можна адзначыць, што новы зборнік выйшаў усяго праз два гады пасля папярэдняга — відавочна, што праца істотна паскорылася. Таму ўкладальнікі жартуюць: можна разлічваць, што зборнік на літару «Я»... убачаць нашы ўнукі.

— Апошнія 15 гадоў назіраецца вялікая цікавасць да генеалогіі, — адзначае адзін з аўтараў выдання, **кандыдат гістарычных навук Дзмітрый МАЦВЕЙЧЫК**. — Наш архіў займаецца выкананнем генеалагічных запытаў ад грамадзян або ад натарыяльных кантор. Менавіта ў апошні час колькасць гэтых запытаў істотна павялічылася — відаць імкненне людзей разабрацца ва ўласных радаводах. Штогод нам прыходзіць больш за 100 запытаў. У той час як раней было ўсяго 5—10 запытаў на год.

Паслугу па даследаванні асабістага радаводу ў архіве выконваюць за грошы. Аванс — 270 рублёў, поўныя кошты для беларусаў — 800 рублёў, для замежных грамадзян — неабмежаваны.

Распачынаючы даследаванне радаводу, варта пачаць з пошукаў ва ўласных сямейных крыніцах, распытаць сваякоў. Перад тым як звярнуцца да архіўных фондаў, вельмі важна ведаць некаторыя факты — месца нараджэння продка і дату, калі ён з'явіўся на свет, да 1917 года.

— Мы павінны больш глыбока пераасэнсаваць свой гістарычны шлях, зразумець, што зрабілі за 25 гадоў незалежнасці Рэспубліцы Беларусь, што робім цяпер і што павінны зрабіць, — заўважае рэцэнзент Гербоўніка, **кандыдат гістарычных навук Віталь МАКАРЭВІЧ**. — Работа над такім зборнікам — рэальны прыклад укладання ў нашу ідэнтычнасць кампанентаў, якія былі выкінуты па тых ці іншых прычынах на доўгі прамежак часу. Народ аказаўся дэфрагментаваным — выкраслілі цэлы пласт мінулага. Нас лічылі сялянскай нацыяй. Дзякуючы такой працы аўтараў зборніка мы вяртаем з небыцця беларускую шляхту, якой доўгі час не было ў нашай гісторыі.



Генеалагічная табліца роду Гадзебскіх. 22 верасня 1835 г.

Пра тое, чаму менавіта сёння так узрасла цікавасць беларусаў да гісторыі свайго роду, на прэзентацыі зборніка разважаў **галоўны архівіст Нацыянальнага гістарычнага архіва Уладзімір ДЗЯНІСАЎ**:

— У савецкія часы «зазіраць» у свае карані было небяспечна. Такая генетычная памяць захоўвалася ў нас шмат гадоў. Пасля Вялікай Айчыннай вайны, у 1970—80-я гады, гаварыць пра гэта ўжо было можна, але людзі баяліся. Многія знішчылі свае асабістыя архівы, фотаздымкі, дакументы — каб яны выпадкова не трапілі ў «кампетэнтныя органы»... Гэта работа над архіўнымі зборнікамі, якая распачыналася вельмі цяжка — трэба было вынайсці пэўную методыку, — цяпер прывяла да выдатных вынікаў. Варта дадаць, што фонд Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу — сам па сабе ўнікальная з'ява ў гісторыі архівістыкі не толькі нашай краіны, але і сумежных. Такога няма ні ў Польшчы, ні ў Літве, ні ў Расіі. У свой час архівісты гэтага фонду прыйшлі да высновы, што трэба яго ўпарадкаваць — і склалі менавіта персанальныя асабовыя справы,





на кожную літару ад «А» да «Я». У іншых архівах усё расфарміравана па гадах — каб знайсці інфармацыю пра пэўнага чалавека, трэба прагартаць процьму дакументаў. А тут усё было сістэматызавана, добра апрацавана, размешчана пад адмысловымі вокладкамі — дарэчы, нават па іх колерах можна арыентавацца ў статусе шляхціча... Таксама гэты фонд уратавала тое, што ён меў 3-ю катэгорыю: фонды 1-й катэгорыі забіралі на ўдасканальванне... Захаваліся ўнікальныя генеалагічныя табліцы, выкананыя на высокім мастацкім узроўні. Ёсць калекцыя патэнтаў, зробленая на пергаменце. Натуральна, такі матэрыял нельга згубіць. Яго трэба берагчы і шанаваць.

Варта дадаць, што яшчэ адзін аўтар Гербоўніка, архівіст Вадзім Урублеўскі, абсалютна бясплатна праводзіць заняткі па генеалогіі пры праваслаўным прыходзе свяціцеля Мікалая Японскага ў Мінску. Там кожны ахвотны можа навучыцца і скласці ўласны радавод.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

Пантэон Айчыны

*Подавайте же потомкам, что маете з предков.*
**Андрэй РЫМША.**
Эпіграма на герб Льва Сапегі, 1588 г.

# СВЯТАЯ ЕЎФРАСІННЯ ВЯЛІКАЯ

## (?—1167?)

«Якою мовай, братове, належыць уславіць светлую памяць найшчаснейшай нявесты Хрыстовай Еўфрасінні! Была яна дапамогай пакрыўджаным, суцяшэннем смуткуючым, распранутым — адзеннем, хворым — наведаннем ці, проста кажучы, — для ўсіх была ўсім. Еўфрасіння сэрца сваё паіла Божаю мудрасцю. Еўфрасіння — неўвядальны квет райскага саду. Еўфрасіння — арол, што, лунаючы ў небе, праляцеў ад захаду і да ўсходу, як прамень сонечны, прасвятліў зямлю Полацкую». Нават калі пра жыццё Еўфрасінні Полацкай не захавалася б ніякіх звестак, гэты ўзнёслы гімн невядомага аўтара яе жыццяпісу праславіў бы яе на стагоддзі. І сапраўды, адметная тая зямля, якая ўзгадавала гэтую вялікую жанчыну, прасветленую Божай любоўю да людзей. Якая стала для беларусаў іх нябеснай апякункай.

Еўфрасіння была дачкой малодшага сына князя Усяслава Брачыславіча, Святаслава — Георгія і да пострыгу насіла імя Прадслава. Здавалася, яе чакае звычайны жаночы лёс — шлюб, сям'я, дзеці, унукі. Славілася яна сваёй прыгажосцю, і многа князёў слалі да яе бацькі сватоў. І калі споўнілася Прадславе дванаццаць гадоў, бацька задумаў выдаць яе замуж. Але іншы шлях выбрала сабе Прадслава. Палюбіла яна кніжную навуку, а яе светлая душа цягнулася да Божага святла. Сваім сэрцам зразумела юная князёўна ўсю марнасць людской мітусні,



гэтую пагоню за багаццем і сытасцю, гэтую прагу людской славы — пыл і попел. У памяці людзей застаюцца добрыя справы, а праз дабро людзям, праз любоў да іх можна выратаваць Божы дар — душу. І душой спасцігла яна тую мудрасць, што, бывае, і самым мудрым не спасцігнуць — мудрасць Божага запавету. І стала яна пакліканай служыць Богу. Прадслава прыняла манаскі сан і пры пострыгу атрымала імя Еўфрасіння. Як у роспачы рваў валасы яе бацька, як плакаў, як смуткаваў! Лічыў, што гора — дачка пайшла ў манастыр. Толькі не ён суцешыў яе, а яна яго. Ці зразумеў князь душэўны парыў дачкі? Не згубіў ён дачку, а прыдбаў заступніцу перад Богам і за сваю сям'ю, і за свой родны Полацк, і за ўсіх людзей.

Шчырыя малітвы ўзносіла да нябеснага Айца верніца. І шчырасць яе душы асвятляла цемру таго жорсткага часу. Кветка райскага саду была падаравана Богам Беларусі — імя яе Еўфрасіння. І каб толькі малітвы... Да яе ішлі па суцяшэнне, па дабрыню, па міласць. Яна лячыла і цялесныя, і духоўныя язвы і раны. Хрысціянская цнота праяўлялася таксама і ў іншым — Еўфрасіння жадала будаваць храм. Хай гэты храм і не будзе мець сцен і бажніц, абразоў, купалоў, але ён будзе мець слова тое, слова, якое ёсць у Бога, і гэта слова пабудуе храм у сэрцах і душах людзей. Еўфрасіння пераходзіць у сабор Святой Сафіі і там перапісвае кнігі. З дня ў дзень — руплівая праца, кожнае напісанае ёй слова, як зерне, кінутае аратаем ва ўраджайную глебу. Кожнае слова несла людзям асвету, кожнае слова раскрывала ім вочы. Прыбытак, які атрымлівала Еўфрасіння ад продажу кніг, яна раздавала тым, хто папросіць міласціну. Вось чаго працы для людзей, вось яна — вышыня духоўнага жыцця.

І храм — бялюткі, нібы свечка, з яркімі фрэскамі святых, белакаменны — пабудаваны Еўфрасінняй. Па яе просьбе дойлід Іван узвёў царкву, якой яшчэ не было ні ў Полацкай зямлі, ні ва ўсёй Русі. І радаваліся палачане, радавалася да слёз Еўфрасіння і ў першай малітве ў сваім храме прасіла Бога, каб абараніў ён людзей...

Яшчэ адзін храм пабудавала Еўфрасіння і заснавала два жаночыя манастыры. Прыходзілі да яе тыя, каго паклікаў да сябе Бог.

Святасць несла Еўфрасіння роднай зямлі, аздабляла яе святынямі. Па яе просьбе візантыйскі імператар Мануіл і патрыярх Лука прыслалі ў Полацк абраз Эфескай Божай Маці, пісаны, паводле падання, евангелістам Лукой. Яна ж заказала майстру Лазару Богшу зрабіць крыж, у якім знаходзіліся хрысціянскія рэліквіі: кроплі крыві Ісуса Хрыста, кавалак Крыжа Гасподняга, камяні ад дамавіны Багародзіцы, часткі мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона, а таксама кроплі крыві святога Дзмітрыя. І, зразумела, не мастацкія вартасці, не каштоўнасці, а гэтыя рэліквіі зрабілі крыж адной з галоўных святынь Беларусі, сімвалам яе духоўнасці і хрысціянскай чысціні. Не раскажаш пра ўсе справы Еўфрасінні. Хоць адна справа была ў яе — несці людзям хрысціянскую любоў. І нават князям, якія рваліся біцца паміж сабой, імем Бога забараняла яна брацца за зброю, яднала іх у любові і згодзе. Міратворца! Духоўны ўладар Полацкай зямлі.

Напрыканцы жыцця Еўфрасіння адправілася ў паломніцтва да Святой зямлі пакланіцца Гробу Гасподняму. Слава пра полацкую асветніцу сягнула далёка. Па дарозе яе сустракалі з радасцю і пашанай. Сам візантыйскі імператар вітаў яе. У Іерусаліме Еўфрасіння ўцешылася душой — пакланілася Гробу Гасподняму. Сваю місію на зямлі яна выканала і папрасіла Бога прыняць яе дух і перасяліць у нябесны Іерусалім. Гасподзь пачуў яе малітву і прыслаў да яе анёла, які і мовіў: «Шчасная ты сярод жанчын і шчасная праца твая! Вось ужо расчынілася райская брама і сабраліся анёлы, трымаючы свечкі і чакаючы сустрэчы з табой».



**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Персона

# «ГЭТА ЎНІКАЛЬНА НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ БЕЛАРУСІ»

## Пятро Лысенка — пра сакрэты ўдалых знаходак

**Гэты чалавек — жывая легенда. Доктар гістарычных навук, прафесар Пятро ЛЫСЕНКА спрычыніўся да адкрыцця ўнікальнага археалагічнага гарадзішча ў Бярэсці. Ён даследаваў старажытныя Тураў, Давыд-Гарадок, Слуцк, Пінск, Клецк. Дзякуючы яго намаганням у Бярэсці і Тураве адкрыты археалагічныя павільёны-музеі — тыя месцы, дзе таямніцы, што паўсталі з зямлі, можа свабодна ўбачыць наведвальнік. Нядаўна Пятро Фёдаравіч адзначыў 85-гадовы юбілей. Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з ім не толькі, каб павіншаваць, але і распытаць пра знаходкі, што ў свой час сталі сапраўднымі сенсацыямі.**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Кажуць, што старадаўняе Бярэсце, знойдзенае пры вашым удзеле, — сапраўдная Троя для Беларусі...***

— Спыніцеся. Не для Беларусі. А для ўсяго сусвету! Больш такога няма нідзе. У Старажытнай Русі, згодна з летапісамі, было 414 гарадоў. Прыблізна 95% з іх археолагі ўжо даследавалі. Аднак такой захаванасці драўляных пабудоў больш нідзе не выяўлена. Гэта ўнікальна не толькі для Беларусі. Але і для Польшчы, Германіі, Швецыі — тых краін, дзе падчас археалагічных раскопак даследавалася дрэва. Наш выпадак — адзіны ў свеце.

***— Дзякуючы чаму дрэва так добра захавалася? Гэта ўдача ці пэўная заканамернасць?***

— Мы даследавалі парэшткі 224 дамоў XI — XIV стагоддзяў. Таму, што яны ацалелі, ёсць пэўнае тлумачэнне. Горад стаяў на заходняй мяжы старажытнарускіх княстваў з Польскім каралеўствам. Польскія феадалы былі ахвотнікамі наязджаць на старажытнарускія гарады, рабаваць, нешта захопліваць з сабой. Асноўным багаццем тагачаснага насельніцтва была свойская жывёла. Яе, вядома, трымалі ў наваколлі горада. Але з-за наездаў польскіх феадалаў-рабаўнікоў нанач скаціну заганялі ўнутр гарадскіх умацаванняў. Пасля яе, вядома, заставаўся гной. Санітарнай ачысткі гарадоў у той час не існавала. Увесь бруд быў на тэрыторыі старажытнага горада. Утвараліся цэлыя слаі гною. Яны не прапускалі атмасферны кісларод, які акурат і з'яўляецца віноўнікам разлажэння драўніны. Дрэва, ізаляванае ад паветра, захоўвацца значна лепш. Так атрымалася, што слой гною, пачынаючы з XIII стагоддзя, дасягнуў вялікіх памераў — дзесьці 2 — 2,5 метра. Ён нарастаў усё больш, паглынаючы спачатку ніжнія вянкі драўніны, затым сярэднія, а ў некаторых выпадках даходзіў і да верху жылых пабудоў. Такі працэс і стаў прычынай захаванасці. Драўляныя пабудовы выкарыстоўваліся для жыцця толькі 30—50 гадоў. За гэты час збіраўся слой, які паглынаў іх поўнасцю. Калі дамы немагчыма было выкарыстоўваць, паверх іх будавалі новыя. У культурным пласце Бярэсця (дарэчы, правільна казаць менавіта Бярэсце — такая форма ўжываецца ў летапісах) налічваецца 12—13 такіх драўляных ярусаў.

***— Нідзе ў свеце такога няма?..***

— Давайце прыгадаем старажытны Ноўгарад Вялікі. Там даследаванні вядуцца ўжо амаль восем дзесяцігоддзяў. Раскапана 2000 пабудоў. Аднак асноўная іх колькасць захавалася толькі на адзін ніжні вянок. Радзей на два; а на тры — выключны выпадак. Рэшткі пабудоў на два-тры вянкі выяўлены пры раскопках старажытных Менска, Полацка, Віцебска, Слуцка, Турава, Пінска. Аднак такога, як у старажытным Бярэсці, няма нідзе. Такіх выпадкаў не сустрэнеш у свеце, бо ў Паўднёвай Еўропе будаўніцтва вялося з каменю. Таму гэта гарадзішча сапраўды ўнікальнае.

**Археалогія — гэта не проста пошук рэдкіх або цікавых знаходак. У ёй трэба метадычна і з максімальнай выніковасцю праводзіць маштабныя даследаванні... Капаць трэба не для таго, каб у шафу схаваць або каб мышы паелі тваю працу і справаздачу.**

***— У Бярэсці вы зрабілі яшчэ адну сенсацыйную знаходку. Гэта жаночы грабеньчык з накрэсленым на ім алфавітам...***

— Асаблівасць напісання літар можна датаваць прыблізна XII стагоддзем. Аднак грабеньчык быў не толькі прыладай для расчэсвання валасоў — ён меў значэнне і падручніка! Гэта буквар старажытнарускага кірылічнага алфавіта. Таму ён захоўваўся больш ашчадна і, пэўна ж, перадаваўся ад аднаго пакалення да іншага.

***— Алфавіт, накрэслены на жаночай прыладзе XII стагоддзя, — гэта з'ява яскрава сведчыць пра традыцыі нашай нацыі. Мажліва, мы насамрэч былі больш дасведчаныя, чым прывыклі думаць пра сябе?***

— Гэты грабеньчык мае вельмі вялікае значэнне. Па-першае, алфавіт на ім напісаны кірыліцай, што сведчыць пра праваслаўныя традыцыі тагачаснага насельніцтва. Па-другое, тагачасныя жыхары вывучалі граматыку, пісьменнасць распаўсюджвалася нават сярод ніжэйшых праслоек мясцовага грамадства.

***— Можна быць упэўненымі, што грабеньчык належаў менавіта прасталюдзінцы, а не князёўне, з-за таго, што знойдзены ён у драўляных пабудовах?***

— Так, князёўна, верагодна, карысталася больш далікатнымі рэчамі і жыла ў больш шыкоўных умовах. А княскіх харомаў пры нашых раскопках не выяўлена. Ён знойдзены акурат у тых кварталах, дзе жыло звычайнае гарадское насельніцтва.

***— У Бярэсці мы можам убачыць цудоўны старажытны археалагічны павільён. Аднак і мемарыял Брэсцкай крэпасці, што размяшчаецца побач, збудаваны на месцы старажытнага горада. Ёсць прыхільнікі таго, каб гэта частка была таксама музеефікавана — як помнік археалогіі. Як вы ставіцеся да такой думкі?***

— Старажытныя гарады заўсёды складаліся з трох частак: дзядзінец (або крэмль), да яго прымыкаў так званы навакольны горад, а за яго межамі — гарадскі пасад. Дзядзінец акурат даследаваны і музеефікаваны (драўляныя дамы. — **Аўт.**). А цытадэль Брэсцкай крэпасці знаходзіцца на месцы навакольнага горада — мы даследавалі яго і асаблівых каштоўнасцяў там не знайшлі. Таму няма патрэбы і абгрунтаванняў яго музеефікацыі.

***— Вы актыўна даследавалі таксама і старажытны Тураў. Раскажыце, чым ён цікавы?***

— Тураў, як і Полацк, быў сталіцай асобнага княства: адно ўплывала на паўднёвыя, другое — на паўночныя землі. Тураўскае княства займала ў Старажытнай Русі даволі значнае месца. Напрыклад, у XI стагоддзі існавала вялікае Кіеўскае княства, што аб'ядноўвала ўсе ўсходнеславянскія княствы. Кіеўскі князь меў спадчыннае права, якое ішло ад продкаў. За стагоддзе там змянілася шэсць князёў, з іх тры — былі тураўскія. Відавочны вялікі ўплыў гэтай зямлі. Пры падзелах Тураўскае княства давалася аднаму са старэйшых сыноў — гэта таксама пацвярджае, што яно было адным з найбольш важкіх старажытных княстваў. Варта прыгадаць, што менавіта там знойдзена першая беларуская кніга — Тураўскае Евангелле. Гэтаксама і наш першы пісьменнік — Кірыла Тураўскі — з гэтай зямлі.

***— Ёсць меркаванне, што яскравых сведчанняў пра слаўнае мінулае Турава захавалася мала. Навука археалогія проста не паспела даследаваць: многае было схавана пад новабудоўлямі і асфальтам. Ці пагодзіцеся?***

— Справа ў тым, што дзядзінец у Тураве невялікі, і ў ім няма напластаванняў, якія перашкаджалі б пранікненню кіслароду. Таму драўляныя пабудовы — у дрэнным стане. Аднак там знойдзены іншыя цікавыя рэчы. Гэта пячатка кіеўскага мітрапаліта Кірылы І, кадзіла XII стагоддзя з медальёнам з выявай святога Феадора і іншыя.

***— Што можна ўбачыць у археалагічным павільёне ў Тураве?***

— Рабаўнікі ўжо ўкралі з музейнай экспазіцыі старажытнага Бярэсця крыж XI стагоддзя. Таму ў павільёне Турава таксама вельмі небяспечна пакідаць аўтэнтычныя рэчы. Гэта шкляное памяшканне, у якім няма пастаяннага дзяжурства. Злодзеі пранікаюць нават у заходнееўрапейскія музеі, якія добра ахоўваюцца. У 1995 годзе злачынцы ўжо абрабавалі тураўскі музей. Таму каштоўныя рэчы туды перадаваць проста нельга. Трэба рабіць муляжы і выстаўляць іх. На жаль, з супрацоўнікамі тураўскага музея я цяпер кантактую нашмат менш, чым гэта было б магчымым і карысным.

***— Раскажыце пра той крыж, што вельмі нагадвае крыж Еўфрасінні Полацкай.***

— Пры раскопках 1962 года ў руках хлопцаў і дзяўчат, што ўдзельнічалі ў пошуках, нечакана апынуліся свінцовыя выявы — спачатку адна, потым другая, трэцяя, чацвёртая. Яны былі знойдзены ў пласце XIII стагоддзя, размяшчаліся побач. Гэта дало падставы думаць, што іх выраблялі для адной рэчы. На гэтых выявах бачныя твары святых. Напрыклад Маці Божая, у якой рукі працягнуты ўлева. Так звычайна робіцца толькі ў адным выпадку — калі з левага боку выяўляецца Ісус Хрыстос. З другога — павінен быць Іаан Хрысціцель і іншыя святыя. Мы параіліся са святарамі, і яны сказалі, што такія выявы маглі быць на крыжы, на якім размешчаны Збаўца. Таму паспрабавалі зрабіць такую рэканструкцыю — за ўзор узялі вядомы крыж Еўфрасінні Полацкай. Вырабілі такую ж аснову, а на яе змясцілі выявы святых. Гэта спроба рэканструкцыі. Калі хтосьці жадае, можа яе аспрэчыць. Але пакуль ахвотнікаў не знайшлося.

***— Кажуць, што, перад тым як пачаць раскопкі старажытнага Бярэсця, вы тры дні сядзелі і проста глядзелі — разважалі, дзе, па логіцы, магло размяшчацца гарадзішча...***

— Так, гэта праўда. Бо ад выбару залежыць вынік. Можаш пачынаць або на пустым месцы, або выбірай тое, якое найбольш верагоднае. Каб дабіцца выніку, варта пасядзець і падумаць. Прынамсі, мне гэта дапамагло. Каб у Бярэсці мы зрушыліся на 10 метраў, натрапілі б на перакапаную будаўнікамі зямлю.

***— Ці перадалі некаму свае веды, тэхналогію пошуку?***

— Некалькі дзён таму мне тэлефанаваў адзін з маіх былых аспірантаў — Леанід Калядзінскі, які працуе на раскопках у Слуцку. Ён сказаў: тое, што ён цяпер робіць, было б немагчымым, каб не школа, якую ён прайшоў у Бярэсці. Мы працавалі з самага ранку, а ўвечары, адпусціўшы практыкантаў, заставаліся і апісвалі тое, што адшукалі. Працавалі да цёмнай ночы, пакуль можна было бачыць аловак. На сённяшні дзень Калядзінскі самы моцны і падрыхтаваны навуковец для работы з найбольш складанымі аб'ектамі археалогіі. Яшчэ адзін дасведчаны чалавек, які вучыўся ўжо ў Калядзінскага, а цяпер працуе ў Віцебскім універсітэце, — Таццяна Бубенька.

**Рабаўнікі ўжо ўкралі з музейнай экспазіцыі старажытнага Бярэсця крыж XI стагоддзя. Таму ў павільёне Турава таксама вельмі небяспечна пакідаць аўтэнтычныя рэчы.**

***— Якія парады вы далі б маладым археолагам і гісторыкам?***

— У першую чаргу быць больш адказнымі, больш патрабавальнымі і больш падрыхтаванымі тэарэтычна. Археалогія — гэта не проста пошук рэдкіх або цікавых знаходак. У ёй трэба метадычна і з максімальнай выніковасцю праводзіць маштабныя даследаванні...

***— Вас часам называюць «асветнікам». Вы той чалавек, што любіць дзяліцца сваімі ведамі пра Беларусь. Але многія археолагі прытрымліваюцца іншай пазіцыі. Маўляў, няхай каштоўная рэч паляжыць, а калі журналісты пра яе даведаюцца, могуць напісаць. Чаму лічыце важным адразу расказваць пра знойдзенае?***

— Гэта абавязкова! Капаць трэба не для таго, каб у шафу схаваць або каб мышы паелі тваю працу і справаздачу. Мы працуем для людзей. Усяму, што знайшлі, трэба даць навуковую інтэрпрэтацыю, каб інфармацыя дайшла да грамадскасці і ўсе зразумелі, што шукалі археолагі і для чаго яны гэта рабілі. Таму мы пішам не толькі навуковыя манаграфіі, але і папулярныя кнігі. Так, мая праца пра старажытнае Бярэсце перавыдавалася некалькі разоў, хутка распрадалася. Яна запатрабаваная і зараз, але я не маю падтрымкі ў тым, каб зноў перавыдаць яе і каб людзі даведаліся пра тое, у чым зацікаўлены...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

# ТАНЦЫ З БАРАЛЕМ



## Калі скончыцца нафтавая «ліхаманка»?

**Нафта маркі Brent на мінулым тыдні перавысіла адзнаку $53 за бараль — найвышэйшы паказчык сёлета. Такім чынам каціроўкі на стратэгічную сыравіну адрэагавалі на заяву прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна падчас Сусветнага энергетычнага кангрэсу ў Стамбуле аб тым, што краіна — найбуйнейшы вытворца «чорнага золата» на планеце — гатовая падтрымаць пагадненне АПЕК па абмежаванні здабычы. Раней міністр энергетыкі Саудаўскай Аравіі (дзяржавы, што таксама адносіцца да ліку топавых гульцоў на рынку) Халід аль-Фаліх выказаў меркаванне наконт таго, што нас чакае рост расцэнак на нафту да ўзроўню $60 за бараль ужо да канца гэтага года. Калі ж улічваць тое, што ў пачатку 2016-га кошт нафты маркі Brent апускаўся да $27,72, то «арэлі» атрымліваюцца насамрэч заліхвацкія. Што будзе надалей з сусветным фінансавым «паплаўком»?**

### Празмерная прапанова

Як вядома, дзяржавы АПЕК (Арганізацыя краін — экспарцёраў нафты, куды ўваходзяць 13 краін Блізкага Усходу, Афрыкі, Азіі і Паўднёвай Амерыкі) на працягу ўжо некалькіх гадоў спрабуюць знізіць квоты на здабычу «чорнага золата» для падтрымання цэн, але дамовіцца пакуль не могуць. Адсутнасць адзінай пазіцыі ў картэлі спрыяла абвальванню цэн на нафту. Рашэнне па зніжэнні здабычы не ўдавалася прыняць з-за Ірана, які толькі вяртаецца на экспартныя рынкі пасля адмены санкцый. Апошняя сустрэча дзяржаў-членаў АПЕК прайшла 2 чэрвеня ў Вене. Тады не была ўсталявана квота на здабычу, але прынята рашэнне не павялічваць вытворчасць нафты. На чарговым пасяджэнні, якое павінна адбыцца ў канцы лістапада, гістарычнае пагадненне нарэшце можа быць дасягнута.

28 верасня на нефармальнай сустрэчы ў Алжыры АПЕК узгадніла абмежаванне здабычы ў дыяпазоне 32,5—33 млн бараляў нафты ў суткі, што спарадзіла хвалю спекуляцый на таварных біржах. На мінулым тыдні ў Стамбуле пра намер Расіі ўдзельнічаць у пагадненні паведаміў Уладзімір Пуцін. Ён заявіў, што РФ гатова далучыцца да сумесных мер па абмежаванні здабычы і заклікае да гэтага іншых экспарцёраў нафты. Ён таксама выказаў надзею, што на пасяджэнні АПЕК у лістападзе «гэтая ідэя ўвасобіцца ў канкрэтныя дамоўленасці». Як пазней растлумачыў міністр энергетыкі Расіі Аляксандр Новак, гаворка ідзе не аб скарачэнні здабычы, а аб яе замарозцы.

Фактар АПЕК — не адзіны, які ўплывае на кошт нафты. Пяць тыдняў запар зніжаліся запасы нафты ў ЗША (праўда, на мінулым тыдні галіновы American Petroleum Institute агучыў справаздачу аб росце запасаў нафты ў краіне на 2,7 млн бараляў), памяншаюцца аб'ёмы вытворчасці ў ЗША, Кітаі, Індыі, Венесуэле і Габоне. І гэта відавочна сярэднетэрміновы трэнд, выкліканы недаінвеставаннем у галіну апошнія паўтара года. Таксама кароткатэрміновы ўплыў аказваюць ураганы ў Персідскім заліве.

Цэны на нафту працягваюць стрыманае зніжэнне пасля публікацыі АПЕК даных аб аб'ёмах здабычы ў верасні, якія паказалі рост вытворчасці краінамі картэля да рэкорднага за 8 гадоў узроўню, а таксама выхаду галіновай статыстыкі аб запасах паліва ў ЗША. Некалькі стрымліваюць падзенне даныя аб кітайскім імпарце нафты: КНР у верасні павялічыла закупкі за мяжой да рэкордных 8,08 млн бараляў за суткі або 33,06 млн тон за месяц у цэлым.

**Паводле прагнозаў Міжнароднага энергетычнага агенцтва (МЭА), праз 20—30 гадоў свет застанецца ўсё ж такі вуглевадародным, а попыт на нафту і газ працягне расці.**

Даныя па вытворчасці краін АПЕК засведчылі, што нават выяўленне рэальных аб'ёмаў здабычы краінамі картэля з'яўляецца няпростай задачай. Тым складаней будзе членам картэля дамовіцца аб зніжэнні вытворчасці (мяркуецца, што ў рамках пагаднення, якое абмяркоўваецца зараз, дакладная квота павінна быць устаноўлена для кожнай з краін). Пры гэтым з даклада АПЕК вынікае, што ў верасні ўвесь картэль вырабляў штодня 33,39 млн бараляў, што на 220 тыс. вышэй за ўзровень жніўня. «Навіна не стала сюрпрызам, нафтадолары патрэбныя нафтаздабываючым краінам як паветра. Так што чаму б не падняць здабычу, пакуль яшчэ абмежаванні не ўступілі ў сілу», — заўважыў кліенцкі менеджар OM Financial Сцюарт Айв. Такім чынам, прадугледжанае вераснёўскім пагадненнем зніжэнне здабычы на 200—700 тыс. бараляў у выніку, магчыма, будзе азначаць толькі тое, што краіны, якія ўваходзяць у АПЕК, будуць выпрацоўваць прыкладна тыя ж аб'ёмы, што і раней, і прапанова па-ранейшаму будзе перавышаць попыт.



### Стаўка на вецер і сонца

У 2030 годзе ў свеце наступіць пік попыту на нафту, сцвярджаецца ў дакладзе, прэзентацыя якога адбылася на мінулым тыдні ў Стамбуле на Сусветным энергетычным кангрэсе. Пасля на змену неаднаўляльных крыніц энергіі прыйдзе фенаменальны рост спажывання сонечнай і ветравой энергіі, а сыравіна будзе паступова знікаць з энергабалансу сусветных эканомік. Зрэшты, расійскія ўлады і шэраг незалежных экспертаў не вераць у «канец эры вуглевадародаў».

«Цяпер пераважае тэндэнцыя: скачкі цэн на нафту і развіццё альтэрнатыўных крыніц энергіі прыводзяць да таго, што пік новага попыту пастаянна адсоўваецца», — адзначае выканаўчы старшыня Сусветнага энергетычнага савета Гэд Дэвіс. Паводле яго слоў, у 2014 годзе ў агульным аб'ёме сусветнай энергетыкі на ветраную і сонечную прыходзілася ўсяго 4% спажывання, але да 2030 года гэты паказчык дасягне 35%. У Расіі спажыванне аднаўляльных энергакрыніц значна меншае — усяго каля 1,2%. Найбуйнейшая сонечная электрастанцыя запрацавала летась у Белгародскай вобласці, яе магутнасць складае 100 кВт, ветрастанцыя — Данузлаўская ВЭС (сумарная магутнасць 18,7 МВт) — знаходзіцца ў Крыме. Расійскія ўлады неаднаразова заяўлялі пра планы павялічыць магутнасці ветранай і сонечнай энергіі да 2024 года да 4,5% (1600 МВт).

«Тэмпы росту насельніцтва і спажывання энергіі цесна звязаныя паміж сабой, таму чакаць якога-небудзь піка ў 2030 годзе не варта. Трэба арыентавацца на 2050-ты, калі тэмпы росту насельніцтва ў свеце па аб'ектыўных прычынах замарудзяцца», — лічыць дырэктар расійскага Інстытута праблем нафты і газу Анатоль Дзмітрыеўскі. Таксама эксперт заявіў, што да 2025 года магчымы спад спажывання паліва дзякуючы шырокаму ўкараненню электрамабіляў. Зараз бензінам і саляркай запраўляюць свае машыны 92% насельніцтва, адзначаецца ў дакладзе, але чакаецца, што да 2020-га гэты паказчык знізіцца да 78%, праўда, спад будзе часовым.

Расія зараз з'яўляецца сусветным лідарам па здабычы сырой нафты. Летась у РФ было адпампавана 579 млн 692 тыс. тон «чорнага золата». Следам ідзе Саўдаўская Аравія — 501 млн 342 тыс. тон. Замыкае тройку лідараў ЗША — 476 млн 500 тыс. тон. Па ацэнцы ўдзельнікаў рынку, да 2040 года доля нафты ў агульнасусветным спажыванні энергарэсурсаў складзе каля 26%.

«Ва ўмовах падзення цэн на нафту больш чым у два разы шмат хто казаў пра тое, што эра вуглевадародаў ідзе да завяршэння і трэба ўжо цяпер цалкам пераарыентавацца на альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. Праз 20—30 гадоў свет застанецца ўсё ж такі вуглевадародным. А попыт на нафту і далей працягне расці», — заявіў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, выступаючы на Сусветным энергетычным кангрэсе ў Стамбуле.

Паводле прагнозаў Міжнароднага энергетычнага агенцтва (МЭА), праз 20—30 гадоў свет застанецца ўсё ж такі вуглевадародным, а попыт на нафту і газ працягне расці. Да 2040-га доля нафты ў агульнасусветным энергаспажыванні складзе прыкладна 26%, вугалю — 25%, газу — 24%, біямасы і біяпаліва — 10%, атамнай энергіі — 7%, гідраэнергетыкі — 3%, іншых аднаўляльных крыніц — 5%. Уладзімір Пуцін упэўнены, што сённяшні лішак прапаноў вуглевадародаў выкліканы высокімі цэнамі на нафту на працягу апошніх 10 гадоў, якія прывялі да беспрэцэдэнтнага прытоку інвестыцый у энергетычную галіну. Нізкія ж кошты на нафту справакавалі і самы працяглы за 45 гадоў цыкл падзення інвестыцыйнай актыўнасці галіны.

### Інтрыга захоўваецца

Цяпер трэнды не мяняюцца: сусветны попыт на вуглевадароды паступова расце па меры аднаўлення тэмпаў росту глабальнай эканомікі. У сярэдзіне верасня і МЭА, і АПЕК перагледзелі ў бок павышэння прагнозы па попыце. Прагноз перавысіў аналагічны паказчык 2015 года на 1,23 млн бараляў у суткі. А Міжнароднае энергетычнае агенцтва прагназуе рост попыту на нафту ў Расіі на 1,3% у 2017 годзе, да 3,81 млн бараляў у суткі.

Кошт нафты ў 2017 годзе можа знаходзіцца ў дыяпазоне $ 50—60 за бараль. Пра гэта ў кулуарах Сусветнага энергетычнага кангрэса ў Стамбуле заявіў кіраўнік BP Роберт Дадлі. А выканаўчы дырэктар МЭА Фаціх Біроп адзначыў, што рэакцыя прадстаўнікоў амерыканскай сланцавай галіны будзе «вельмі важнай» для далейшых перспектыў рынку нафты. У сувязі з нечаканай падзеяй — здзелкай АПЕК у Алжыры, агенцтва цяпер чакае дасягнення балансу на рынку нафты ў другім паўгоддзі 2017 года. Байрол падкрэсліў, што росту коштаў на нафту да $60 за бараль будзе дастаткова для таго, каб амерыканскія нафтавыя кампаніі сталі нарошчваць здабычу.

Разам з надзеямі на поспех лістападаўскай канферэнцыі, цэны падтрымлівалі звесткі аб тым, што ўзровень запасаў нафты ў ЗША знізіўся за пяць тыдняў на 5%. Аналагічная сітуацыя назіралася на найбуйнейшым нафтавым хабе ў Еўропе, а рэзервы на плывучых сховішчах у Сінгапуры ўпалі ўдвая, паведамляе The Wall Street Journal. Паводле ацэнкі PIRA Energy Group, пастаўкі нафты на рынак былі ніжэйшыя за спажыванне на 500 тыс. бараляў у трэцім квартале, да канца года гэты разрыў падвоіцца. Пагадненне краін АПЕК можа паскорыць зніжэнне запасаў і выклікаць, на думку PIRA, рост цэн да $60—65 да 2017 года.

Заключэнне папярэдняга дагавора аб скарачэнні здабычы ўдзельнікамі АПЕК у Алжыры ў верасні, сустрэча кіраўніцтва картэля з расійскім бокам на мінулым тыдні ў Стамбуле, перспектывы заключэння дагавора экспарцёрамі ў лістападзе — усе гэтыя фактары ўжо пачалі стымуляваць рынак да росту. Толькі з пачатку жніўня бараль падаражэў на 10 доларат і да канца года цалкам можа дадаць яшчэ 10—15 долараў да жнівеньскага лакальнага мінімуму.

**Расія зараз з'яўляецца сусветным лідарам па здабычы сырой нафты. Летась у РФ было адпампавана 579 млн 692 тыс. тон «чорнага золата». Следам ідзе Саўдаўская Аравія — 501 млн 342 тыс. тон. Замыкае тройку лідараў ЗША — 476 млн 500 тыс. тон.**

Кіраўнік французскай Total Патрык Пуяне лічыць, што дэфіцыт прапановы на сусветным нафтавым рынку можа з'явіцца да 2020 года. Скарачэнне будзе выклікана змяншэннем інвестыцый у галіну і тым, што было замарожана шмат праектаў. Пры гэтым кіраўнік Total не бачыць перадумоў для стабілізацыі рынку ў найбліжэйшы час. Паводле яго слоў, для гэтага глабальную здабычу неабходна скараціць на 1—5%.

У сваю чаргу аналітыкі Goldman Sachs папярэджваюць, што цэны на «чорнае золата» могуць падаць да $43 за бараль, калі нафтаздабываючыя краіны не здолеюць дамовіцца аб скарачэнні здабычы, паколькі лішак прапановы на рынку захаваецца на працягу IV квартала. Эксперты амерыканскага інвестбанка лічаць, што, нягледзячы на вялікую імавернасць заключэння запланаванага пагаднення аб абмежаванні здабычы членамі АПЕК і вытворцамі па-за картэлем, уключаючы Расію, любога зніжэння яе аб'ёмаў будзе недастаткова для збалансавання рынку налета, паведамляе Reuters. «Павелічэнне здабычы ў Лівіі, Нігерыі і Іраку скарачае шанцы на тое, што такі дагавор прывядзе да балансіроўкі рынку ў 2017 годзе», — адзначылі аналітыкі Goldman Sachs.

Аднак навіны з Кітая здольныя даць надзею на хуткае балансаванне попыту і прапановы. КНР у мінулым месяцы паспяхова скарысталася нізкімі цэнамі, закупіўшы значныя аб'ём нафты: паводле даных кітайскіх мытных улад, імпарт нафты ў краіне ў сукупнасці склаў 8,04 млн бараляў у суткі. Мала таго, што гэта на 18% больш у параўнанні з вераснем мінулага года, гэта з'яўляецца яшчэ і новым рэкордным узроўнем. У выніку Кітай абагнаў ЗША, стаўшы ў верасні найбуйнейшым імпарцёрам нафты ў свеце. За першыя дзевяць месяцаў гэтага года Паднябесная імпартавала 7,55 млн бараляў у суткі, што на 14% больш, чым у тым жа перыядзе 2015 года. Так што інтрыга на нафтавым рынку захоўваецца.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*



ФРАНСАБАНК FRANSABANK

**«Франсабанк» Открытое акционерное общество**
Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 95А
тел.: (017) 389 36 36, факс: (017) 389 36 37
office@fransabank.by www.fransabank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2016 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2016 | 01.10.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 8 963 | 11 535 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 9 | 1 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 913 | 3 885 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 4 626 | 13 825 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 45 782 | 24 855 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 46 039 | 50 453 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 18 869 | 17 911 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | - | 117 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 770 | 402 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 125 971 | 122 984 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | 2 011 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 41 624 | 46 822 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 41 964 | 38 753 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 369 | 728 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 83 957 | 88 314 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 16 042 | 11 370 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 1 110 | 790 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 13 375 | 12 863 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 11 487 | 9 647 |
| 30 | ВСЕГО капитал | 121 | 42 014 | 34 670 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 125 971 | 122 984 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 октября 2016 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2016 | 01.10.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 10 444 | 8 548 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 3 336 | 4 353 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 7 108 | 4 195 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 1 556 | 1 999 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 248 | 183 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 1 308 | 1 816 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | 5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (2) | 3 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 2 733 | 4 518 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 994 | 1 658 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 217 | 216 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 6 436 | 5 559 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 246 | 275 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 3 688 | 3 261 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 368 | 792 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 320 | 2 469 |

И.о. Председателя Правления — Д.И. Омельянчик

Главный бухгалтер — Л.Б. Паденова

Дата подписания — «12» октября 2016 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 15 от 26.04.2013 г.
УНП 100755021.

Минский городской центр недвижимости

### Извещение о проведении 03 ноября 2016 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | – «лит. А1-2/к-кп, здание прачечной» общей площадью 1012 кв. м (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/С-34660; назначение: здание неустановленного назначения) с элементами благоустройства: автодорога (540 кв. м), площадка под автостоянки (240 кв. м), пешеходная дорожка (206 кв. м), площадка под мусоросборник (4 кв. м), площадка (3 кв. м), бордюр 0,16 (40 кв. м, 251,22 м.п.), ограждение территории (16,40 м.п.), ограждение площадки под мусоросборник (5,50 м.п.), ворота (4,40 м.п.), ворота (7,60 м.п.); – электросети КЛ-0,4КВ (инвентарный номер по бухгалтерскому учету 3000842) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Кабушкина, д. 64 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 0,3900 га, кадастровый номер 500000000002001769, назначение – эксплуатация и обслуживание здания прачечной |
| **Продавец имущества** | ОАО «МАЗ» - управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к.10 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 715 611,35 бел. руб. (7 156 113 500 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Сумма задатка** | 71 000 бел. руб. (710 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| **Условия торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Дальнейшее использование приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в соответствии с требованиями регламентов генерального плана города Минска и градостроительного проекта детального проектирования соответствующей территории |
| **Наличие обременений** | аренда |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) по согласованию с продавцом в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 03 ноября 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 20.10.2016 по 01.11.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 217-21-03 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | 1 |
|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристика объекта | Право заключения договора аренды капитального строения с инвентарным № 100/С-46612 (пакгауз) площадью 267,2 кв.м, с объектом принадлежности (рампа 386 кв.м), по адресу: *г. Брест, ст. Брест-Полесский*, *для хранения, погрузки и выгрузки грузов* |
| Балансодержатель | «Брестская дистанция гражданских сооружений» |
| Начальная цена продажи (BYN) | 908 рублей 48 копеек |
| Сумма задатка (руб.) | 90 рублей |
| Срок аренды | 5 лет |
| Сумма арендной платы в месяц | 160,32 б.а.в. (здание склада); 19,3 б.а.в. (рампа) |
| Условия оплаты | Разовый платеж |
| Размер штрафа, руб. | 2100 |
| Условия продажи | Без условий |
| Организатор аукционных торгов | КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. www.bgcn.by |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
3. индивидуальным предпринимателем: копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

***Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в ф-ле № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.***

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится 17 ноября 2016 г. в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 18.10.2016 г. до 17.30 11.11.2016 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; выходной день: сб., вс.)**
**по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**www.bgcn.by; www.brest-region.gov.by; www.gki.gov.by**

**Уважаемые акционеры!**
**Уведомляем вас о том, что Открытым акционерным обществом «Торгразвитие» (УНП 100041437) принято решение о проведении Внеочередного Общего собрания акционеров**

## ОАО «Торгразвитие»

**18 ноября 2016 г.**

Место нахождения Общества: г. Минск, ул. Кнорина, д. 10.
Время проведения собрания: 09.30.
Место проведения собрания: г. Минск, ул. Матусевича, д. 20.

Орган, созывающий общее собрание акционеров: Акционеры ОАО «Торгразвитие», обладающие в совокупности не менее чем 10% голосов от общего количества голосов акционеров ОАО «Торгразвитие».

Основание созыва: требование акционеров ОАО «Торгразвитие», обладающих в совокупности не менее чем 10% голосов от общего количества голосов акционеров ОАО «Торгразвитие». Решение акционерами ОАО «Торгразвитие» о созыве и проведении общего собрания акционеров и о формировании реестра владельцев акций принято 17.10.2016 года.

Акционерами ОАО «Торгразвитие» утверждена следующая повестка дня внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Торгразвитие»:

1. Об избрании членов Наблюдательного совета ОАО «Торгразвитие».
2. Об избрании Ревизора ОАО «Торгразвитие».
3. Об утверждении новой редакции Устава ОАО «Торгразвитие».
4. Об утверждении Регламента работы открытого акционерного общества «Торгразвитие» с реестром владельцев ценных бумаг.
5. О пересмотре Решения общего собрания акционеров ОАО «Торгразвитие» от 29.03.2016 года об утверждении направлений использования чистой прибыли Общества в 2016 году и в 1 квартале 2017 года и о выплате дивидендов за 2016 год, при их наличии.
6. О выплате вознаграждений членам Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Собрание проводится в очной форме.

Регистрация участников внеочередного общего собрания производится по вышеуказанному адресу 18 ноября 2016 года с 9.00 до 9.25. При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность, и доверенность (в случае представления интересов акционера другим лицом).

Список акционеров, имеющих право участвовать в работе и голосовании на общем собрании акционеров, определяется по данным реестра владельцев акций по состоянию на 01 ноября 2016 г.

С информацией по повестке дня можно ознакомиться по адресу г. Минск, ул. Матусевича, д. 20 в течение семи дней до проведения собрания с 10.00 до 16.00, а также во время проведения собрания.

### Извещение о реализации имущества ОАО «Барановичидрев» на первых повторных торгах 31.10.2016 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит первые повторные торги в форме аукциона по реализации объекта недвижимости:

Конт. тел. 8-029-3997931 vel.; факс/тел. 8-(0163) 455124; Email:mischuk_am@mail.

Торги состоятся 31 октября 2016 года, в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.

**ПРЕДМЕТ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ:**

**ЛОТ № 1**

**1)** Изолированное помещение с инвентарным номером 110/D-2773434 общей площадью 49,5 кв.м (наименование — квартира № 67, назначение — квартира), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, д. 100-67.

**2)** Местонахождение объекта торгов: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Советская, д. 100-67.

**3) ЦЕНА ЛОТА №1: 27 000 долларов США, без НДС. Снижена на 10% от первой цены установленной независимым оценщиком.**

**Оплата производится в белорусских рублях в соответствии с курсом НБ РБ на день проведения расчетов.**

Сумма задатка: 10% от начальной цены лота в рублях РБ.

Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Барановичи.

Назначение платежа — задаток за участие в аукционе.

Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе.

Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.

Заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, в срок до 14 часов 00 минут 26.10.2016 г. организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. ВОСТОЧНЫЙ ПОСЕЛОК, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомиться на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 18.10.2016 года.

# НЕБА. ПАРАШУТ. ЖАНЧЫНА

## Як спартсменка з Брэста скарыла нябёсы над Амерыкай

**Нядаўна наша зборная вярнулася з чэмпіянату свету па парашутным спорце Mondial 2016, гэты старт, як алімпійскія гульні, праходзіць толькі адзін раз у 4 гады і з'яўляецца самым прэстыжным у гэтым відзе спорту. На рахунку жаночай каманды дзевяць узнагарод, медаль вышэйшай пробы ў нябёсах над ЗША выйграла капітан нашай дружыны Наталля НІКІЦЮК.**



Усмешлівая, мініяцюрная і неверагодна ветлівая Наталля ў спорце ўжо 32 гады, свой першы скачок з парашутам здзейсніла ў 14 гадоў і пасля гэтага ўжо не ўяўляла, што можа займацца чымсьці іншым. Сёння на яе рахунку больш за 10 тысяч скачкоў і медалі розных вартасцяў самых прэстыжных сусветных турніраў. Акрамя гэтага, Наталля добрая жонка і маці.

### Магло быць лепш

Сёлетні чэмпіянат свету праходзіў у ЗША, там нашы спартсмены яшчэ не выступалі, гэты факт дадаваў камандзе хвалявання. Спаборніцтвы доўжыліся два тыдні, а вось на акліматызацыю ў спартсменаў было толькі пару дзён.

*— Пасля прыезду агледзелі пляцоўку, умовы, даведаліся пра надвор'е і настроіліся на працу. Галоўнай перашкодай для нас на гэтым чэмпіянаце была розніца ў часавых паясах. Калі людзі там хочуць працаваць, то мы хочам спаць,* — расказвае Наталля.

Капітан жаночай зборнай адзначае, што кожны год перад камандай стаяць сур'ёзныя задачы, таму што беларусы ўжо звыклыя лідары найбуйнейшых турніраў. Выступленне каманды ў ЗША магло быць і лепшым, бо да гэтага на чэмпіянаце Еўропы і на чэмпіянаце свету сярод ваенных наша жаночая зборная была першай. Што тычыцца асабіста Наталлі Нікіцюк, то ў дысцыпліне «дакладнасць прызямлення», у якой яна стала найлепшай у ЗША, раней у яе не было залатых узнагарод.

*— Гэта мая любімая катэгорыя ў класічным парашутызме. Мы скачам з вышыні тысяча метраў і прызямляемся на мат дыяметрам 5 метраў, унутры яго знаходзіцца датчык (16 см), а пасярод намаляваны кружочак (2 см) — вось у яго і неабходна патрапіць. Для гэтага ў нас ёсць спецыяльны абутак з завостранай пяткай.*

На найбуйнейшых спаборніцтвах звычайна прадстаўлена яшчэ купальная і групавая акрабатыка. Разам са спартсменамі скача відэааператар, які таксама член каманды. На зямлі зняты матэрыял перадаецца суддзям, і яны вызначаюць пераможцу.

Сярод лідараў у жаночым парашутным спорце сёння Расія, Кітай і наша краіна. У мужчын — Расія, Беларусь, Кітай, Чэхія, Германія і Францыя.

### Паспрабаваць неба на смак

Звычайна ў гэты спорт прыходзяць у 15—18 гадоў, але Наталля вырашыла звязаць сваё жыццё з палётам яшчэ раней — у 14.

*— Мой бацька лётаў на самалётах, і ў яго была мара, каб хтосьці з дзяцей працягнуў гэтую справу, а потым у наш час усе ж марылі быць лётчыкамі або касманаўтамі, гэта таксама адыграла ролю. Хацелася паспрабаваць неба на смак. Чатыры месяцы мы рыхтаваліся ў аэраклубе: тэарэтычныя, практычныя, наземныя заняткі. Вучылі там нас добра і вельмі строга. У мяне атрымлівацца стала адразу, і я не думала, што магу займацца чымсьці іншым, здавалася, што гэта на ўсё жыццё. У прынцыпе так яно і выйшла.*

Першы скачок памятаюць абсалютна ўсе парашутысты, Наталля ў гэтым сэнсе не выключэнне.

*— Страх быў, як і ва ўсіх перад чымсьці нязведаным. Калі прыйшоў момант, каб зрабіць адзіны крок за борт, ногі падкасіліся і аказалася, што да дзвярэй падысці цяжка. Інструктар гэта бачыў, таму проста ўзяў і дапамог мне пакінуць лятальны апарат. Ніякіх думак праляцець за гэты час не паспела, я заплюшчыла вочы і адкрыла іх, калі была ўжо пад парашутам. Ляцела, глядзела па баках, усё было вельмі цікава. Першае адчуванне было такое: аааа, я птушка, я лячу, праўда, не ўверх, а ўніз. Гэта адчуванне немагчыма перадаць. А потым я проста бухнулася аб зямлю. Да прызямлення таксама трэба рыхтавацца. Мы вучыліся сустракаць зямлю, але калі ты ляціш першы раз, то не можаш ацаніць адлегласць. Я не магла зразумець, калі гэтая зямля ўжо наблізіцца да мяне, і ўсё чакала, чакала. Калі апынулася на зямлі, зразумела — ну вось, усё скончылася. Было такое расчараванне, што ўсё так хутка адбылося.*

### У аблоках ад світанку да заходу

Парашутысты скачуць у любы час года, нават узімку. Іх працы можа перашкодзіць толькі нізкая воблачнасць, моцны вецер, снег, дождж, град і навальніца.

*— Бывае, што падчас палёту рэзка змяняецца надвор'е і трапляеш у моцны парыў ветру, тады прызямляешся недзе ў палях. Але гэта здараецца рэдка, за надвор'ем мы сочым пільна, таму што ад яго залежыць наша бяспека.*

На зборах перад адказнымі стартамі за дзень спартсмен робіць да 12 скачкоў. Спаборніцтвы праходзяць ад усходу да світанку, таму парашутыстам важна скакаць як мага больш, каб быць гатовымі да любых умоў.

*— Вядома, сёння ў нас ёсць праблемы з арганізацыяй скачкоў, таму вельмі складана ўтрымацца ў лідарах парашутнага спорту. Робім гэта толькі за кошт асабістых якасцяў кожнага асобнага спартсмена. Нашы паршутысты, можна сказаць, проста героі, яны маюць значна менш магчымасцяў у трэніровачным працэсе, чым спартсмены з іншых краін, а змагаюцца на роўных.*

Прагрэс не стаіць на месцы, парашуты пастаянна ўдасканальваюцца, але, як і ва ўсякім відзе спорту, ніхто тут не застрахаваны ад траўмаў.

*— Самае небяспечнае — прызямленне на хуткасных парашутах. Трэба быць заўсёды вельмі сканцэнтраваным, таму што любое адцягненне можа скончыцца траўмай, пачынаючы ад вывіху, заканчваючы самымі сумнымі наступствамі.*

Палёт парашутыста доўжыцца прыкладна 20—30 секунд, хуткасць складае 210—230 метраў у секунду. Нягледзячы на тое, што з вышынёй звязана ўсё яе жыццё, Наталля прызнаецца, што, як і ўсім людзям, ёй уласцівы страх, напрыклад, перад палётам на звычайным пасажырскім самалёце.



### «Дзяцей я выгадавала на аэрадроме»

Як правіла, прафесійныя парашутысты служаць у арміі ці займаюцца аматарскім спортам. Наталля служыць, а дакладней працуе ў Спартыўным камітэце Узброеных Сіл.

*— Мая праца — гэта трэніравацца і прывозіць медалі са спаборніцтваў. А што тычыцца сумяшчэння спорту з сям'ёй, то, вядома, ёсць некаторыя складанасці, у асноўным звязаныя з маленькімі дзецьмі. Але я сваіх, напрыклад, выгадавала на аэрадроме, і многія так робяць. Дзіцяці свежае паветра карысна, да таго ж яно заўсёды побач з мамай. Я лічу, што і аднаўленне пасля родаў у нас праходзіць значна лягчэй і хутчэй. Ёсць пастаянны стымул, фізічная нагрузка, свежае паветра ізноў жа.*

Муж Наталлі з парашутам ніколі не скакаў, а вось сын вырашыў працягнуць справу, пачатаую яшчэ дзедам.

*— Антон таксама быў у ЗША, выступаў сярод юніёраў і зрабіў гэта даволі паспяхова — тры медалі. Маленькім ён заўсёды ездзіў са мной на зборы, а потым, калі падрос, сам пачаў скакаць. Дачка пайшла па іншай сцежцы. Калі з'явілася сям'я, муж намякаў, каб я завязала са спортам, але ж гэта справа ўсяго майго жыцця, маё задавальненне. Калі я пачала прывозіць медалі, размовы на гэтую тэму скончыліся.*

Наталля адзначае, што каб пачаць займацца парашутным спортам, неабавязкова валодаць звышздольнасцямі. Патрэбна добрая каардынацыя і развіты вестыбюлярны апарат.

*— Калі хтосьці сумняваецца, але вельмі хоча скокнуць з парашутам, то я адназначна раю паспрабаваць. Набрацца мужнасці, пераадолець сябе і думаць толькі пра добрае. Пачуццё палёту не параўнаць ні з чым. Ёсць людзі, якія страшна баяцца, я бачыла такіх. Прызямліўся, усё кінуў і проста моўчкі пайшоў. Гэта стрэс, ніводнай станоўчай эмоцыі, з такім настроем лепш не скакаць. Але пазітыўных, вядома, больш, людзі прызямляюцца, пачынаюць вішчаць, крычаць, скакаць, танцаваць, насіць на руках адзін аднаго.*


HOME CREDIT

Республика Беларусь,
220018, г. Минск,
ул. Одоевского, 129.
Тел. (8017) 229 89 91,
www.homecredit.by

**ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ХоумКредит»**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 октября 2016 г.**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2016 | 01.10.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | - | 12 419 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 617 | 74 526 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 622 | 13 436 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 39 126 | 16 336 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 40 458 | 149 144 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 33 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 15 625 | 21 486 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 474 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 19 798 | 18 131 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 116 720 | 305 511 |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 34 500 | 10 058 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 12 966 | 74 132 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 27 140 | 168 927 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | 12 | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 8 491 | 3 258 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 83 109 | 256 375 |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 14 479 | 14 479 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 1 969 | 1 849 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 368 | 661 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 16 795 | 32 147 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 33 611 | 49 136 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 116 720 | 305 511 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
на 1 октября 2016 г.**

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.10.2016 | 01.10.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 21 502 | 44 620 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 19 801 | 36 844 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 701 | 7 776 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 6 424 | 20 563 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 1 462 | 1 683 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4 962 | 18 880 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 159 | 2 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (3 096) | 749 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 242 | (2 916) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 3 261 | 5 479 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 28 716 | 17 494 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 39 854 | 25 325 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 416 | 1 804 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | (10 847) | 9 377 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | - | 2 295 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | (10 847) | 7 082 |

Председатель Правления Щербаков С.Б.

Главный бухгалтер Лаптенок Г.П.

Дата подписания «07» октября 2016 г.

Лицензия №18, выданная НБ РБ 15 июля 2016 года. УНП 807000056.


## Экспрэс-навіны

# БАТЭ: ТРЫНАЦЦАЦІРАЗОВЫЯ!

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра датэрміновую перамогу футбалістаў з Барысава ў чэмпіянаце краіны і поспех гандбольнага СКА ў Кубку ЕГФ.**

***1. Футбалісты барысаўскага БАТЭ за пяць тураў да фінішу чэмпіянату Беларусі забяспечылі сабе званне чэмпіёна краіны.*** У Лунінцы ў матчы 25-га тура барысаўчане абыгралі мікашэвіцкі «Граніт» 1:0 і ў 13-ы раз (11-ы запар) заваявалі «золата» чэмпіянату краіны.

— Матч трымаў усіх у напружанні да фінальнага свістка. Рады, што ў такой гульні аказаліся пераможцамі. Як бы там ні было, усё роўна лічу, што перамогу мы заслужылі. Да апошніх секунд спрабавалі ісці наперад — і былі ўзнагароджаны за гэта забітым мячом. Удвая прыемна, што гэта здарылася ў мяне на радзіме. Хачу таксама павіншаваць усіх, хто перажываў за нашу каманду, маіх бацькоў, сяброў. Вялікі ім дзякуй, што падтрымлівалі нас, — адзначыў пасля матчу **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр ЕРМАКОВІЧ**.

У іншых паядынках навапалацкі «Нафтан» на сваім полі адолеў «Крумкачоў» — 1:0, мінскае «Дынама» перайграла аднаклубнікаў з Брэста — 2:1, «Славія» на сваім полі была мацнейшая за «Іслач» — 2:1. Матч без забітых галоў прайшоў у Салігорску, дзе мясцовы «Шахцёр» сустракаўся з «Мінскам» — 0:0. «Тарпеда»-БелАЗ перайграў гасцей з гродзенскага «Нёмана» — 1:0. «Слуцк» дома адолеў «Віцебск» — 2:1, а «Гарадзея» і «Белшына» разышліся мірам — 1:1.

***2. Гандбалісты мінскага СКА прабіліся ў трэці кваліфікацыйны раўнд Кубка ЕГФ.*** Пасля гасцявога паражэння ад аўстрыйскага «Харда» (25:28) на пляцоўцы Палаца спорту «Уручча» армейцы ўзялі пераканаўчы рэванш — 31:25. Самым выніковым у складзе пераможцаў стаў Мікіта Вайлупаў, які закінуў 10 мячоў.

— У Мінску гулялі больш мабільна, зладжана. Упор рабілі на абарону: эфектыўнасць контратак сведчыць, што нездарма, — пракаментаваў перамогу сваіх падапечных **рулявы СКА Ігар Папруга**.

**Матэрыялы падрыхтавала
Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*




Склаў Юрый ФАЛІНСКІ, г. Мінск.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Таўтаграма. Руіна. Аэрадром. Рэактыў. Кіса. Сняданак. Біта. Рамонак. Староста.

**Па вертыкалі:** Барбарыс. Турыстка. Анагр. Ікаўка. Аса. Рабіна. Амфла. Ікра. Рака. Нос. Бок. Таз. Каза.

## ■ Ну і ну!

### Характэрны прыкус злачынцы

**Злодзея знайшлі па сківіцы**

**Трагікамічная гісторыя адбылася ў Старадарожскім раёне. Тут серыйнага злодзея злавілі дзякуючы пакінутай ім на месцы злачынства... устаўной сківіцы.**

У міліцыю паступіла некалькі паведамленняў пра крадзяжы ў вёсцы Старыя Дарогі. Выйсці на след злачынцы атрымалася дзякуючы пакінутым ім на месцы злачынства рэчах. Сярод улік была і частка штучнай сківіцы. Зламыснік вырашыў перакусіць, скарыстаўшы знойдзеныя на кухні прадукты. Пасля ежы, відаць, і забыўся забраць гэты неабходны яму прадмет. А іншы раз каля дома злачынец кінуў куртку, якая перашкаджала яму пранікнуць у аконны праём. Затрымалі фігуранта па месцы жыхарства — у вёсцы Фядоры Столінскага раёна. Пры вобыску яго жыллі ў 39-гадовага раней судзімага беспрацоўнага грамадзяніна часткова знайшлі скрадзеную маёмасць, паведамілі ва УУС Мінаблвыканкама. Сёе-тое мужчына паспеў прадаць на тэрыторыі Старадарожскага раёна. Заведзена крымінальная справа. Грамадзяніна падазраюць у серыі крадзяжоў: ён зараз правяраецца на дачыненне да іншых злачынстваў на тэрыторыі раёна.

### Вальшчыкі захапіліся...

**І «пакпалі» сотні дрэў без дазволу**

**На тэрыторыі Целяханскага лясгаса работнікі Бярозаўскай міжрайінспекцыі і лясной аховы знайшлі незаконную высечку. Некалькі сотняў дрэў былі спілаваны па абодва бакі ад ЛЭП.**

— На правядзенне такой «зачысткі» супрацоўнікі лясгаса дазволу не давалі, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржінспекцыі **Вольга ГРАМОВІЧ**. — У час разбору высветлілася, што дрэвы спілавалі работнікі прыватнага прадпрыемства з Брэста, якія атрымалі права нарыхтоўваць драўніну на землях энергетыкаў у суседнім Ганцавіцкім раёне. Аднак вальшчыкі так захапіліся, што на 200 метраў зайшлі на тэрыторыю суседняй гаспадаркі. Халатнасць работнікаў абыдзецца прадпрыемству ў буйную суму: за 373 спілаваныя дрэвы агульным аб'ёмам 128 кубаметраў ПУП заплаціць 5,7 тысячы рублёў і яшчэ тысячу рублёў у якасці штрафу.

### Расплаціўся чужой карткай

**У сталіцы затрымалі 50-гадовага мінчаніна, які расплаціўся за тавары пры дапамозе банкаўскай карткі сваёй знаёмай без яе ведама.**

— Пацярпелая, будучы ў гасцях у мужчыны, распівала з ім спіртныя напіткі. Калі апошнія скончыліся, было вырашана банкет не спыняць: 47-гадовая жанчына папрасіла прыяцеля схадзіць у краму, даўшы яму сваю банкаўскую картку, — паведамілі ў **прэс-афіцэр Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля ГАНУСЕВІЧ**. — Паколькі пін-код пры разліку ўводзіць было не трэба, мужчына набыў дзве бутэлькі гарэлкі, пасля чаго пара прадоўжыла застолле. Праз нейкі час жанчына пайшла дадому, забыўшыся забраць банкаўскую картку. Скарыстаўшыся гэтым, мужчына зноў пайшоў у краму, дзе правёў больш за дваццаць трансакцый, набыўшы прадукты харчавання і спіртное на суму каля 180 рублёў. Заведзена крымінальная справа за крадзеж шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі. Грамадзяніну пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

Даты | Падзеі | Людзі

## 18 КАСТРЫЧНІКА

**1867** год — Аляска, адкрытая ў 1732 годзе рускай экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. Гвоздзева і І. Фёдарава, была перададзена Злучаным Штатам. Дагавор аб продажы ЗША Расіяй Аляскі і Алеуцкіх астравоў быў падпісаны 30 сакавіка 1867 года, а 18 кастрычніка таго ж года прайшла цырымонія афіцыйнай перадачы Рускай Амерыкі Злучаным Штатам у абмен на чэк на суму 7,2 млн долараў. У сталіцы рускай калоніі Новаархангельску рускі гарнізон саступіў месца амерыканскаму.



**1906** год — нарадзіўся (в. Зарудзічы, цяпер у Смаргонскім раёне Гродзенскай вобл.) Алесь Салагуб, беларускі паэт, літаратуразнаўца, публіцыст. У 1931 годзе скончыў БДУ. Аўтар зборніка вершаў «Лукішкі», драмы «Вяселле». Збіраў фальклор, народную лексіку, выкарыстаў іх у сваіх творах. У 1933 годзе рэпрэсаваны, у 1934-м прысуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956-м.

**1934** год — нарадзіўся Кір Булычоў (Ігар Усеваладавіч Мажэйка), савецкі пісьменнік-фантаст, сцэнарыст. У 1980-х гадах па яго аповесці «Сто гадоў таму наперад» здымаюць пяцісерыйны фільм «Госця з будучыні», які стаў самым папулярным дзіцячым фільмам таго часу. У 1982-м Булычоў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР за лепшы сцэнарый (за фільмы «Праз церні да зорак» і «Таямніца трэцяй планеты»).

**1946** год — 70 гадоў з дня нараджэння Ганада Бадрыевіча Чарказяна, беларускага пісьменніка. У 1984 годзе скончыў БПІ. Аўтар зборнікаў «Абпаленыя жаўрукі», «Колер дабрыні» і іншых.

**1947** год — нарадзіўся (г. Кобрын) Алег Анатольевіч Стральчонак, беларускі вучоны, акадэмік НАН Беларусі (1994). Аўтар больш за 180 навуковых прац, 35 вынаходніцтваў. Даследаванні ў галіне хіміі гармонаў і гарманальнай рэцэпцыі. За стварэнне і ўкараненне ў практыку аховы здароўя радыеідыягнастычных набораў удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1988).

**Было сказана**

**Пятрусь МАКАЛЬ, паэт, драматург, перакладчык:**
*«Не памагайце, калі не просяць,*
*І не прыходзьце, калі не клічуць».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.44 | 18.05 | 10.21 |
| Віцебск — | 7.36 | 17.52 | 10.16 |
| Магілёў — | 7.34 | 17.55 | 10.21 |
| Гомель — | 7.28 | 17.55 | 10.27 |
| Гродна — | 7.58 | 18.20 | 10.22 |
| Брэст — | 7.56 | 18.24 | 10.28 |

## Месяц

*Поўня 16.10—21.10.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

**Пр.** *Аляксея, Дзям'яна, Мацвея, Піліпа, Пятра, Рыгора.*
**К.** *Ганны, Лукі, Пятра, Юльяна.*



Фота Марыны ГАРЭЛАВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Пасля 30 гадоў жанчына сама мае права вырашаць, колькі ёй гадоў і дзе ў яе талія.**

— У мяне жонка ўся ў сіняках, таму што заўсёды на ноч мажацца крэмам ад маршчын, начным крэмам, крэмам для рук, крэмам для шыі і ласьёнамі для цела.
— А сінякі адкуль?
— Дык яна ўвесь час з ложка саслізгвае!

**На мінулым тыдні малады пілот грамадзянскай авіяцыі Пётр Смірноў упершыню пераадолеў гукавы бар'ер. Яму ўдалося ўставіць дзве свае фразы ў размову цешчы з трыма суседкамі па загараднай дачы.**

— Ты не памятаеш, у колькі я ўчора з'ехаў?
— Ну, дзесьці ў без 200 грамаў 2 літры.




Малюнак Алега ПАПОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4103.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 кастрычніка 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12